Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 КРАСАВІКА 2015 г. ПЯТНІЦА № 77 (27935) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**20 КАНАЛАЎ**



**Прагpама тэлебачання на наступны тыдзень**



**У медсёстры – па конкурсе**

СТАР. 6



**Праўда дакументальнага кіно**

СТАР. 20

*ЛІЧБА ДНЯ*

**39**

**ветэранаў**

*Вялікай Айчыннай вайны, якія жывуць у Беларусі, пераступілі 100-гадовую ўзроставую мяжу. На 1 красавіка ў краіне пражывае амаль 16,8 тысячы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, з іх 11,3 тысячы чалавек — удзельнікі, сярод якіх 3 тысячы з'яўляюцца інвалідамі вайны. Таксама на гэтую дату налічвалася 4,5 тысячы чалавек, узнагароджаных ордэнамі або медалямі СССР за самаадданую працу і бездакорную вайсковую службу ў тыле ў гады вайны. Членамі сем'яў загінулых воінаў і партызан з'яўляюцца 1,8 тысячы чалавек, былымі вязнямі фашысцкіх канцлагераў, турмаў, гета і іншых месцаў прымусовага ўтрымання — 24,9 тысячы.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.04.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14360,00 | ▼ |
| Еўра | 15330,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 279,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 635,40 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# НАДЗЕЙНЫ ПАДМУРАК СУПРАЦОЎНІЦТВА

## Развіццё беларуска-грузінскіх палітычных і эканамічных адносін адпавядае інтарэсам абедзвюх краін

**Беларусь і Грузія могуць стварыць трывалы фундамент для будучых адносін, заснаваны на моцных гандлёва-эканамічных сувязях. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы ў Тбілісі са сваім грузінскім калегам Георгіем Маргвелашвілі, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што ў палітыцы нашых краін няма супярэчнасцей. Таксама ён сказаў, што ні разу не быў у Тбілісі, і дадаў: «Напэўна, даўно трэба было пабываць тут, тым больш што з даўніх часоў наш народ заўсёды меў глыбокую павагу да грузінскага народа».

Візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Грузію пачаўся з ускладання вянка да магілы Невядомага салдата. «Гэта таму, што нашу Беларусь вызвалялі тысячы грузін. У нас таксама загінулі сотні, а можа і тысячы вашых салдат, таму я аддаў даніну павагі напярэдадні важнай даты ўсім грузінам, усім савецкім воінам, якія загінулі ў гады вайны», — сказаў беларускі лідар.

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

# На доўгую памяць



Фота БЕЛТА.

**Брэст стаў першым з беларускіх гарадоў, які далучыўся да міжнароднай акцыі «Бэз Перамогі». Учора ля сцен Брэсцкай крэпасці гараджане ўсіх пакаленняў садзілі бэзавую алею. Сярод іх быў і ветэран Вялікай Айчыннай вайны Мікалай Мельнік, з якім з задавальненнем фатаграфаваліся яго землякі.**

■ Прыемная навіна

# Павялічваецца бюджэт пражытачнага мінімуму

**На перыяд з 1 мая па 31 ліпеня будзе ўстаноўлена новая велічыня бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва.**

Як паведаміла ўчора **міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА**, зыходзячы з гэтай велічыні з 1 мая будуць пераразлічаны памеры павышэнняў, надбавак і даплат, што выплачваюцца да пенсій. Адначасова з гэтай даты будуць пераразлічаны сацыяльныя і мінімальныя працоўныя пенсіі, памеры якіх таксама вылічаюцца ў залежнасці ад велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму.

**Святлана БУСЬКО.**

■ Абітурыенцкі графік

# ТРЫ ДАДАТКОВЫЯ ДНІ НА РОЗДУМ

**Зацверджаны тэрміны правядзення ў 2015 годзе ўступнай кампаніі ў вышэйшых навучальных установах.**

Прыём дакументаў на бюджэтныя месцы на ўсе формы навучання будзе весціся ў дзяржаўных ВНУ з 8 па 15 ліпеня, гэта значыць, што ў параўнанні з мінулым годам у абітурыентаў будуць тры дадатковыя дні, каб вызначацца з выбарам навучальнай установы і спецыяльнасці.

Уступныя іспыты ў ВНУ сілавых ведамстваў пройдуць з 16 па 19 ліпеня, у творчых ВНУ — з 16 па 25 ліпеня, а ва ўсіх астатніх — з 16 па 21 ліпеня. Залічэнне абітурыентаў на бюджэтныя месцы ў вышэйшыя навучальныя ўстановы МУС і МНС, а таксама ў Інстытут пагранслужбы і Ваенную акадэмію пройдзе па 23 ліпеня, у Акадэмію мастацтваў, Акадэмію музыкі і Універсітэт культуры — па 29 ліпеня. У іншыя ВНУ — па 25 ліпеня.

Дакументы на платную форму навучання ў ВНУ сілавых ведамстваў будуць прымацца па 29 ліпеня, у творчых ВНУ — па 31 ліпеня, ва ўсіх іншых — па 2 жніўня.

Тэрміны прыёму на завочную форму навучання ў ВНУ сельскагаспадарчага профілю традыцыйныя — з 1 па 30 лістапада.

У тым выпадку, калі ў якой-небудзь ВНУ застануцца незапоўненыя бюджэтныя месцы, будзе аб'яўлены дадатковы набор. Дакументы ад абітурыентаў, што паступаюць у рамках дадатковага набору, у ВНУ сілавых ведамстваў будуць прымацца з 24 па 26 ліпеня. У творчых ВНУ — з 30 па 31 ліпеня, а ва ўсіх астатніх — з 26 па 28 ліпеня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



# НАДЗЕЙНЫ ПАДМУРАК СУПРАЦОЎНІЦТВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт Грузіі Георгій Маргвелашвілі назваў візіт Аляксандра Лукашэнкі вельмі значным для абедзвюх краін і двухбаковых адносін. «Ваша асабістае стаўленне і да Грузіі, і да грузін — гэта цудоўны фундамент для таго, каб развіваць адносіны», — лічыць Прэзідэнт Грузіі. — Такім чынам, мы пачынаем вельмі добры і цікавы шлях у будучыню, да будучага супрацоўніцтва».

Кіраўнікі дзяржаў абмяняліся думкамі па актуальных міжнародных і рэгіянальных праблемах, усебакова абмеркавалі шырокі спектр пытанняў і перспектыў беларуска-грузінскіх адносін.

У прыватнасці Беларусь і Грузія дамовіліся аб перспектывах узаемнага тавараабароту ў памеры $200 млн. Кіраўнік беларускай дзяржавы звярнуў увагу, што аб'ём узаемнага гандлю хоць і склаў па выніках мінулага года $64 млн, але захаваўся на ўзроўні 2013 года. «Зразумела, гэта не тыя лічбы, якія могуць нас задаволіць. Таму падчас перагавораў мы надалі значную ўвагу развіццю гандлёва-эканамічных адносін паміж нашымі краінамі», — адзначыў беларускі лідар. Ён нагадаў, што, нягледзячы на выхад Грузіі са складу СНД, у беларуска-грузінскіх адносінах захаваны рэжым свабоднага гандлю.

Прэзідэнты Беларусі і Грузіі дамовіліся, што вытворчая кааперацыя будзе асноўнай у двухбаковых адносінах. «Проста гандляваць — гэта проста, а вось стварыць сумеснае прадпрыемства, якое будзе выпускаць патрэбную прадукцыю і гандляваць па ўсім свеце, — гэта больш складана, але рэальна», — лічыць Аляксандр Лукашэнка. Бакі дасягнулі дамоўленасці аб рэалізацыі пілотных праектаў па стварэнні ў Грузіі зборачнай вытворчасці беларускіх ліфтаў, трактароў розных мадыфікацый. Беларускі лідар выказаў упэўненасць, што ўрады дзвюх краін «будуць працаваць эфектыўна і рэалізоўваць нашы дамоўленасці, уклад Беларусі ў развіццё Грузіі будзе відавочны і неаспрэчны».

Беларусь гатова таксама забяспечыць грузінскіх партнёраў неабходнымі сельскагаспадарчай, камунальнай тэхнікай, гарадскім пасажырскім транспартам, лекавымі сродкамі, а таксама прадуктамі харчавання. Пра гэта ўжо ёсць канкрэтныя дагаворанасці. Прэзідэнты Беларусі і Грузіі дамовіліся, што на ўзроўні ўрадаў будуць прапрацаваны канкрэтныя праекты, якія істотна павысяць двухбаковы гандлёва-эканамічны патэнцыял. Наша краіна гатова падзяліцца з Грузіяй і вопытам вядзення сельскай гаспадаркі, «пачынаючы ад стварэння доследнага сельскагаспадарчага кааператыва ва ўмовах Грузіі да вырашэння праблемы харчовай бяспекі».

Закранаючы палітычныя адносіны, Аляксандр Лукашэнка з задавальненнем адзначыў канструктыўны ўзровень узаемадзеяння дзвюх краін на міжнародных перагаворных пляцоўках, у тым ліку ў АБСЕ і ў фармаце ініцыятывы «Усходняе партнёрства». На сустрэчы прэзідэнтаў было разгледжана пытанне пра адкрыццё беларускага дыпламатычнага прадстаўніцтва ў Грузіі. «Мы таксама выступаем за актывізацыю міжпарламенцкага дыялогу паміж нашымі краінамі, разлічваем на падрыхтоўку парламентарыямі Беларусі і Грузіі заканадаўчых прапаноў, накіраваных на стымуляванне вытворчай кааперацыі», — сказаў беларускі лідар.

«Беларусь нязменна разглядае Грузію як дружалюбную і вельмі блізкую нам краіну. Развіццё беларуска-грузінскіх палітычных і эканамічных адносін адпавядае інтарэсам абедзвюх краін, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Грузія з'яўляецца для нас патэнцыяльна перспектыўным гандлёва-эканамічным партнёрам у рэгіёне Закаўказзя».

Па выніках перагавораў на найвышэйшым узроўні быў падпісаны пакет з 15 дакументаў, якія пашыраюць супрацоўніцтва дзвюх краін.

У прыватнасці былі заключаны пагадненні аб супрацоўніцтве ў галіне турызму, аховы інтэлектуальнай уласнасці, аб прадухіленні двайнога падаткаабкладання і папярэджанні ўхілення ад выплаты падаткаў на даходы і капітал, аб супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе ў мытных справах і ў сферы барацьбы са злачыннасцю, аб рэадмісіі.

Таксама бакі падпісалі пагадненні аб супрацоўніцтве ў галіне аховы здароўя і медыцынскай навукі, у сферы адукацыі, паміж гандлёва-прамысловымі палатамі.

Размаўляючы па выніках перагавораў з прадстаўнікамі сродкаў масавай інфармацыі, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь і Грузія знойдуць такія варыянты супрацоўніцтва, каб у партнёраў у ЕАЭС і ЕС не было прэтэнзій.

«Мы маем пэўныя абавязацельствы ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза, Грузія мае пэўныя абавязацельствы, падпісаўшы пагадненне аб асацыяцыі з Еўрапейскім саюзам, але яны ніколькі не супярэчаць нашым узаемаадносінам», — сказаў беларускі лідар. На думку Прэзідэнта Беларусі, калі гэтым вялікім саюзам патрэбны больш працяглы час, каб прыйсці да пагаднення, то паміж дзвюма краінамі, якія ўваходзяць у іх, гэта зрабіць вельмі проста.

«Ніякіх тут перашкод быць не можа. Мы разумныя народы, разумныя дзяржавы і знойдзем схему і варыянты супрацоўніцтва так, каб нашы партнёры ў ЕАЭС, ЕС не мелі да нас прэтэнзій. У гэтым вы можаце быць упэўнены», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік беларускай дзяржавы лічыць, што краінам неабходна максімальна выгадна выкарыстоўваць удзел Беларусі ў ЕАЭС і рэалізацыю Грузіяй пагаднення аб асацыяцыі з ЕС.

Прэзідэнт Грузіі таксама ўпэўнены, што для развіцця двухбаковага супрацоўніцтва не існуе ніякіх праблем. «Новыя саюзы — гэта новыя магчымасці, а не новыя бар'еры», — падкрэсліў Георгій Маргвелашвілі.

Прэзідэнт Беларусі лічыць таксама перададольным неразуменне паміж Грузіяй і Расіяй на палітычным узроўні. «Думаю, у найбліжэйшы час мы знойдзем хаця б адзін адказ на маленькае пытанне, які зрабіць крок, каб не толькі спыніць гэтую рыторыку, а зблізіць пазіцыі дзяржаў і жыць у адной сям'і, як некалі было. Бо няма супярэчнасцей паміж грузінскім народам, беларусамі, расіянамі. Ёсць неразуменне на палітычным узроўні, яно пераадольнае, але трэба ставіць перад сабой канкрэтныя задачы і рабіць канкрэтныя крокі», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Пазней Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з прэм'ер-міністрам Грузіі Іраклiем Гарыбашвілі, усклаў вянок да Мемарыяла героям, якія загінулі за адзінства Грузіі.

Прэзідэнт таксама сустрэўся з Каталікосам-Патрыярхам Усяе Грузіі, Архіепіскапам Мцхецкім і Тбіліскім, Мітрапалітам Піцундскім і Сухум-Абхазскім Іліёй ІІ.

Нікому сёння не дазволена і не пад сілу разбурыць адзінства праваслаўных народаў, заявіў на сустрэчы Аляксандр Лукашэнка. «Мы павінны глядзець у будучыню, і мы дамовіліся з вашымі кіраўнікамі, што ў бліжэйшы час прымем максімум намаганняў па лініі славянскіх народаў і нашага братняга грузінскага народа, каб пераадолець сумныя падзеі. Упэўнены, гэта нам пад сілу. Мы гэта зробім. Я магу вас у гэтым запэўніць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі перадаў самыя цёплыя пажаданні беларускага народа. «Памятаеце, што там, у цэнтры Еўропы, жывуць вашы родныя людзі, якія гатовыя па першым закліку прыйсці да вас на дапамогу. Мы заўсёды былі разам, гісторыя пра гэта сведчыць, і нікому сёння не дазволена, і нікому не пад сілу разбурыць гэта адзінства. Мы брацкія народы, мы былі разам і заўсёды будзем разам. Я хачу, каб вы гэта заўсёды памяталі», — сказаў беларускі лідар.

«Мы шмат добрага чулі пра вас і рады, што вы прыбылі ў Грузію і можаце падзяліцца сваім вопытам з нашымі кіраўнікамі, — сказаў Каталікос-Патрыярх усяе Грузіі. — Мы добра ведаем Беларусь, яе гісторыю, культуру, дасягненні, якія адбыліся ў апошні час пад вашым кіраўніцтвам». «Думаю, ваш візіт — прадвеснік міру, і я ўдзячны, што гэта прынясе добрыя плады нашым дзяржавам, — адзначыў ён. — Жадаю, каб гэты візіт быў пачаткам цеснага супрацоўніцтва і братняга яднання нашых народаў».

■ Удзячнасць і павага

# ПРА ВЕТЭРАНАЎ КЛАПОЦЯЦЦА

## ПЕНСІІ З ПАВЫШЭННЕМ

Пенсіі ў ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны значна вышэйшыя, чым сярэдні памер пенсіі па ўзросце. Пра гэта падчас анлайн-канферэнцыі на сайтах Міністэрства працы і сацыяльнай абароны і БЕЛТА паведаміла **міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА**. Так, сярэдні памер пенсіі па ўзросце інвалідаў вайны ў сакавіку-красавіку склаў 4 млн 836 тысяч рублёў. Для параўнання: сярэдні памер пенсіі па ўзросце складае 2 млн 748 тысяч рублёў.

З улікам асаблівага статусу ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, іх заслуг перад дзяржавай і грамадствам да іх пенсій устаноўлены павышэнні. Так, памеры павышэння сёння складаюць для інвалідаў вайны першай і другой групы 1 млн 428 тысяч 100 рублёў (400% мінімальнай пенсіі па ўзросце), для інвалідаў трэцяй групы і ўдзельнікаў вайны — 892 тысячы 563 рублі (250% мінімальнай пенсіі па ўзросце).

Да пенсій гэтым катэгорыям грамадзян таксама прыплюсоўваюцца даплаты ў памерах 267 769 рублёў — людзям, старэйшым за 75 гадоў, і 357 025 рублёў — людзям, старэйшым за 80 гадоў.

Што датычыцца павышэння пенсій, то працоўныя пенсіі ветэранам вайны пералічваюцца (як і ўсім пенсіянерам) у сувязі з ростам сярэдняй заработнай платы работнікаў і змяненнем велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва.

## ДАПАМОГА ДА СВЯТА

Практычна завершана выплата аднаразовай матэрыяльнай дапамогі да 70-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Яна пачалася 1 красавіка. Героі Савецкага Саюза і асобы, якія ўзнагароджаны ордэнамі Славы трох ступеняў атрымалі па 10 млн рублёў, інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны — па 8 млн рублёў, астатнія катэгорыі ветэранаў і асобы, якія пацярпелі ад наступстваў вайны, — па 3,5 млн рублёў.

Усяго матэрыяльную дапамогу атрымалі 44,1 тысячы чалавек, або 99% унесеных у выплатныя ведамасці.

Аднаразовая матэрыяльная дапамога, не атрыманая ў сувязі са смерцю атрымальніка ў перыяд выплаты (з 1 красавіка да 1 мая), па словах Марыяны Шчоткінай, членам сям'і не выплачваецца.



Фота БЕЛТА.

## БЫТ НЕ ЗАБЫТЫ

У нашай краіне штогод праводзіцца абследаванне матэрыяльна-бытавога становішча ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і асоб, якія пацярпелі ад наступстваў вайны. Так, у першым квартале бягучага года былі абследаваны ўмовы пражывання 16,8 тысячы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і 26,1 тысячы асоб, што пацярпелі ад наступстваў вайны.

Усе яны атрымліваюць дапамогу ў рамонце кватэр, дамоў, печаў, электраправодак, устаноўцы пажарных апавяшчальнікаў і інш. Вырашаюцца бытавыя праблемы — па апрацоўцы прысядзібных участкаў, забеспячэнні паlівам, прадастаўленні сацыяльных паслуг. Просьбы ветэранаў улічваюцца і выконваюцца ў адпаведнасці з планамі мерапрыемстваў, зацверджанымі ў выканкамах, гарадскіх адміністрацыях, сельскіх выканкамах.

Сацыяльныя паслугі дома атрымліваюць усе ветэраны і пацярпелыя ад наступстваў вайны, якія маюць у гэтым патрэбу. У дамах-інтэрнатах для састарэлых і інвалідаў пражываюць 126 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і 129 грамадзян, якія пацярпелі ў гады вайны. Калі няма працаздольных дзяцей або яны з'яўляюцца інвалідамі першай і другой груп, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і грамадзяне, якія пацярпелі ў гады вайны, пражываюць у дамах-інтэрнатах на ўмовах дзяржзабеспячэння.

**Святлана БУСЬКО** ■

**ДАРЭЧЫ**

Магчымасць увядзення новага статусу — «дзеці вайны», па словах міністра працы і сацыяльнай абароны, у нашай краіне не разглядаецца. Законам Рэспублікі Беларусь ад 17 красавіка 1992 года «Аб ветэранах» устаноўлены катэгорыі грамадзян, якія пацярпелі ад наступстваў Вялікай Айчыннай вайны. Прававы статус іншым катэгорыям грамадзян, што пацярпелі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку дзецям вайны, заканадаўствам не ўстаноўлены.

# Са студэнцкай лаўкі — на фронт...

**Новы інтэрнэт-праект пад дэвізам «Каб памяталі» быў запушчаны напярэдадні святкавання 70-годдзя Вялікай Перамогі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Яго аўтарамі сталі студэнты факультэта сацыякультурных камунікацый.**

Тэматычныя старонкі сайта «Слава героям БДУ» распавядаюць пра першыя дні вайны, пра дзейнасць БДУ ў эвакуацыі, пра герояў-добраахвотнікаў, якія пайшлі на фронт наўпрост з паточнай аўдыторыі, а таксама пра пасляваенны этап аднаўлення ВНУ.

З дапамогай візуальнага рада наведвальнікі сайта могуць убачыць 12 Герояў Савецкага Саюза — былых супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ, разбураныя ў 1941 годзе і адноўленыя пасля вайны навучальныя карпусы БДУ, архіўныя фатаграфіі даваеннага Мінска, ваенныя плакаты, экспазіцыю абноўленага Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Вядома, што ў суботу 21 чэрвеня 1941 года ў БДУ была запланавана навуковая сесія, прымеркаваная да 20-годдзя ўніверсітэта. Да гэтай падзеі падрыхтавалі вялікую выставу навукова-адукацыйных дасягненняў ВНУ. Але галоўная частка святкавання і пасяджэнне Вучонага савета павінны былі адбыцца 29-га чэрвеня... Сёння ўжо вядома, што менавіта 29 чэрвеня 1941 года Мінск быў акупаваны фашыстамі. У будынку фізічнага факультэта, дзе зараз размяшчаецца рэктарат, уладкаваліся нямецкія сувязісты чыгуначных войскаў, у біялагічным корпусе — камендатура горада і вобласці, а медыцынскі корпус заняло гестапа.

У маі 1943 года Савет народных камісараў прыняў рашэнне аднавіць дзейнасць БДУ на новым месцы — на станцыі «Сходня» пад Масквой. Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт і іншыя ВНУ краіны падзяліліся з БДУ патрэбнымі для вучобы матэрыяламі і ў кастрычніку 1943 года каля 300 беларускіх студэнтаў зноў прыступілі да заняткаў....

Мяркуецца, што ў далейшым сайт «Слава героям БДУ» будзе ўдасканальвацца і папаўняцца новымі візуальнымі і інфармацыйнымі матэрыяламі. Напрыклад, на ім будуць размешчаны сучасныя фатаграфіі святкавання ў БДУ 70-годдзя Вялікай Перамогі і Дня Незалежнасці Беларусі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Добрая справа

# А ЯКІ ТВОЙ ЭКАЛАГІЧНЫ СЛЕД?

**Памятаеце, як казаў Маленькі прынц: «Ёсць такое цвёрдае правіла.. Устаў раніцай, умыўся, прывёў сябе ў парадак — і адразу прывядзі ў парадак сваю планету». Навошта? Хаця б для таго, каб праз 100-200 гадоў тваё ўнукі і праўнукі маглі бегаць па зялёнай траўцы, дыхаць чыстым паветрам... Сапраўды, ці многія з нас, робячы чарговы крок, думаюць пра тое, які след мы пакінем пасля сябе? Як вы дабіраецеся на працу — пешшу ці на ровары? Ці выкідваеце батарэйкі ў адмысловыя кантэйнеры? Ці здаяце паперу ў макулатуру? А можа, выкарыстоўваеце пластыкавыя пакеты ды бутэлькі другасна? Яшчэ раз задумацца над сваім ладам жыцця беларусаў заклікаюць арганізатары Тыдня ўстойлівага развіцця, які пройдзе з 24 красавіка па 22 мая.**

У межах Тыдня ўстойлівага развіцця (назва сімвалічная, бо не надта мілагучна гучыць «месячнік») запланавана больш за 120 мерапрыемстваў ва ўсіх рэгіёнах краіны. Майстар-класы, круглыя сталы, конкурсы, мясцовыя фестывалі, экалагічныя, сацыяльныя і культурныя акцыі, семінары... Вынікі будуць падводзіцца на Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, дзе пойдзе гаворка ў тым ліку і пра тое, як правільна траціць чалавечыя, прыродныя і фінансавыя рэсурсы, каб іх хапіла не толькі нам, але і будучым пакаленням.

Гартаю каляндар падзей Тыдня ўстойлівага развіцця — і прыемна здзіўляюся: шмат цікавых ініцыятыў маюць практычную накіраванасць. У прыватнасці ў вёсцы Дубінка, што ў Гродзенскай вобласці, пройдзе перасоўны фрымаркет (бясплатны кірмаш), дзе вяскоўцаў будуць вучыць раздзельнаму збору смецця, дадатковым крыніцам заробку. Фермеры-жанчыны Гродзенскай вобласці выступілі з ініцыятывай правесці семінар па арганічным земляробстве, на Віцебшчыне будуць ачышчаць раку ад смецця...

— Напярэдадні Тыдня ўстойлівага развіцця праводзіўся конкурс на найлепшую мясцовую ініцыятыву, — распавёў **каардынатар кірунку «Устойлівае развіццё» Праграмы падтрымкі Беларусі Федэральнага ўрада Германіі Аляксандр ПЕРАСЫПКІН.** — Мы атрымалі больш за 130 заявак з розных рэгіёнаў Беларусі. Найбольш актыўнымі ўдзельнікамі конкурсу аказаліся Віцебскі, Гродзенскі і Брэсцкі рэгіёны (60% ад усіх заявак). Больш за ўсё ініцыятыў звязана з адукацыяй і працай у інтарэсах устойлівага развіцця, з энергаэфектыўнасцю, выкарыстаннем аднаўляльных крыніц энергіі, аграэкатурызмам, арганічным земляробствам. Многія з іх атрымалі фінансавую падтрымку. Галоўная ідэя мерапрыемства — узмацніць рух за ўстойлівае развіццё ў Беларусі, абудзіць ініцыятыву ў нашых людзях, паспрыяць больш актыўнаму ўзаемадзеянню дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый і бізнесу. У гэтым напрамку ўжо шмат чаго робіцца. У прыватнасці летась урадам распрацоўвалася канцэпцыя новай Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця Беларусі да 2030 года. Больш за 20 стратэгій маецца на мясцовым узроўні.

**Надзея ДРЫЛА**

Самая магутная ў свеце гідраэлектрастанцыя на рацэ Янцзы ў Кітаі.



# Эфектыўная сувязь

Мінгарвыканкам і аблвыканкамы праведуць 25 красавіка чарговыя прамыя тэлефонныя лініі

Рэспубліканская і рэгіянальная ўлада адкажа на званкі насельніцтва. На прамой тэлефоннай лініі — гарадскія і абласныя выканаўчыя камітэты, а таксама кіраўніцтва раёнаў.

У жыхароў краіны ў чарговы раз будзе магчымасць задаць пытанне і атрымаць адказ. Як паказваюць вынікі дыялогу, у пераліку актуальных тэм — сфера жыллёва-камунальнай гаспадаркі, будаўніцтва і прыватызацыі, адукацыі.

У гэтую суботу, 25 красавіка, з 9.00 да 12.00 на пытанні адкажуць:

**Брэсцкі аблвыканкам**

Ашмянцаў Сяргей Дзмітрыевіч — старшыня абласнога Савета дэпутатаў: 80162213121;

**Віцебскі аблвыканкам**

Ацясаў Аляксандр Ягоравіч — старшыня абласнога Савета дэпутатаў: 80212204260;

**Гомельскі аблвыканкам**

Максіменка Аляксандр Уладзіміравіч — першы намеснік старшыні: 80232751237;

**Гродзенскі аблвыканкам**

Папоў Ігар Андрэевіч — кіраўнік справамі: 80152735644;

**Мінскі аблвыканкам**

Неўмяржыцкі Сяргей Пятровіч — намеснік старшыні: 5004160;

**Магілёўскі аблвыканкам**

Чыкіда Алег Іванавіч — першы намеснік старшыні: 80222501869;

**Мінскі гарвыканкам**

Котаў Мікалай Аляксандравіч — кіраўнік справамі: 222 44 44.

■ Захапляльны атам

# Пра ядзерныя тэхналогіі — папулярна

**У Мінску з'явіўся першы ў краіне Інфармацыйны цэнтр па атамнай энергіі. На яго ўрачыстым адкрыцці пабываў карэспандэнт «Звязды».**

Цэнтр стаў 22-м у шэрагу аналагічных па ўсім свеце. Іх стварае карпарацыя «Расатам» у тых краінах, дзе ў будаўніцтве атамных станцый выкарыстоўваюцца расійскія тэхналогіі. Як вядома, менавіта спецыялісты з нашай усходняй краіны-суседкі будуюць Беларускую АЭС у Астравецкім раёне. Яшчэ ў 2009 годзе ў Астраўцы з'явіўся інфармацыйны цэнтр па будаўніцтве АЭС, цяпер жа чарга дайшла і да сталіцы.

Інфармацыйны цэнтр займае некалькі памяшканняў у будынку Рэспубліканскага цэнтра інавацыйнай і тэхнічнай творчасці на вуліцы Макаёнка.

— Сістэма адукацыі Беларусі падключылася да падрыхтоўкі спецыялістаў па эксплуатацыі атамнай электрастанцыі, — распавёў **намеснік міністра адукацыі Віктар ЯКЖЫК** на ўрачыстым адкрыцці. — У першую чаргу размова ідзе пра інжынераў. Установы дадатковай адукацыі, арыентаваныя на школьнікаў, якраз даюць унікальную магчымасць папулярызаваць тэхнічныя прафесіі. Але цэнтр будзе працаваць і на дарослую аўдыторыю, бо пытанні бяспекі атамнай энергіі актуальныя для ўсіх. Акрамя таго, гэта яшчэ адзін з сумесных праектаў па дадатковай адукацыі, які мы рэалізуем разам з Расійскай Федэрацыяй, і спадзяёмся, што наведваць установу будуць не толькі мінчане і жыхары рэгіёнаў Беларусі, але і расійскія школьнікі.

Галоўны аб'ект цэнтра — сучасны мультымедыйны кінатэатр, які аб'ядноўвае ў сабе 3D-праекцыю, камп'ютарную графіку і анімацыю, стэрэагук. Гледачы размяшчаюцца за сталамі з персанальнымі маніторамі і інтэрактыўнымі кансолямі, з дапамогай якіх могуць знаёміцца з адукацыйнымі ролікамі. Журналістам прадэманстравалі адзін з іх пад назвай «Гарызонты атама»: на вялікім экране наглядна паказалі, як радыяцыя выкарыстоўваецца ў медыцыне, мытнай справе, іншых сферах жыцця. Кожны з ролікаў завяршаецца невялікай гульнёй у форме віктарыны, пры дапамозе якой карыстальнік замацоўвае веды на практыцы.

Не менш цікавыя аб'екты знаходзяцца ў фае цэнтра. Гэта, напрыклад, інтэрактыўны макет Беларускай АЭС, што ўяўляе з сябе карту з замацаванымі побач планшэтнымі камп'ютарамі, на якіх усталявана спецыяльная праграма. Карыстальнік наводзіць камеру планшэта на карту і ў інтэрактыўным рэжыме вывучае інфраструктуру станцыі, прызначэнне і характарыстыкі розных яе аб'ектаў. Дарэчы, праграму можна ўсталяваць на свой смартфон або планшэт і бліжэй «пазнаёміцца» са станцыяй ужо дома. Побач — універсальны радыёметр, стаўшы на платформу якога кожны ахвотны можа паглядзець, наколькі моцнае радыяцыйнае выпраменьванне стварае яго арганізм. Яшчэ адзін макет дэманструе працу сістэм бяспекі сучасных АЭС.

Першымі наведвальнікамі Інфармацыйнага цэнтра па атамнай энергіі сталі **навучэнцы Рэспубліканскага цэнтра інавацыйнай і тэхнічнай творчасці. 11-гадовыя Сяргей КАРАЛЁЎ і Мікіта КІЖЫК** займаюцца тут авіямадэляваннем.

— Мне больш за ўсё спадабалася карта горада ў 3D, — кажа Мікіта, — усё аб'ёмнае, прыгожае. Зацікавіла карта свету, на якой можна знайсці ўсе атамныя электрастанцыі ў розных краінах і пачытаць пра іх. Шчыра кажучы, тут можна некалькі гадзін правесці і не пагледзець усё.

— Увогуле, нас вельмі цікавіць атамная энергетыка, — дадае Сяргей. — Асабіста я заўсёды хацеў займацца навукай, можа быць, зраблю выбар якраз на карысць атамнай энергетыкі, бо гэта неверагодна цікава.

— На жаль, сёння многія не разумеюць таго, што атамная энергетыка — падмурак энергетычнай бяспекі нашай краіны, бо зараз мы надта моцна залежым ад такога энергарэсурсу, як газ, — зазначыў **намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір СЯМАШКА**, які таксама паўдзельнічаў у адкрыцці. — Нарэшце ў нас з'явілася месца, дзе мы можам кожнаму патлумачыць, чаму сучасная атамная энергетыка бяспечная і ў чым яе перавагі над астатнімі крыніцамі энергіі. Акрамя таго, нам трэба выхоўваць наступнае пакаленне, у рукі якога мы перададзім станцыю.

Інфармацыйны цэнтр будзе працаваць на некамерцыйнай аснове. Акрамя праграм па атамнай энергетыцы, у ім будуць праграмы па астраноміі, прыродазнаўстве і іншых навуках.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ**

# Рэкорд Расіі — у Герасімені

**Лідар зборнай Беларусі па плаванні Аляксандра Герасіменя стала пераможцай адкрытага чэмпіянату Расіі на дыстанцыі 50 м вольным стылем. Першынство гэтымі днямі праходзіць у Маскве.**

Узнагарода за выйгрыш гэтай дыстанцыі стала другой для спартсменкі на турніры, удзел у якім прымаюць і вядучыя беларускія плыўцы.

Падчас спаборніцтваў на адной са сваіх каронных дыстанцый Аляксандра Герасіменя нязменна паляпшала час яе праходжання. Па выніках папярэдніх заплываў яна была 4-й (25,60 сек.). У паўфінальным раўндзе беларуска была 5-й (25,49 сек.), а ў фінале не пакінула сапернікам шанцаў на поспех і фінішавала першай. Яе пераможны час — 24,72 сек. Адначасова Аляксандра Герасіменя пабіла рэкорд Расіі на 50 м вольным стылем, які быў роўны 24,82 сек. і належаў Лізавеце Базаравай. На гэты раз яна стала толькі 4-й (25,21 сек.). Раней на турніры Аляксандра Герасіменя заваявала бронзавую ўзнагароду на дыстанцыі 100 м вольным стылем з вынікам у фінале 54,38 сек. Таксама ўзнагароду найвышэйшай вартасці здолеў выйграць на чэмпіянаце і беларускі плывец Яўген Цуркін на адной са сваіх каронных дыстанцый 50 м батэрфляем (23,26 сек.).

Завяршыцца адкрыты чэмпіянат Расіі па плаванні сёння. У заключны дзень беларускія спартсмены выступяць у некалькіх заплывах.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# БАРАЦЬБА ЗА МЕДАЛІ БЕЗ БЕЛАРУСАЎ

**На чэмпіянаце свету па футзале, які гэтымі днямі праходзіць у Беларусі, наша дружына саступіла ў чвэрцьфінале Парагваю і пакінула спаборніцтвы.**

Калі наша зборная выйшла з групавой стадыі, дзе апярэдзіла моцных бразільцаў і баяздольных аўстралійцаў, гэта ўжо многімі расцэньвалася як добры вынік. Але хлопцы марылі пра медалі і п'едэстал. Яны не збіраліся спыняцца на дасягнутым. Аднак матч з Парагваем, які на апошнім першынстве свету стаў сярэбраным прызёрам, радасці не прынёс. Хутчэй, наадварот. Лік 4:0 на карысць парагвайцаў кажа сам за сябе. Хлопцы ў паласатых чырвона-белых футболках былі відавочна мацнейшымі за беларусаў. Яны цудоўна камбініравалі на паркеце Палаца спорту, трымалі мяч і выдатна рэалізоўвалі свае моманты.

— Парагвай — самая моцная і вопытная каманда сярод тых, з кім мы сустракаліся на чэмпіянаце свету, — заўважыў пасля матча наш варатар Дзмітрый Кудзі. — Але, шчыра кажучы, мы з імі гулялі не ў свой футбол. Сапернік пераіграў нас на класе.

***— Мне здаецца, што сустрэч менавіта з такімі камандамі, як Парагвай, Уругвай, Калумбія, нашай зборнай вельмі не хапае.***



— Так, калі б мы варыліся ў гэтым паўднёваамерыканскім «катле», прагрэсу, развіцця ад гэтага было б больш.

Астатнія чвэрцьфіналы прынеслі наступныя вынікі: Уругвай — Бельгія — 4:5, Калумбія — Расія — 5:3, Аргенціна — Чэхія — 3:2. Такім чынам у паўфіналах, якія пройдуць сёння на «Мінск-Арэне», сустрэнуцца Бельгія — Калумбія, Парагвай — Аргенціна.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

■ Банк абяцае

# КАРТКА СТАЛА СЕЙФАМ

## Гэтае сцвярджэнне дзейнічае толькі тады, калі трымальнік карткі дакладна выконвае ўмовы дагавора з банкам-эмітэнтам аб яе выкарыстанні

**У нашу рэдакцыйную пошту працягвае паступаць шмат розных пытанняў, якія тычацца безнаяўных разлікаў. Сумесна з фінансавымі экспертамі наша выданне працягвае кансультацыі па самых актуальных напрамках гэтай сферы. На пытанні чытачоў «Звязды» адказвае <u>выканаўца абавязкаў дырэктара акцыянернага таварыства «Плацежная сістэма «БелКарт» Уладзімір ГУСАРАЎ.</u>**



### ПРЭЗУМПЦЫЯ НЕВІНАВАТАСЦІ «ПА-БАНКАЎСКУ»

**Алена ГРЭЧКА,** *г. Орша.*
**— Я працую ў банку. Прынцып нулявой адказнасці ўзаконіў Нацыянальны банк краіны адпаведным дакументам. Як гэта паўплывае на бізнес фінансавых устаноў?**

— Пастанова Нацбанка краіны №843 адназначна станоўча паўплывае на развіццё айчыннага рознічнага банкаўскага бізнесу. Раней, да выхаду гэтага рашэння рэгулятара, усе недахопы тэхналогій у галіне аперацый з банкаўскімі карткамі фактычна аплачваў кліент-трымальнік банкаўскай карткі, калі з яго рахунку несанкцыянавана спісваліся грашовыя сродкі.

Цяпер, у выніку рашэння Нацыянальнага банка, грашовыя сродкі кліента юрыдычна абаронены, калі чалавек выканаў усе ўмовы дагавора з банкам-эмітэнтам па выкарыстанні карткі. Рэпутацыя банкаў і давер да іх як пастаўшчыкоў фінансавых паслуг, безумоўна, сёння павысіцца. Але трымальніку карткі таксама важна разумець і тое, што ён абавязаны дакладна выконваць умовы падпісанага дагавора. На мой погляд, сёння лозунг «захоўвайце грошы ў банку» напоўніўся яшчэ большым эканамічным сэнсам на карысць кліентаў.

**— Як гэтая пастанова паўплывае на трымальніка карткі, у якога сапраўды былі спісаныя сродкі? Што кліент банка павінен рабіць, калі выявіў несанкцыянаванае спісанне сродкаў? — спрабуе ўдакладніць сваё пытанне спадарыня Алена.**

— Новая рэдакцыя інструкцыі аб парадку здзяйснення аперацый з банкаўскімі плацежнымі карткамі дае адназначныя адказы для трымальнікаў картак аб парадку іх дзеянняў пры выяўленні фактаў несанкцыянаваных аперацый спісання грошай з іх рахункаў. Так, пры выяўленні ашуканскіх аперацый па рахунку кліент павінен у 30-дзённы тэрмін з моманту атрымання інфармацыі аб змене астатку па рахунку, да якога выпушчана банкаўская картка, звярнуцца з пісьмовай заявай у банк, які выпусціў картку, з апратэставаннем не санкцыянаваных ім расходных аперацый.

Банк, у адпаведнасці са сваёй унутранай працэдурай, прааналізуе плацежную гісторыю кліента, каб пераканацца ў непарушэнні ім правіл выкарыстання карткі і іншых дзеянняў, якія можна было б кваліфікаваць як парушэнне дагавора. Пры выкананні дагаворных адносін, трымальнік карткі атрымлівае кампенсацыю грашовых сродкаў, несанкцыянавана спісаных з яго рахунку.

Па тэрмінах падобнае мерапрыемства выглядае так: вяртанне грошай кліенту па аперацыях на тэрыторыі нашай краіны адбываецца на працягу 45 каляндарных дзён, для аперацый за мяжой — 90 каляндарных дзён з даты звароту кліента з пісьмовай заявай у банк. Тут трэба асобна адзначыць, што кампенсацыя грашовых сродкаў банкам ажыццяўляецца толькі пасля пісьмовага звароту трымальніка карткі ў фінансавую ўстанову.

### ХІТРЫКІ З КАРТКАМІ КАШТУЮЦЬ ДОРАГА

**Алесь ЛІСІЦА,** *г. Мінск.*
**— Не сакрэт, што сярод уладальнікаў картак бываюць і нячыстыя на руку дзялкі. Якім чынам банк будзе выяўляць такіх махляроў, што будуць спрабаваць падмануць банк і казаць пра незаконна спісаныя сродкі? Якое пакаранне чакае такіх «крэатыўных» трымальнікаў?**

— Трэба адзначыць, што, згодна з агучанай пастановай № 843, калі банк атрымаў адпаведную пісьмовую заяву ад трымальніка карткі, то ён абавязаны пакрыць сродкі ў вызначаныя тэрміны, а ўжо потым завяршыць расследаванне аб несанкцыянаваным спісанні сродкаў. Калі ў выніку расследавання праваахоўнымі органамі высветліцца факт махлярства з боку трымальніка карткі, то такі нядобрасумленны кліент не толькі panясе адказнасць перад банкам, але і можа быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасці па артыкуле 209 КК Беларусі «Махлярства». Зразумела, што калі па выніках расследавання будзе выяўлены факт махлярства з боку кліента, то сума грашовых сродкаў, якую банк кампенсаваў яму, згодна з пастановай рэгулятара, будзе вернута чалавекам банку. Прынамсі, зыходзячы з практыкі выканання трымальнікамі дэбетавых і крэдытных картак патрабаванняў заканадаўства, можна адзначыць, што ўзровень законапаслухмянасці грамадзян нашай краіны вельмі высокі.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

■ Фінансы

# РУБЕЛЬ ЦІ ВАЛЮТА?

**Спецыялісты сцвярджаюць, што ўклады ў рублях сёння больш выгадныя, чым у валюце.**

Гэта можна заўважыць, калі глядзець на дынаміку працэнтных ставак і курсаў валют. Як адзначыў **дырэктар офіса афіцыйнага партнёра кампаніі «Альпары» ў Мінску Аляксандр САБОДЗІН**, працэнтныя стаўкі па рублёвых дэпазітах зніжаюцца з пачатку года з 50% да ўзроўню трошкі ніжэйшага за 40%. Па валютных дэпазітах даюць каля 5,5% гадавых.

«Пры гэтым варта ўлічыць зніжэнне курсу долара ад значэнняў вышэй 15 000 рублёў да ўзроўняў каля 14 500. Калі да высокіх працэнтаў па рублях дадаць бягучае ўмацаванне нацыянальнай валюты да долара, выбар у бок рублёвых дэпазітаў становіцца больш прыкметным», — падкрэсліў Аляксандр Сабодзін падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА.

Пры гэтым эксперт парэкамендаваў, што ва ўмовах няпэўнасці лепш аддаваць перавагу кароткім, аднамесячным дэпазітам і падаўжаць іх у выпадку неабходнасці.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■


ЕВРОТОРГ ИНВЕСТБАНК

**ОАО «Евроторгинвестбанк»**
www.etib.by

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
**на 1 апреля 2015 года**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | на 01.04.2015 г. | на 01.04.2014 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 32 549 | 14 426 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 50 228 | 5 441 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 125 215 | 29 246 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 1 877 | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 472 206 | 213 048 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 19 836 | 10 685 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | - | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | |
| 13 | Прочие активы | 1112 | | 134 585 | 2 802 |
| **14** | **ИТОГО активы** | **11** | | **836 496** | **275 648** |
| **15** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 260 408 | 84 408 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 130 104 | 101 022 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 41 | 9 884 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 10 462 | 1 284 |
| **23** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **401 015** | **196 598** |
| **24** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 414 924 | 64 924 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 4 664 | 4 308 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 2 080 | 2 183 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 13 813 | 7 635 |
| 30 | ВСЕГО капитал | 121 | | 435 481 | 79 050 |
| **31** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **836 496** | **275 648** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**
**на 1 апреля 2015 года**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | на 01.04.2015 г. | на 01.04.2014 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 39 510 | 21 512 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 13 275 | 9 130 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 26 235 | 12 382 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 8 209 | 6 880 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 554 | 291 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 7 655 | 6 589 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 16 | (16) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 13 601 | 2 066 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (2 796) | 2 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 22 026 | 4 167 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 2 921 | 524 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 20 340 | 12 008 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 725 | 402 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 4 541 | 4 970 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 1 172 | 915 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **3 369** | **4 055** |

**И.о. Председателя Правления** **В.Н. Павлюк**

**Главный бухгалтер** **С.С. Ящук**

**Дата подписания 16 апреля 2015 г.**

Лицензия ОАО «Евроторгинвестбанк» № 26 от 28.05.2013 г. УНП 807000043.


■ Каляровае жыццё

# ЯКІ ПРЫНТАР ВЫБРАЦЬ?

## Лазерныя болей і хутчэй друкуюць, а для фотаздымкаў падыходзяць толькі струменныя

**Камп'ютарам (і нават не адным) сярэднестатыстычную беларускую сям'ю ўжо не здзівіць. А вось прынтары ёсць далёка не ў кожнай кватэры. Тыя, каму пастаянна неабходна нешта раздрукоўваць, даўно зразумелі выгаду наяўнасці ўласнага «друкавальнага цэнтра», а некаторыя яшчэ толькі пачынаюць прыглядацца да хітрага агрэгата і задумваюцца аб яго набыцці. Відаць, цэны на паслугу па раздрукоўцы ці капіраванні/сканаванні дакументаў занадта падняліся. Карацей, адна наша чытачка папрасіла дапамагчы ёй у выбары прынтара. Калі ласка.**



### Колькі будзеце друкаваць?

Першае пытанне, якое вы павінны задаць сабе перад выбарам прынтара, гэта як шмат і як часта вы збіраецеся нешта друкаваць. Гэтае ж пытанне вы абавязкова пачуеце ад прадаўца-кансультанта ў краме. Дык вось, калі вы хочаце зрэдчас раздрукаваць нешта і пры гэтым колер вас не турбуе, то лепей за ўсё браць чорна-белы лазерны прынтар. Ён будзе больш хуткім (каля 20 старонак у хвіліну супраць 5-8) і эканамічным, нягледзячы на тое, што кошт яго вышэйшы за кошт струменнага і запраўка картрыджаў таксама даражэйшая. Атрымліваецца так, бо лазернага картрыджа хапае на большую колькасць старонак — каля 1000. А струменнага больш за 200 наўрад ці надрукуюць. Акрамя таго, картрыдж лазернага прынтара не засыхае, калі ім доўгі час не карыстацца. Струменны павінен пастаянна нешта раздрукоўваць — хаця б раз на тыдзень. І гэта не байкі, бо ў мяне ў самога раней быў такі. У ім я мяняў картрыдж прыкладна раз на год. Пры гэтым друкаваў шмат — падчас навучання на ўніверсітэце гэта неабходнасць. Часам наваt кнігі па 90 старонак А4 друкаваў — і гэта для мяне было выгадна. А потым адбыўся вялікі (можа, месяцаў восем) перапынак, калі я не карыстаўся гэтым прынтарам, — і ён усё роўна выдатна раздрукаваў неабходныя дакументы. Цяпер у мяне струменны прынтар разам з копірам і сканерам, які дае яшчэ больш якасны друк (калі здымаеш копію, то арыгінал выглядае горш), але за год я ўжо тройчы змяняў картрыджы.

У выпадку, калі вы дакладна ведаеце, што друкаваць будзеце шмат і колер вам не патрэбен, то таксама варта ўзяць лазерны прынтар.

І толькі тады, калі вы ведаеце, што будзеце рэгулярна, але ў невялікай колькасці рабіць раздрукоўкі (тым больш калі часам яны будуць каляровыя), вы можаце смела выбраць струменны агрэгат. У дадатак вы атрымаеце магчымасць раздрукоўваць яшчэ і фотаздымкі.

### Запраўляць ці купляць?

Ёсць яшчэ адна істотная розніца паміж двума відамі прынтараў — праблема з запраўкай картрыджаў. Калі лазерныя прынтары абсалютна спакойна ўспрымаюць перазапраўку і іх мяняць трэба толькі пасля 3-5 такіх працэдур, то са струменнымі могуць быць праблемы. Адна справа, калі фірма-вытворца проста рэкамендуе вам кожны раз купляць арыгінальныя картрыджы і пры ігнараванні гэтай рэкамендацыі ўсё роўна друкуе. Праўда, якасць будзе трошкі горшай, бо тонер адрозніваецца ад арыгінала. І зусім іншая справа, калі прынтар настроены на тое, што неарыгінальны картрыдж не будзе ўспрыняты. Як кажа **майстар па рамонце і запраўцы офіснай тэхнікі Віталь АЛЯХНОВІЧ,** ёсць толькі адзін такі вытворца. Ён дастаткова папулярны, таму не палянуйцеся пацікавіцца аб гэтым у прадаўца. Дарэчы, спецыяліст таксама сцвярджае, што сёння часцей купляюць менавіта лазерныя прынтары.

### Для чаго там WI-FI?

Апошнім часам вытворцы офіснай тэхнікі ўсё часцей дапаўняюць прынтары функцыяй WI-FI. Гэта робіцца для зручнасці кліента, каб ён мог раздрукоўваць без правадоў. На цане гэта асабліва не адбіваецца.

Ведаеце, яшчэ больш зручна і выгадна купіць агрэгат, які спалучае прынтар, копір і сканер. Знайсці яго не праблема. І ён не заўсёды будзе даражэйшым за звычайны прынтар. Хаця Віталь Аляхновіч кажа, што нармальны лазерны можна купіць за прыкладна 1 млн 100 тысяч рублёў (з функцыямі копіра і сканера — каля 2 млн). Струйны, па яго словах, будзе каштаваць ад 700 тысяч (з дадатковымі функцыямі — бліжэй да мільёна).

Мой уласны аналіз коштаў дае трошкі іншыя вынікі. Звычайны лазерны прынтар каштуе ад каля 600 тысяч да 4 мільёнаў. Струйны — ад 450 тысяч да 1,5 мільёна. Лазерны «камбайн» — ад 900 тысяч да 5-6 мільёнаў. Струйны — ад 550 тысяч да 4 мільёнаў.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

**Калі вы хочаце жыць эканомна і адначасова годна, задавайце актуальныя пытанні нашай рэдакцыі. Тэлефануйце і пішыце нам — і мы пастараемся вам дапамагчы.**

**Звязацца з карэспандэнтамі можна па тэлефонах: 8 (017) 2923802 і 8 (017) 2871751, а таксама па электроннай пошце: <u>info@zvyazda.minsk.by</u> (з пазнакай «Для аддзела эканомікі»).**

■ Свая справа

# НЕ ТОЛЬКІ КАШТОЎНАЕ ФУТРА,

## або Чаму б гультаям не заняцца... трусамі, напрыклад?

**Рэспубліканская выстава-кірмаш «Залаты падворак» прайшла ў Віцебску. На ёй жывымі экспанатамі сталі гусі і цацаркі, куры і перапёлкі... і нават прыручаная галка. Усе яны на дзень пасяліліся на тэрыторыі культурна-гістарычнага комплексу «Залатое кола Віцебска «Дзвіна». Але карэспандэнтам «Звязды» падалося, што там усё ж такі «правілі баль» трусікі. Здзівіла і вялікая чарга з ліку ахвотных купіць уваходны квіток на выставу.**



**Уладзімір Дзмітрыеў разам з бацькам займаецца птушыным бізнесам.**

Памятаеце знакаміты нумар гумарыстаў: «Трусы — гэта не толькі каштоўнае футра, але і...» На кірмашы многія вушастыя былі настолькі прыгожымі, што вачэй немагчыма адвесці. Арганізатары запрасілі ў Віцебск трусаводаў, якія разводзяць племянных жывёл разнастайных парод: Рэкс голд, Французскі баран, Венскія блакітныя, Каліфарнійская, Бельгійскі велікан, Чэшскі альбінос і іншыя.

— Трусамі займаемся з 2006 года. Усе жывёлы васьмі парод на нашай ферме — ад вядучых трусаводаў Славакіі, Германіі, Чэхіі, Аўстрыі. Самі там іх купляем. Вытворцы маюць пашпарты (радаводы), якія пацвярджаюць племянное паходжанне. Прывозім трусоў па дазволе Міністэрства сельскай гаспадаркі Беларусі. Утрымліваюцца жывёлы асобна ў клетках уласнай канструкцыі. Апошнія абсталяваны кармушкай, яслямі для сена і паілкай з падагрэвам для вады — зімой. Вось гэты (паказвае) пароды Вялікі светлы серабрысты (сярэдняя мясная парода, вага дарослых трусоў да 5 кілаграмаў. — **Аўт.**). Для параўнання: дарослы Бельгійскі волат «цягне» на 10 кілаграмаў, — расказвае «Звяздзе» **Сяргей Васіленка з аграгарадка Яроміна Гомельскага раёна.**

Трусавод не здае падапечных на мяса, а рэалізуе для развядзення. Васьмімесячны Бельгійскі велікан можа каштаваць 160 долараў. Не слабая цана? Дык паспрабуйце штодня даглядаць мноства жывёл, як малых дзяцей.

Мяне здзівіла, што заморскіх гадаванцаў не кормяць капустай. А многія, напэўна, думаюць, што трусы яе любяць.

— Не, нашым не даём, ёсць іншы натуральны корм: морква, збожжа, кукуруза, буракі кармавыя, сена. Ужо ў 8 месяцаў самка гатова прыносіць патомства, — дадае жонка трусавода.

А рабочы мясакамбіната з Оршы займаецца вушастымі для атрымання мяса.

— Разводжу прадстаўнікоў трох парод. Мяса здаю на Аршанскі мясакансервавы камбінат. З яго робяць дзіцячае харчаванне. Прайшоў спецыяльную атэстацыю. Кантроль за якасцю кармоў і іншым ажыццяўляюць ветурачы, — распавядае **Леанід Чарвінскі.**

А **Мікалай Дзмітрыеў** са Старадарожскага раёна па-добраму «памяшаны» на курах і пеўнях.

— Другі год пры курах *(смяецца)*. У нас з сынам Уладзімірам шэсць парод. Да выхаду на пенсію працаваў настаўнікам. Не, вы не маеце рацыі: курамі займаюся не таму, што выгадней, чым вучыць. Справа не ў прыбытку. Трэба чымсьці займацца для душы. З зямлёй я на «Вы». Лес і рэчка, куры — так выдатна, і мне гэта падабаецца. Разводжу і прадаю. Я — член аб'яднання аматараў галубоў і дэкаратыўных птушак. На кірмашы часта прыязджаю, — распавядае аматар птушак.

Заводчыкі і ўладары жывёл бясплатна пракансультавалі ўсіх ахвотных наконт утрымання, кармлення, вакцынацыі, кляймення жывёл і птушак. У забаўляльнай праграме на кірмашы правялі конкурсы: «Пушысты любімец публікі», «Птушыны любімец публікі», «Самае доўгае вуха», «Самы цяжкі трусік»...

Пасля прыемных уражанняў ад убачанага міжвольна ўзнікла думка. Вось многія не могуць знайсці працу, тым больш па душы. Гультаі, якіх цяпер літаральна прымушаюць працаваць, спасылаюцца на недахоп «нармальнай працы». Маўляў, «гарбаціцца за капейкі»? Дык, можа, узяліся б за развядзенне тых жа вушастых, курэй, качак, цацарак? Раптам вы прыроджаны заводчык? І галодным не застанешся, і мяса на продаж заўсёды будзе. А калі ўжо не можаш забіваць, дык рэалізуй племянных жывёл... Былі б толькі інтарэс і жаданне...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**



**Сяргей Васіленка ганарыцца сваімі пушыстымі гадаванцамі.**

Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

■ Неасабісты суб'ектыў

# ПОПЫТ І ПРАПАНОВА



## Калі «пацярпелыя» такімі не выглядаюць

ДНЯМІ ў Віцебску Следчы камітэт завяршыў расследаванне справы аб махлярстве ў асабліва вялікім памеры. Справа, я б сказала, паказальная, прычым не з разраду «Як нас дураць». Тут больш дарэчы будзе «Самі сабе шукаем гуза». І пацярпелыя ў гэтай сітуацыі, нягледзячы на панесеныя страты, не надта пацярпелымі і выглядаюць. Бо свае кроўныя аддавалі махлярцы, каб яна дапамагла вырашыць праблему, абышоўшы закон.

Зрэшты, мяркуйце самі. Актыўную пенсіянерку затрымалі ў жніўні мінулага года на гарачым: пры атрыманні сарака мільёнаў рублёў. За што і ад каго? Жанчына прадстаўлялася супрацоўніцай фонду сацыяльнай абароны насельніцтва і прапаноўвала тым, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, пабудаваць кватэру за 10% (!) ад яе кошту. Вядома ж, за спрыянне ў такой жыццёва важнай справе ўсемагутнаму супрацоўніку фонду сацабароны належала грашовае ўзнагароджанне.

Смешна і шыта белымі ніткамі? Але ж ахвотнікі знайшліся! Прычым, як высветліла следства, падобным бізнесам прадпрымальная кабета займалася на працягу пяці гадоў. Схема была простая: махлярка выдавала сябе за большага ці меншага чыноўніка, які мае паўнамоцтвы і магчымасці вырашаць балючае жыллёвае пытанне, і прапаноўвала за пэўную плату пасадзейнічаць у танным будаўніцтве, афармленні неабходных дакументаў. Часам праяўляла фантазію і брала ў людзей грошы, нібы перадаць хабар іншаму чыноўніку, які можа аператыўна вырашыць пытанне аб месцы ў інтэрнаце ў абласным цэнтры. Хтосьці плаціў дабрадзейцы чатыры мільёны, хтосьці — сорак, а хтосьці — і ўсе сто семдзесят (гэта, пэўна, ужо быў выплачаны «поўны кошт» «таннага жылля»). Атрымала «чыноўніца» дзякуючы ўласнай абаяльнасці (а хутчэй — людской празе да «халявы» ці «абы дзешавей») больш за мільярд рублёў. Пацярпелых больш за трыццаць чалавек, як напісана ў следчым пратаколе, «рознага сацыяльнага статусу і ўзросту»...

НЕСУМНЕННА, палепшыць жыллёвыя ўмовы хочуць многія. Несумненна, не для ўсіх гэта магчыма зрабіць сёння або заўтра. Несумненна, будаўніцтва жылля ў наш час — справа нятанная. Несумненна, кожны хоча вырашыць пытанне хутчэй і танней. Але адкуль такая наіўная вера ў тое, што вырашыць яго можна вось так — без афіцыйнага афармлення, без адпаведных дакументаў, нават не пацікавіўшыся ў дабрадзейкі наяўнасцю ў яе якога-кольвек пасведчання? Сказаў бы, старыя адзінокія людзі, стомленыя ад адсутнасці чалавечай увагі, упускалі ў кватэру махлярку, што называлася работнікам сацыяльнай службы, — яшчэ б можна было зразумець. Але ж тыя тры дзясяткі чалавек рознага сацыяльнага статусу і ўзросту наўрад ці адзінокія пенсіянеры. Ды яшчэ і пры грашах (сто семдзесят мільёнаў ці нават сорак у свабодным карыстанні не ў кожнага знойдзецца).

Што ж атрымліваецца? Абсурд, калі не сказаць больш. Разумныя забяспечаныя грамадзяне свядома і самастойна аддавалі немалыя грошы на вырашэнне пытання «акружным шляхам». Мяркуючы па тым, што махлярка дзейнічала цэлых пяць гадоў у адным горадзе, гэтыя людзі, нават зразумеўшы, што іх абдурылі, пра сваю бяду расказваць камусьці не спяшаліся. Што яшчэ раз пацвярджае свядомасць і самастойнасць іх учынкаў, як і тое, што яны ведалі пра незаконнасць і сваіх, і махляркі дзеянняў...

МЯНЕ ведаеце, што ў гэтай сітуацыі бянтэжыць? Чаму гэтыя свядомыя разумныя людзі праходзяць па справе як пацярпелыя? Гэта значыць, ім яшчэ і ўрон будуць кампенсаваць? Але чым яны лепшыя за хабарадаўцаў, якія абсалютна аналагічным чынам спрабуюць вырашыць свае пытанні, толькі без пасярэднікаў у выглядзе «добрай цёткі з фонду сацабароны»? Але хабарадаўцаў, калі паладуцца, чакае пакаранне, прадугледжанае законам, а гэтых «ахвяр падману» — што? Урок, што не трэба аддаваць грошы невядома каму? Магчыма. Але галоўны урок — што не трэба лезці праз галовы іншых без чаргі, што не трэба спрабаваць танна выкруціцца за кошт дзяржавы і сумленных людзей, — тут наўрад ці застанецца засвоеным. І калі заўтра гэтым жа пацярпелым нячыста на руку сапраўдны чыноўнік прапануе вырашыць пытанне тым жа спосабам, яны, ужо навучаныя, перакананцаюца, што чыноўнік сапраўдны, і панясуць грошы. Бо за спосаб вырашэння праблемы яны ні ад кога па руках не атрымалі.

У наяўнасці, як той казаў, і попыт, і прапанова. Што тут першаснае і што ад чаго нараджаецца, варта задумацца тым, чый абавязак змагацца не з махлярамі, а з карупцыяй.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
**ЗАРЕГИСТРИРОВАНО**
22 апреля 2015
Сушко С.А.

**УТВЕРЖДЕНО**
протокол внеочередного
Общего собрания участников
Совместного общества
с ограниченной ответственностью
«ВильнюсСтрой» от 16.04.2015

УНП 191434087

**ИЗМЕНЕНИЕ В ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ**
**шестого выпуска**
**Совместное общество с ограниченной ответственностью «ВильнюсСтрой»**

Внести изменение в Проспект эмиссии жилищных облигаций шестого выпуска, изложив пункт 1.13 в новой редакции:

**«1.13. Сведения о депозитарии, обслуживающем Эмитента.**

Наименование депозитария: Закрытое акционерное общество «Агрокапитал» (далее – депозитарий), код депозитария – D01.

Место нахождения депозитария: 220030, г. Минск, ул. Революционная, 6В. Депозитарий зарегистрирован Минским городским исполнительным комитетом 18.08.2000 регистрационный номер – 101000004.

Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-124-1097 Министерства финансов Республики Беларусь от 29 июля 2007 года (срок действия лицензии – до 29 июля 2022 года).».

**ОТ ЭМИТЕНТА:**
Директор СООО «ВильнюсСтрой» Н.М.Яколцевич
Главный бухгалтер СООО «ВильнюсСтрой» Т.С.Журавская

**ОТ ПРОФУЧАСТНИКА:**
Директор ЗАО «Генеральная система инвестиций» Н.Л.Черник

Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
**ЗАРЕГИСТРИРОВАНО**
22 апреля 2015
Сушко С.А.

**УТВЕРЖДЕНО**
протокол внеочередного
Общего собрания участников
Совместного общества
с ограниченной ответственностью
«ВильнюсСтрой» от 16.04.2015

УНП 191434087

**ИЗМЕНЕНИЕ В ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ**
**седьмого выпуска**
**Совместное общество с ограниченной ответственностью «ВильнюсСтрой»**

Внести изменение в Проспект эмиссии жилищных облигаций седьмого выпуска, изложив пункт 1.13 в новой редакции:

**«1.13. Сведения о депозитарии, обслуживающем Эмитента.**

Наименование депозитария: Закрытое акционерное общество «Агрокапитал» (далее – депозитарий), код депозитария – D01.

Место нахождения депозитария: 220030, г. Минск, ул. Революционная, 6В. Депозитарий зарегистрирован Минским городским исполнительным комитетом 18.08.2000 регистрационный номер – 101000004.

Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-124-1097 Министерства финансов Республики Беларусь от 29 июля 2007 года (срок действия лицензии – до 29 июля 2022 года).».

**ОТ ЭМИТЕНТА:**
Директор СООО «ВильнюсСтрой» Н.М.Яколцевич
Главный бухгалтер СООО «ВильнюсСтрой» Т.С.Журавская

**ОТ ПРОФУЧАСТНИКА:**
Директор ЗАО «Генеральная система инвестиций» Н.Л.Черник

Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
**ЗАРЕГИСТРИРОВАНО**
22 апреля 2015
Сушко С.А.

**УТВЕРЖДЕНО**
протокол внеочередного
Общего собрания участников
Совместного общества
с ограниченной ответственностью
«ВильнюсСтрой» от 16.04.2015

УНП 191434087

**ИЗМЕНЕНИЕ В ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ**
**восьмого выпуска**
**Совместное общество с ограниченной ответственностью «ВильнюсСтрой»**

Внести изменение в Проспект эмиссии жилищных облигаций восьмого выпуска, изложив пункт 1.13 в новой редакции:

**«1.13. Сведения о депозитарии, обслуживающем Эмитента.**

Наименование депозитария: Закрытое акционерное общество «Агрокапитал» (далее – депозитарий), код депозитария – D01.

Место нахождения депозитария: 220030, г. Минск, ул. Революционная, 6В. Депозитарий зарегистрирован Минским городским исполнительным комитетом 18.08.2000 регистрационный номер – 101000004.

Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-124-1097 Министерства финансов Республики Беларусь от 29 июля 2007 года (срок действия лицензии – до 29 июля 2022 года).».

**ОТ ЭМИТЕНТА:**
Директор СООО «ВильнюсСтрой» Н.М.Яколцевич
Главный бухгалтер СООО «ВильнюсСтрой» Т.С.Журавская

**ОТ ПРОФУЧАСТНИКА:**
Директор ЗАО «Генеральная система инвестиций» Н.Л.Черник

■ Будзь у курсе!

# Апошняя рэпетыцыя ЦТ

**Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў вырашыў падоўжыць яшчэ на месяц трэці этап рэпетыцыйнага тэсціравання. Але ў маі прайсці яго можна будзе толькі непасрэдна на базе самога інстытута ў Мінску.**

— Мы праводзім рэпетыцыйнае тэсціраванне кожны дзень. І калі пашанцуе, то абітурыент можа зарэгістравацца на яго «дзень у дзень» або «сёння на заўтра», — расказаў журналісту «Звязды» **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ.** — Анлайн-рэгістрацыя ажыццяўляецца на нашым сайце www.rikc.by. Пры рэгістрацыі абітурыенту неабходна будзе пацвердзіць аплату аперацыі. Дзякуючы гэтаму верагоднасць таго, што чалавек сапраўды прыйдзе на іспыты, павялічваецца.

Заключны, трэці этап рэпетыцыйнага тэсціравання, як правіла, прыцягвае найбольшую ўвагу абітурыентаў, паколькі праходзіць ужо заўсёды з улікам новай спецыфікацыі тэстаў. Да таго ж у красавіку ўжо засвоена ўся школьная праграма і гэта самы зручны час, каб здзейсніць «разведку боем». У гэтым навучальным годзе падчас усіх трох этапаў «рэпетыцыі» экзаменацыйных выпрабаванняў было здадзена ўжо каля 200 тысяч чалавека-тэстаў, з іх 80 тысяч тэстаў было напісана менавіта падчас трэцяга этапу — у сакавіку—красавіку.

Мікалай Фяськоў патлумачыў, што абітурыенты могуць прайсці як традыцыйнае рэпетыцыйнае тэсціраванне на бланку, так і камп'ютарнае тэсціраванне. Апошнім часам штодня ў інстытут прыходзяць каля 50 чалавек: прыкладна палова з іх ідзе на звычайнае тэсціраванне, а другая на камп'ютарнае. Каштуе камп'ютарны тэст столькі ж, колькі і рэпетыцыйнае тэсціраванне на бланках, — 50 100 рублёў.

Існуюць тры рэжымы камп'ютарнага тэсціравання. У трэніровачным рэжыме ўдзельнік не абмежаваны ў часе праходжання тэста, а таксама ў любы момант ён можа скарыстацца падказкай камп'ютара. У кантрольным рэжыме на рашэнне тэста адводзіцца такі ж час, як і на ЦТ, і выконваецца ён без падказак. Самы ж набліжаны да ўмоў ЦТ — кантрольны рэжым на бланку: тут таксама абмежаваны час, адсутнічаюць падказкі, але правільныя адказы трэба ўносіць у электронную версію бланка, які цалкам адпавядае арыгіналу бланка ЦТ.

Перавага камп'ютарнага тэсціравання ў тым, што абітурыент адразу даведваецца пра свой вынік, а таксама ў яго ёсць магчымасць зрабіць работу над памылкамі, убачыць сваё рашэнне задачы і правільныя адказы. Тэсты, якія выконваюцца на камп'ютары, адрозніваюцца па змесце заданняў ад тых, што рыхтаваліся для пунктаў тэсціравання. Таму абітурыенты, якія ўжо прайшлі папяровае рэпетыцыйнае тэсціраванне, могуць яшчэ раз праверыць свае веды ўжо на камп'ютары.

— Трэба мець на ўвазе, што пры падліку балаў на рэпетыцыйным і камп'ютарным тэсціраваннях выкарыстоўваецца тая ж методыка, што і на ЦТ. А гэта значыць, што якую б форму тэсціравання для праверкі сваіх ведаў абітурыент ні абраў, на яго тэставы бал гэта ніяк не паўплывае, — тлумачыць Мікалай Фяськоў.

У працоўныя дні тыдня рэпетыцыйнае тэсціраванне распачынаецца ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў у 14 гадзін, а па суботах — у 11 гадзін.

Сёння літаральна на кожным кроку можна сустрэць прапановы падрыхтаваць абітурыентаў да цэнтралізаванага тэсціравання, так бы мовіць, у экстранным парадку. Мы вырашылі пацікавіцца меркаваннем Мікалая Фяськова наконт эфектыўнасці такой падрыхтоўкі.

— Многія абітурыенты памыляюцца, калі думаюць, што можна якасна падрыхтавацца да цэнтралізаванага тэсціравання за паўгода ці ўвогуле за некалькі месяцаў, толькі бясконца рашаючы тэсты. На жаль, такога меркавання прытрымліваюцца і некаторыя настаўнікі, якія вучаць дзяцей па тэстах. Але ж гэта няправільна! Мы не стамляемся паўтараць, што нашы заданні адпавядаюць школьнай праграме, але тэсты не перадаюць усёй паслядоўнасці таго ці іншага курса, а таму рыхтавацца да цэнтралізаванага тэсціравання трэба не па тэстах, а па падручніку. Тэст — гэта, найперш, сродак дыягностыкі, — падкрэсліў Мікалай Фяськоў. — Вядома, абітурыенты павінны мець навык работы з тэстамі, але я маю на ўвазе тэхналогію запаўнення бланкаў, псіхалагічную падрыхтоўку, уменне разлічыць час на выкананне тэставых заданняў. З гэтай мэтай мы і праводзім рэпетыцыйнае тэсціраванне. Дарэчы, часцяком менавіта няведанне абітурыентам тэхнічных нюансаў становіцца прычынай зніжэння яму агульнай адзнакі. Авалодваць гэтай «навукай» падчас сапраўднага экзамену, калі трэба супакоіцца, сабрацца з думкамі і паказаць неабходныя веды, азначае губляць каштоўны час.

Што тычыцца прапаноў рэпетытараў, то яны могуць дапамагчы прывесці ў сістэму веды, атрыманыя выпускніком у школе. Але ўжо пазнавата раздаваць абітурыентам нейкія абяцанні. Каб атрымаць высокі вынік на ЦТ, патэнцыяльным студэнтам трэба было шмат працаваць, прычым не толькі ў выпускным класе.

**Перавага камп'ютарнага тэсціравання ў тым, што абітурыент адразу даведваецца пра свой вынік, а таксама ў яго ёсць магчымасць зрабіць работу над памылкамі.**

Між іншым, у Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў вынікі тых, хто ўдзельнічае ў некалькіх этапах рэпетыцыйнага тэсціравання, уважліва адсочваюць і адзначаюць станоўчую дынаміку ў тых, хто звяртаўся да дыягностыкі сваіх ведаў не адзін раз. Зразумела, што толькі ўдзел у рэпетыцыі не дазваляе спадзявацца на стапрацэнтны поспех на цэнтралізаваным тэсціраванні. Але абсалютна відавочна, што і псіхалагічная, і тэхнічная падрыхтоўка будзе для абітурыентаў зусім не залішняй.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ За крок да прафесіі

# Медыцынскіх сёстраў падрыхтуюць менш чым за два гады

**Умовы прыёму ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы ў бягучым годзе не зменяцца. Пра гэта падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА паведаміў міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ.**

Пры паступленні на аснове агульнай сярэдняй адукацыі абітурыенты павінны прадставіць у прыёмную камісію сертыфікаты ЦТ з любой сумай балаў, акрамя нуля. А выпускнікі базавай школы будуць паступаць у сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы ўвогуле без экзаменаў (за выключэннем спецыяльнасцей, дзе прадугледжаны "творчы экзамен»): конкурс сярод прэтэндэнтаў будзе ажыццяўляцца на сярэднім бале пасведчання аб агульнай базавай адукацыі.

Праўда, ёсць адна ўмова: абітурыенты, якія паступаюць на аснове базавай адукацыі на спецыяльнасці, дзе конкурс летась складаў 5 і больш чалавек на месца, павінны мець у пасведчанні аб агульнай базавай адукацыі адзнакі, не ніжэйшыя за 4 балы, па рускай мове і беларускай мове, а таксама па прадмеце, што адпавядае профільнаму іспыту.

Прыём на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі будуць ажыццяўляць 216 устаноў адукацыі. Усяго плануецца прыняць 40,5 тысячы чалавек, што на 1% менш, чым было прынята на навучанне ў 2014 годзе. Гэта звязана з дэмаграфічнай сітуацыяй і змяншэннем колькасці выпускнікоў.

Структура прыёму захаваецца на ўзроўні мінулых гадоў: профілі адукацыі «Тэхніка і тэхналогія», «Архітэктура і будаўніцтва», «Сельская і лясная гаспадарка», «Ахова здароўя» складаюць у агульным прыёме да 70%.

У Мінскім дзяржаўным вышэйшым радыётэхнічным каледжы ў гэтым годзе ўпершыню будзе ажыццёўлены набор на новую спецыяльнасць «Праграмуемыя мабільныя сістэмы». Па заканчэнні навучання выпускнікам будзе прысвойвацца кваліфікацыя «Тэхнік-электронік».

Увогуле, за два апошнія гады пералік спецыяльнасцей і напрамкаў падрыхтоўкі ССНУ істотна пашырыўся. Напрыклад, у Мінскім архітэктурна-будаўнічым каледжы летась адкрылася спецыяльнасць «Абслугоўванне і эксплуатацыя жылых дамоў». У Мінскім дзяржаўным вышэйшым радыётэхнічным каледжы — спецыяльнасць «Мікра- і нанаэлектронныя тэхналогіі і сістэмы». У Мінскім політэхнічным каледжы — «Электроніка механічных транспартных сродкаў». У Магілёўскім тэхналагічным каледжы пачалі рыхтаваць мехатронікаў 5-га разраду, якія спецыялізуюцца на вытворчасці халадзільнага абсталявання.

Яшчэ адна важная для абітурыентаў інфармацыя тычыцца прыёму на спецыяльнасць «Сястрынская справа» ў медыцынскіх каледжах: рашэннем Міністэрства аховы здароўя тэрмін падрыхтоўкі медыцынскіх сёстраў на аснове агульнай сярэдняй адукацыі быў скарочаны на цэлы год і складае цяпер 1 год 10 месяцаў.

Дарэчы, летась медыцынскія спецыяльнасці карысталіся ў абітурыентаў папулярнасцю, а конкурс, напрыклад, на «Зубалячэбную справу» нават перавысіў 7 чалавек.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

***Найбольш запатрабаваныя спецыяльнасці на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў 2014 годзе:***
«Правазнаўства» (12,7 чалавека на месца),
«Лінгвістычнае забеспячэнне сацыякультурнай дзейнасці» (10,5),
«Банкаўская справа» (7,8),
«Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» (7,4),
«Зубалячэбная справа» (7,3),
«Архітэктура» (6,3),
«Цырульніцкае мастацтва і дэкаратыўная касметыка» (5,9),
«Дызайн» (5,7),
«Фінансы» (5,5),
«Арганізацыя перавозак і кіраванне на чыгуначным транспарце» (5,4),
«Фармацыя» (5,3),
«Тэхнічная эксплуатацыя аўтамабіляў (па напрамках)» (4,9),
«Пад'ёмна-транспартныя, будаўнічыя, дарожныя машыны і абсталяванне» (4,8),
«Аўтасэрвіс» (4,3),
«Вылічальныя машыны, сістэмы і сеткі» (4,2),
«Сястрынская справа» (4,0),
«Тэсціраванне праграмнага забеспячэння» (3,4).

■ Класныя навіны

# На экзамен — без букета?

**Практыку арганізацыі выпускных экзаменаў у школе, калі бацькі рыхтуюць кветкі для экзаменатараў, накрываюць ім сталы (клапоцяцца пра цукеркі, бутэрброды, ваду), трэба выкараняць, як лічыць начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Святлана УКЛЕЙКА.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Гэта менавіта той выпадак, калі традыцыя не зразумела чаму ўзнікла і як стваралася. Такога ў прынцыпе нельга рабіць. У нашай краіне ўжо досыць шмат устаноў, якія ў сябе гэтую сітуацыю прынцыпова агаворваюць, — падкрэсліла Святлана Уклейка. — Прыём экзаменаў для настаўніка — гэта праца, што прапісана службовымі абавязкамі і правіламі ўнутранага працоўнага распарадку. Усё адбываецца ў рамках працоўнага часу».

Начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі паведаміла, што ў гэтым навучальным годзе на базе асобных устаноў адукацыі праходзіў эксперымент па ўкараненні незалежнай атэстацыі за базавую школу.

Як вядома, абавязковая адукацыя ў Беларусі — дзевяцігадовая базавая. Але, напрыклад, у Мінску 67—68% выпускнікоў базавай школы пераходзяць на старшую яе ступень незалежна ад сваіх здольнасцяў, памкненняў і жадання вучыцца. Менавіта таму падчас абмеркавання будучых паправак у Кодэкс аб адукацыі гучалі прапановы ўстанавіць на ўваходзе ў старшую школу пэўны бар'ер.

Варыянты прапаноўваліся розныя. Напрыклад вырашыць праблему адбору найлепшых зацвярджэннем кантрольных лічбаў прыёму ў 10-ты клас. Ці ўвесці нейкі «прахадны» бал (сярэдні бал атэстата), каб тыя, у каго вынікі вучэбнай дзейнасці за дзявяты клас будуць ніжэйшыя, задумаліся над выбарам прафесіі. Але ж самі педагогі канстатуюць, што «вага» адных і тых жа адзнак, якія выстаўляюцца ў розных школах, можа быць рознай. Яны, на жаль, часта бываюць суб'ектыўныя. І гэта не зусім правільна, што дзяцей атэстоўваюць тыя ж людзі, якія іх і навучаюць.

Між іншым, у многіх краінах свету праводзіцца знешні дзяржаўны экзамен, што з'яўляецца адным з крытэрыяў для паступлення на больш высокі ўзровень адукацыі. Магчыма, і нам трэба вырашаць далейшы лёс выпускнікоў базавай школы на падставе дзяржаўнай знешняй атэстацыі, вынікі якой не будуць залежаць ні ад настаўніка, ні ад школы, ні ад інтарэсаў таго ці іншага рэгіёна.

**Прыём экзаменаў для настаўніка — гэта праца, што прапісана службовымі абавязкамі і правіламі.**

Да таго ж з мінулага года пры паступленні ў ССНУ на аснове базавай адукацыі адменены ўступныя іспыты і абітурыентаў цяпер прымаюць па сярэднім бале дакумента аб агульнай базавай адукацыі. Такім чынам, ёсць рэальная пагроза, што ўстановы адукацыі можа захліснуць «працэнтаманія» добрых адзнак.

Міністэрствам адукацыі быў зацверджаны пералік інавацыйных пляцовак для апрабацыі незалежнай знешняй атэстацыі.

— У кожным рэгіёне былі ўзяты па дзве ўстановы. Эксперымент мы свядома праводзілі менавіта падчас навучальнага года, каб мінімізаваць дыскамфорт пры здачы экзаменаў, — патлумачыла Святлана Уклейка. — Апрабавалі арганізацыю незалежнай атэстацыі і на ўзроўні раёна, і на ўзроўні горада. Ва ўсіх установах прысутнічалі спецыялісты Нацыянальнага інстытута адукацыі. Плюс апрабавалі сам змест экзаменаў. Адпрацоўваліся розныя варыянты. Эксперымент праходзіў у два этапы: у першым паўгоддзі па двух прадметах і яшчэ па двух прадметах — у другім паўгоддзі. Цяпер старанна аналізуем вынікі і ўсе тыя пытанні, заўвагі, пажаданні, прапановы, якія паступілі з месцаў — ад настаўнікаў, старшыняў камісій, начальнікаў аддзелаў адукацыі, дырэктараў школ. Казаць, што з наступнага года мы ўвядзём незалежную атэстацыю паўсюдна, не будзем, таму што гэта вельмі сур'ёзны крок і пытанне яшчэ трэба прапрацаваць.

Між іншым, пасля пераносу вуснага экзамену па гісторыі Беларусі з базавай у сярэднюю школу задача незалежных экспертаў, безумоўна, спрасцілася...

Дарэчы, выпускнікам базавай школы не пашкодзіць ведаць, што з гэтага года **залічэнне ў профільныя 10-я класы будзе ажыццяўляцца на аснове конкурснага адбору.** Ён будзе праводзіцца па сярэднім бале дакумента аб базавай адукацыі. У ахвотных вучыцца ў профільных класах сярэдні бал пасведчання павінен быць не ніжэйшы за 6 балаў, а па профільных прадметах адзнакі не могуць быць ніжэйшыя за 7 балаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Ёсць праблема

# Могільнік для Мурзіка

## Чаму гаспадары свойскіх жывёл вымушаны хаваць гадаванцаў у гарадскіх лясах і парках?

**Неяк у вёсцы глядзелі ўвечары тэлевізар. Па адным з каналаў, як заўсёды, ішла чарговая скандальна-крымінальная перадача кшталту «Вы не паверыце!». Расказвалі пра жанчыну, што пахавала свайго любімага ката на чалавечых могілках. Гараджане абурaліся: як так, жывёлам сярод людзей не месца (хаця, здаецца мне, справа не толькі ў гэтым: стала сорамна, што дагледжаная магілка з гранітным помнікам чатырохногага выглядала нашмат лепш, чым недагледжаныя магілы іх сваякоў). Магчыма, у нечым яны мелі рацыю. Аднак куды падзець памерлых гадаванцаў, калі афіцыйнага месца для іх пахавання няма? У вёсцы прасцей, можна выкапаць яміну на ўскраіне ўчастка. А што рабіць жыхарам буйнога горада? Не на сметніцу ж выкідаць таго ката ці сабаку, якi за пражытыя пад адным дахам 10, а то і 15 гадоў стаў блізкім сябрам.**



### НЕБЯСПЕКА ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ

У Мінску ўзаконеных могілак для хатніх гадаванцаў няма, затое стыхійныя — бадай, у кожным раёне. Ва Уручы, напрыклад, самаробны могільнік знаходзіцца ў невялікім ляску цераз дарогу ад рынку. Месцы пахавання Рыжыкаў і Бобікаў акуратна абкладзены каменьчыкамі, упрыгожаны кветкамі і лампадамі. На некаторых могілках стаяць крыжы з фотаздымкамі і драўляныя шыльды. Нават дарагія гранітныя помнікі сустракаюцца. Асабліва клапатлівыя гаспадары прынеслі гумовыя цацкі і міскі для ежы — каб гадаванцам і на тым свеце добра жылося. Сярод «нябожчыкаў» не толькі каты і сабакі, але і папугаі, марскія свінкі. Гарадскіх сабачнікаў, якія непадалёк выгульваюць сваіх любімцаў, такое суседства не бянтэжыць. Гаспадыня лабрадора, пакуль яе гадаванец бегаў сярод дрэў, расказала, што гаспадары памерлых жывёл часам наведваюць гэтыя могілкі, каб навесці парадак ці падправіць агароджу.

— Ці нармальна гэта? А чаму не? — маркуе яна. — Ніхто ж не кідаецца ў крайнасці кшталту памінальных службаў з адпяваннем. А помнік... Гэта шчыры знак падзякі любімай жывёлiне.

Праўда, такая неафіцыйная «форма ўдзячнасці» не ўхваляецца не толькі законам (згодна з артыкулам 15.47 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, за ігнараванне правілаў утрымання сабак ці катоў могуць выпісаць штраф да 15 базавых велічынь), але і экалагічнай службай.

— Невядома, якія жывёлы там пахаваныя. Думаю, і хворыя ёсць. Паколькі гэтыя могілкі неглыбокія і неацынкаваныя, вірус ці трупны яд з вадой або дажджом можа трапіць у грунтовыя воды, — тлумачыць небяспеку падобных пахаванняў **намеснік старшыні Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Таццяна АЎРАМЧЫК.**

**Узбуджальнікі інфекцый, праз якія загінуў гадаванец, часам захоўваюцца ў глебе на працягу стагоддзяў.**

Узбуджальнікі інфекцый, праз якія загінуў гадаванец, часам захоўваюцца ў глебе на працягу стагоддзяў. І не факт, што стыхійныя могілкі не раскапаюць, напрыклад, грызуны і не распаўсюдзяць хваробу. У такім выпадку, дарэчы, калі самавольства гаспадара нанесла шкоду здароўю людзей, паводле таго ж артыкула Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, гараджаніна чакае больш жорсткае пакаранне — штраф у памеры ад 10 да 30 базавых велічынь ці адміністрацыйны арышт.

Упраўленне гарадской гаспадаркі і энергетыкі Мінгарвыканкама ствараць афіцыйныя могілкі для катоў і сабак у бліжэйшы час не збіраецца. Зямля ў сталіцы занадта дарагая.

### НЕПРЫВАБНАЯ АЛЬТЭРНАТЫВА

Паступіць з памерлымі ўлюбёнцамі па законе, вядома, можна. У сталіцы іх пахаваннем займаецца «Фаўна горада». Паслуга каштуе каля 15 тысяч рублёў (за адну жывёлу, без уліку матэрыялаў). Калі хочаце, каб супрацоўнікі арганізацыі самі прыехалі да вас па цельца ката, трэба будзе даплаціць — прыкладна 9 тысяч за кіламетр прабегу аўто. Нядорага. У «Фаўне горада» кажуць, што гаспадары памерлых гадаванцаў тэлефануюць штодзень. За месяц праз прадпрыемства хаваюць дзесьці сотню жывёл. Звозяць іх у вёску Дзегцяроўка, што непадалёк ад сталіцы. Аднак, калі шчыра, не думаю, што кожны сабачнік пагодзіцца на гэтую афіцыйную альтэрнатыву самаробнай магілцы. На ўзгаданым жывёльным могільніку пабудаваны бетонныя калодзежы, куды скідаюць чатырохногія трупікі і заліваюць іх хімічным рэчывам, каб хутчэй гнілі. Пра экалагічнасць такога спосабу ўтылізацыі (а інакш гэта нія к і не назавеш) ніхто не спрачаецца. А вось наконт астатняга... Залішне практычнае рашэнне ў дачыненні істоты, якая была табе сябрам шмат гадоў.

Абяцалі, праўда, неяк, што ў горадзе з'явіцца дзяржаўны крэматорый для жывёл, а на біятэрмічныя ямы нарэшце забудуцца. У «Фаўны горада» нават дагавор заключаны з «Экарэс» — камунальным унітарным прадпрыемствам па абыходжанні з адходамі, дзе ёсць печы для спальвання. Планавалася, што арганізацыя і прах Барсіка выдаваць на рукі будзе, і калумбарый пабудуе, дзе ў спецыяльнай ячэйцы дазволяць захоўваць гэты прах разам з фотаздымкам гадаванца. Да рэалізацыі справа пакуль не дайшла. Па словах **намесніка дырэктара па будаўніцтве і развіцці «Экарэс» Віталя ПАСЮЦІНА,** займацца жывёламі няма калі: разабрацца б спачатку з медыцынскімі адходамі па Мінску. Не дзіўна, што нішу рытуальных паслуг для сабак, катоў і хамякоў занялі прыватнікі. Так, фаніпальскі прадпрымальнік раз'язджае па заяўках на мабільным крэматорыі.

### УТЫЛІЗАВАЦЬ НЕ ДАЗВАЛЯЕ СУМЛЕННЕ

Рэакцыя кшталту «Няўжо ў грамадстве больш праблем няма?» ужо не здзіўляе. Чакаць іншага ад людзей, здольных выкінуць на сметніцу і жывых жывёл (і я не перабольшваю: у нашай вёсцы ў адным з кантэйнераў нядаўна знайшлі маленькіх шчанюкоў, ад якіх такім чынам вырашыў пазбавіцца «прадпрымальны» праезджы), не даводзіцца. Што зробіш, калі для некаторых сцвярджэнне, што сабака — самы лепшы сябар, значыць не больш за завучаны ў дзяцінстве выраз «Мама мыла раму»? Да большасці, на шчасце, яны не адносяцца.

Тое, што гадаванцы становяцца часткай сям'і (хоць і тут бываюць перакосы), лагічны вынік не столькі заходняга ўплыву, колькі адзіноты. У маім двары жыве пенсіянерка, якая заўсёды выходзіць пасядзець на лаўцы ў суправаджэнні свайго нязменнага сябра — маленькага белага сабачкі з чорнай плямай вакол вока. Такая бабуля ёсць, бадай, ці не ў кожным доме.

Свойскіх жывёл у сталіцы штогод больш. І натуральна, што патрэба ў прымальным і для экалогіі, і для гаспадароў варыянце пахавання гадаванцаў будзе толькі расці. Гэта ўжо частка сучаснай культуры, калі проста «ўтылізаваць» жывёлку сумленне не дазваляе. Толькі і гаспадарам трэба ведаць мяжу, каб не ператвараць культуру ў культ — з вычварнымі помнікамі за некалькі мільёнаў, ахвяраваннямі і абавязковым наведваннем магілы ў памінальныя дні. Такая паказушнасць не знойдзе паразумення: ёсць больш цяжкія страты. Для чалавека, які пахаваў сваякоў ці блізкіх сяброў і зведаў сапраўднае гора, гэты «рэквіем па кацяняці» будзе знакам непавагі. Могілкі для жывёл, калі для іх усё ж знойдзецца месца, павінны, вядома, выглядаць цывілізавана, але не быць падобнымі да апошняга прыстанішча людзей.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ** ■


# РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) по поручению ОАО «Сукно» (Продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже**

**КАНАЛИЗАЦИОННОЙ НАСОСНОЙ СТАНЦИИ**

**с инв. №500/С-60383, расположенной по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 33/5, и оборудования.**

Земельный участок площадью 8,6900 га (кадастровый №500000000006002163) предоставлен на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания административных и производственных зданий. Описание права, ограничения (обременения) прав в использовании земель: охранная зона ливневой канализации, площадь 0,1159 га, 0,8302 га; охранная зона линий связи и радиофикации, площадь 0,5506 га; охранная зона газопровода, площадь 0,2374 га; обеспечение доступа эксплуатационным организациям – владельцам инженерных коммуникаций для производства ремонтно-восстановительных работ, площадь 8,6900 га. На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставляются на аукцион.

**Начальная цена с НДС – 296 558 400 бел. руб.**
**Задаток с НДС – 59 311 680 бел. руб. Шаг аукциона – 5%.**

*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «Сукно»,* **проводимом 6 мая 2015 г.**

Договор купли-продажи должен быть заключен в течение 5 (пяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 10 (десяти) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 5% (пяти процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен обеспечить в течение 3 (трех) месяцев после заключения договора купли-продажи проведение проектно-изыскательных работ, подготовку проектной документации, а также проведение строительно-монтажных работ по изменению существующей системы канализации ОАО «Сукно» без использования Объекта (здания канализационной станции). Все проектные и строительно-монтажные работы Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан проводить по согласованию с ОАО «Сукно». На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Аукцион состоится **06.05.2015 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 05.05.2015 до 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 2.

*Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 27.09.2014.*

С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

☎ **Дополнительная информация: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**


■ Надвор'е

# ВЫХАДНЫЯ ПАД ЗНАКАМ ЦЯПЛА І НАВАЛЬНІЦ

**У выхадныя на тэрыторыю краіны пачне паступаць цёплае паветра з боку паўднёвага захаду Еўропы і прыйдзе амаль лета, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

У суботу ўдзень у асобных раёнах — кароткачасовыя дажджы. Тэмпература ўначы 2-7, удзень — плюс 18-24 градусы, аднак на поўначы яшчэ толькі 15-17. Уначы на нядзелю да плюс 7-12 градусаў, а ўдзень да 18-25 цяпла, на поўначы — 15-17 градусаў.

У панядзелак кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Уначы на панядзелак 8-13 цяпла, а ўдзень — ад плюс 18 градусаў па поўначы да 25 цяпла па поўдні краіны. У аўторак чарговы атмасферны фронт з Заходняй Еўропы прынясе дажджы і навальніцы. Пры навальніцах будзе вецер парывамі да 15-20 м/с, месцамі магчымы град. Уначы 8-14 цяпла, удзень — плюс 18-25 градусаў, аднак на захадзе ўжо толькі 15-18 цяпла.

У сераду зноў пахаладае і паўсюдна пройдуць дажджы. Уначы чакаецца ад 4 цяпла па захадзе, да плюс 13 па ўсходзе краіны. Удзень ужо толькі плюс 8-14 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ** ■


**ОАО «Нафтан»**
**РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ (с повышением начальной цены) за пределы Республики Беларусь бывшее в употреблении неиспользуемое имущество:**

| Инв. № | Наименование |
|---|---|
| 06253217 | Параллелофрез CUCCIOLLO CC3, 2005 год |
| 06253220 | Стерилизатор паровой ГК-10-1, 2006 год |
| 06253318 | Аппарат пескоструйный BASIC QUATTRO, 2008 год |
| 06253319 | Триммер для гипса MT PLUS, 2008 год |
| 06253329 | Устройство отсоса Silent, 2009 год |
| 06253330 | Смеситель вакуумный стоматологический MOTOVA 100, 2008 год |
| 06253331 | Аппарат пароструйный TRITON SLA, 2008 год |
| 06253332 | Аппарат пескоструйный DUOSTAR PLUS, 2008 год |
| 06253436 | Установка стоматологическая SIRONA C8, 2009 год |
| 06253437 | Установка стоматологическая SIRONA C8, 2009 год |
| 06253440 | Аппарат фрезерный/PARASKOP M, 2009 год |
| 06253441 | Прибор для сверления отверстий под штифты/TOP SPIN, 2009 год |
| 06253442 | Аппарат пескоструйный/BASIC QUATTRO, 2009 год |
| 06253443 | Аппарат пескоструйный/VARIO BASIC, 2009 год |
| 06253444 | Агрегат фрезеровальный/PARAMIL 3, 2009 год |
| 06253445 | Тример для обрезки моделей, 2009 год |
| 06253449 | Печь для литья сплавов/NAUTILUS CC plus, 2009 год |
| 06253450 | Печь для литья сплавов/FORNAX T, 2009 год |
| 06253451 | Мотор лабораторный стоматологический/Л5 plus EWL 4911, 2009 год |
| 06253452 | Компрессор для установок стоматологических двухагрегатный QUATTRO, 2009 год |
| 06253453 | Компрессор для установок стоматологических двухагрегатный QUATTRO, 2009 год |
| 06253454 | Камера интраорльная Vistacam CL, 2009 год |
| 06253455 | Камера интраорльная Vistacam CL, 2009 год |
| 06253456 | Камера интраорльная Vistacam CL, 2009 год |
| 06253457 | Лампа для фотополимеризации Bluephase, 2009 год |
| 06253458 | Лампа для фотополимеризации Bluephase, 2009 год |
| 06253466 | Смеситель вакуумный стоматологический/MOTOVA 100, 2009 год |
| 06253467 | Смеситель вакуумный стоматологический/MOTOVA 100, 2009 год |
| 06253471 | Рабочее место зубного техника со встр. с-мой пылеулавлив./ FLEXspace Comfort, 2009 год |
| 06253472 | Рабочее место зубного техника со встр.с-мой пылеулавлив./ FLEXspace Comfort, 2009 год |
| 06253473 | Рабочее место зубного техника со встр. с-мой пылеулавлив./ FLEXspace Comfort, 2009 год |
| 06253474 | Рабочее место зубного техника со встр. с-мой пылеулавлив./ FLEXspace Comfort, 2009 год |
| 06253475 | Рабочее место зубного техника со встр. с-мой пылеулавлив./ FLEXspace Comfort, 2009 год |
| 06253476 | Рабочее место зубного техника со встр. с-мой пылеулавлив./ FLEXspace Comfort, 2009 год |
| 06253477 | Рабочее место зубного техника со встр. с-мой пылеулавлив./ FLEXspace Comfort, 2009 год |
| 06253480 | Горелка паяльная/MULTIPLEX, 2009 год |
| 06253481 | Горелка паяльная/MULTIPLEX, 2009 год |
| 06253482 | Мотор стомат.зуботехнич.с коленным блоком управления/ K-POWERgrip EWL 4941, 2009 год |
| 06253483 | Мотор стомат. зуботехнич. с коленным блоком управления/ K-POWERgrip EWL 4941, 2009 год |
| 06253484 | Мотор стомат. зуботехнич. с коленным блоком управления/ K-POWERgrip EWL 4941, 2009 год |
| 06253485 | Мотор стомат. зуботехнич. с коленным блоком управления/ K-POWERgrip EWL 4941, 2009 год |
| 06253486 | Мотор стомат. зуботехнич. с коленным блоком управления/ K-POWERgrip EWL 4941, 2009 год |
| 06253487 | Мотор стомат. зуботехнич. с коленным блоком управления/ K-POWERgrip EWL 4941, 2009 год |
| 06253527 | Оборудование стоматологическое лабораторное/ PROGRAMAT P500, 2009 год |
| 06253528 | Оборудование стоматологическое лабораторное/ PROGRAMAT P500, 2009 год |
| 06253529 | Аппарат для электролитической полировки модели/ ELTROPOL SL, 2009 год |
| 06253530 | Аппарат для электролитической полировки модели/ ELTROPOL SL, 2009 год |
| 06253531 | Аппарат для электролитической полировки модели/ ELTROPOL SL, 2009 год |
| 06253532 | Устройство полировальное EWL 80 (WP-Ex 2000), 2009 год |
| 06253533 | Аппарат для лазерной сварки/LASERSTAR Tplus, 2009 год |
| 06253534 | Аппарат для дублирования/GELOVIT 200, 2009 год |
| 06253535 | Прибор для измерения глубины поднутрений/ PARAMETER, 2009 год |
| 06253539 | Система сжатого воздуха и вакуума, 2009 год |
| 06253546 | Устройство отсоса Silent, 2009 год |
| 06253547 | Устройство отсоса Silent, 2009 год |
| 06253548 | Устройство отсоса Silent ,2009 год |
| 06273482 | Аппарат для точечной сварки и пайки с компл./TRIPLA 6E, 2009 год |
| 06273501 | Пресс гидравлический, 2009 год |
| 06273502 | Пресс гидравлический, 2009 год |
| 06273503 | Вибростолик(смеситель) Vibraflex2, 2009 год |
| 06273504 | Вибростолик(смеситель) Vibraflex2, 2009 год |
| 06273505 | Вибростолик(смеситель) Vibraflex2, 2009 год |
| 06273529 | Кастрюля для полимеризации пластмассы/POLYCLAV/, 2009 год |
| 06273530 | Кастрюля для полимеризации пластмассы/POLYCLAV/, 2009 год |
| 06273531 | Камера для диагности кариеса Vistaproof, 2009 год |
| 06273546 | Аппарат пароструйный/TRITON SLA, 2009 год |
| 06276052 | Камера интраорльная Vistacam CL, 2009 год |
| 06280381 | Печь световая Lumamat 100, 2012 год |
| **Начальная цена за комплект (68 единиц) – 1 776 000 000 белорусских рублей с НДС** | |

**Состояние удовлетворительное.**
**Предложения принимаются по адресу:**
**211440, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30 по местному времени 28 мая 2015 года с пометкой на конверте «Реализация неликвидов. 28.05.2015»**
**Извещение на проведение конкурса размещено на сайте www.naftan.by.**
**Контактные телефоны: 8(0214) 59-87-83, 8(0214) 59-89-26, 8(0214) 59-88-42, 8(0214) 59-88-01, (033) 398 08 48, (033) 398 07 67.**

УНП 300042199

■ Паміж жыццём і смерцю

# «УВЕСЬ ЧАС — НОВЫЯ ЛЮДЗІ. НЕ ПАСПЯВАЛІ НАВАТ ПАСЯБРАВАЦЬ...»

## Ён выжыў у Сталінградзе, каб у 80 гадоў паехаць у Мюнхен на чэмпіянат свету

**Ён з самага дзяцінства марыў стаць спартсменам. І як толькі ў 1936 годзе ў Цэнтральным доме афіцэраў адкрыўся першы ў Беларусі басейн, пачаў займацца плаваннем. А ўжо ў 1939 годзе стаў рэкардсменам СССР у камбінаванай эстафеце па плаванні сярод юнакоў! Дасягнуць большых спартыўных вышынь перашкодзіла вайна...**



Фота Надзеі БУЖАН.

### Білеты ў Зялёны тэатр. На 22-га...

Аляксандр Корсак нарадзіўся ў 1922 годзе ў Мінску. Быў адзіным сынам у бацькоў. Да вайны скончыў 8 класаў беларускай сярэдняй узорнай чыгуначнай школы № 25 (цяпер гімназія № 25 г. Мінска). Паступіў у Беларускі тэхнікум фізічнай культуры, які пасля стаў Інстытутам фізічнай культуры. Асвойваў прафесію настаўніка.

Калі пачалася вайна, Аляксандр Корсак быў у піянерскім лагеры. У кожным атрадзе — важатыя. Ён — адзін на ўсіх фізрук. У Тальку, што пад Пухавічамі, прыехаў 21 чэрвеня. На наступны дзень пачалося страшнае...

— Мы не ўспрымалі вайну ўсур'ёз, — расказвае Аляксандр Якаўлевіч. — Думалі: да старой заходняй мяжы немцы дойдуць, а далей — жалезная заслона.

**«Шынель стаў каляным, як браня. Кулі ў яго трапілі і разарваліся, а асколкі ў нагах і руках засталіся. Потым урачы налічаць іх больш за сорак...»**

22 чэрвеня 1941 года ў парку культуры імя Горкага планавалася масавае мерапрыемства. У Зялёным тэатры павінен быў адбыцца канцэрт з удзелам саліста Мінскага опернага тэатра і выканаўцаў рускіх песень.

— У мяне нават білеты ў Зялёны тэатр былі, — працягвае ветэран. — Думаў: з'езджу ў Мінск і вярнуся. Не атрымалася... А бацькі яшчэ 22 і 23 чэрвеня прывозілі дзяцей у лагер — не верылі, што будзе такая мітусня.

Мітусня пачалася хутка. 25 чэрвеня нямецкія войскі падышлі да беларускай сталіцы. Чыгуначны састаў, які выслалі ў Тальку для эвакуацыі дзяцей, да лагера не даехаў — разбамбілі. Усе цягнікі ішлі на ўсход. Праскочыць адзін-другі — не спыніцца.

Трэба было нешта рабіць. І ён, фізрук, і такія ж маладзенькія важатыя прымаюць рашэнне выстраіць дзяцей уздоўж чыгуначнага палатна і чакаць чарговага саставу. Так і зрабілі. Набліжаўся манеўровы паравоз, які развозіў вагоны. Да яго былі прычэплены платформы. Пустыя. На іх — літаральна на хаду! — і падсаджвалі дзяцей. Спыніць састаў машыніст не мог: без другога паравоза ён бы не зварухнуўся з месца. Так, размясціўшы туды ўсіх дзяцей, заскочылі на платформу і настаўнікі.

### Прыйшоў у ваенкамат. У тапачках

— Куды нас вязуць, не ведалі, — узгадвае Аляксандр Корсак. — Першы раз спыніліся ў Магілёве, калі пераязджалі Дняпро. Мост бамбілі, але мы праскочылі. У Магілёве нам на 300 чалавек выдзелілі 5 маленькіх вагонаў — і цягнік рушыў у Кузнецк Пензенскай вобласці. Там размеркавалі дзяцей па дзіцячых дамах. Самі думалі вярнуцца ў Мінск. А нам і кажуць: «Вы што, звар'яцелі? Мінск заняты даўно...»

Прыйшоў у ваенкамат. У тым, у чым прыехаў: у лыжнай куртцы, спартыўным трыко і... тапачках. Нават дакументаў пры сабе не было. А без пашпарта ў армію браць не хацелі. Яшчэ западозрылі ў шпіёнстве. Выратаваў студэнцкі білет. Толькі каму быў патрэбен студэнт без дакументаў? Адправілі ў тыл.

Так Аляксандр Корсак трапіў у Куйбышаў. А потым разам з эвакуяванымі аказаўся ў Ташкенце. Першыя дні жыў на вакзале: дзявацца не было куды.

— Калі цягнік стаяў у Пензе, сустрэў артыстаў Мінскага опернага тэатра, — успамінае Аляксандр Якаўлевіч. — Некаторых з іх я добра ведаў. Мая мама працавала ў гасцініцы «Еўропа», дзе яны раз-пораз адпачывалі. Артысты вярталіся з Сочы, куды з'ехалі пасля дэкады беларускага мастацтва. Пытаюцца ў мяне: «Як там Мінск?» А я і сам не ведаю. А яны мне і кажуць: «Калі што даведаешся, пішы па адрасе: Алма-Ата, Оперны тэатр». А сам думаю: ну хоць адны знаёмыя ў мяне ёсць.

### «Ніхто не хацеў паміраць...»

У Алма-Аце хутка апынуўся і сам. Зрабілі часовы пашпарт і адтуль, са Сталінскага раённага ваенкамата, прызвалі ў армію. Накіравалі ў Арлоўскае ваенна-пяхотнае вучылішча, якое знаходзілася ў эвакуацыі ў горадзе Чарджоу, што ў Туркменіі.

— Толькі якія мы былі курсанты? Адразу — салдаты, — удакладняе Аляксандр Корсак.

— Няўжо не вучыліся? — цікаўлюся.

— Якая ж там вучоба была! — адказвае ветэран: — Далі кожнаму вінтоўку, па адным разе выстралілі, абмундзіравалі — і на фронт. Трапілі пад Маскву.

— А вы дагэтуль умелі страляць?

— Ды якое! Не, вядома.

Аляксандр Корсак — удзельнік баёў на Заходнім, Варонежскім і Сталінградскім франтах. Ваяваў у складзе 999-га стралковага палка 258-й стралковай дывізіі. Гэта было адно з тых стыхійных падраздзяленняў, якое адразу пасля фарміравання і прысваення нумара адправілі на перадавую. Былі патрэбны людзі.

### «Мяне выратаваў шынель...»

Ішоў 1942 год... Усе асноўныя сілы былі сканцэнтраваны пад Сталінградам. Трапіў туды — у самае пекла — і Аляксандр Корсак.

— Тады нам упершыню выдалі процітанкавае ружжо, — расказвае Аляксандр Якаўлевіч. — Лічылася, што ім можна калі не знішчыць танк, то хаця б яго спыніць. Але, прабачце за выказванне, гэта тое ж самае, што гарох аб сцяну кідаць.

Спачатку яны стаялі ў раёне трактарнага завода. Баі былі жорсткімі. Штодзень гінула шмат людзей. За чатыры месяцы баёў з роты са 120 чалавек, у якой ваяваў Аляксандр Корсак, іх засталося ўсяго чатыры...

— Месца забітых у страі не пуставала: прыходзілі зусім маладыя хлопцы, у асноўным па 18—19 гадоў, — гаворыць былы франтавік. — Увесь час — новыя людзі. Не паспявалі нават пасябраваць. Жылі яны нядоўга...

Вельмі адчуваўся недахоп медыцынскай дапамогі. Параненых было безліч. Ратаваць іх часам не было каму... Як спартсмен, Аляксандр Корсак ведаў, як аказаць першую медыцынскую дапамогу. Таму перавязваць раны і накладваць жгуты яму даводзілася не раз. Загадалі быць яшчэ і медбратам.

Медыцынская дапамога аднойчы спатрэбілася і яму. Праз чатыры месяцы, як трапіў пад Сталінград. Падчас штурму абароны праціўніка ў ноч на 22 снежня 1942 года яго скасіла кулямётнай чаргой. Быў цяжка паранены ў абедзве нагі і руку. Хадзіць увогуле не мог.

— Мяне выратаваў шынель, — узгадвае ветэран. — Ён быў мокрым і задубеў ад маразоў. Тады ж якія маразы стаялі! Шынель стаў каляным, як браня. Кулі ў яго трапілі і разарваліся, а асколкі ў нагах і руках засталіся. Потым урачы налічаць іх больш за сорак...

Даехалі да Свярдлоўска. Далі паўгода на лячэнне. Як прайшоў патрэбны тэрмін, хацелі зноў мабілізаваць. Не дазволіў адзін военачальнік. Маўляў, куды ж іх, кульгавых, ды яшчэ з мыліцамі, на фронт адпраўляць? Так і камісавалі. У Аляксандра Якаўлевіча — 3-я група інваліднасці. Застаўся ў Свярдлоўску. Ажно да самага вызвалення беларускай сталіцы.

### «Зноў бы немцаў перамог!»

— У Мінск ехаў самым першым цягніком, які пусцілі з Масквы, — расказвае Аляксандр Якаўлевіч. — Выйшаў на канцавой — не ведаю, куды трапіў! Мінск быў разбураны. А мая кватэра ў Мацвееўскім завулку захавалася. Напэўна, таму, што побач былі нямецкія могілкі...

Уладкаваўся ў фізкультурна-спартыўнае таварыства «Дынама». З 1946 года і да самай пенсіі працаваў на кафедры плавання ў Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры. Выхаваў дзясяткі спартсменаў, у тым ліку чэмпіёнаў БССР. Стаў заслужаным трэнерам БССР па плаванні, суддзёй міжнароднай катэгорыі.

Нягледзячы на цяжкае ваеннае раненне, Аляксандр Корсак плаваў і сам. Нават былўшы на пенсіі заваёўваў узнагароды на чэмпіянатах Еўропы. А ў 80 гадоў удзельнічаў у чэмпіянаце свету па плаванні сярод ветэранаў! З Мюнхена тады прывёз бронзу. «Проста паплыў не туды, куды трэба, на вяслярным канале: зрок падвёў. А так, напэўна, зноў бы немцаў перамог!» — жартуе ветэран.

— А сярод ваенных узнагарод якімі найбольш даражыце? — пытаюся я.

— У 1941-м і ў 1942-м узнагарод не давалі, — смяецца ветэран і вельмі сціпла пералічвае: — ордэн Айчыннай вайны І-й ступені, ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За баявыя заслугі», «За абарону Масквы», «За абарону Сталінграда».

Але, напэўна, найвышэйшая ўзнагарода для Аляксандра Корсака — яго сям'я. З жонкай Ларысай Ільінічнай выхавалі двух сыноў, дачакаліся ўнукаў, праўнукаў.

Аляксандру Якаўлевічу ідзе 93-ці год. Аднак нягледзячы на свой паважаны ўзрост, ён да канца верны сваёй справе: раз або два на тыдзень наведвае басейн! Праўда, не ў Доме афіцэраў, як некалі, а ўжо той, які побач з домам. Праплыве свае паўкіламетра — і лягчэй жыць становіцца.

* * *

Падчас падрыхтоўкі публікацыі выпадкова знайшла ў віртуальным архіве ўзнагародны ліст Аляксандра Корсака. Расказала пра гэта ветэрану. Нечакана Аляксандр Якаўлевіч расплакаўся... Аказалася, што толькі цяпер, праз 70 гадоў пасля вайны, ён даведаўся, што быў не звычайным радавым, як заўсёды думаў, а старшыной медыцынскай службы.

Дарэчы, натрапіць на падобныя адкрыцці можна ў электронным банку дакументаў «Подзвіг народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.» (www.podvignaroda.mil.ru), змешчаным на сайце Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі.

**Вераніка КАНЮТА**

## ГОДОВОЙ БАЛАНС
## общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» за 2014 год

220007, г. Минск, ул. Авакяна, 19, пом. 191, к. 14, тел./факс (017) 228-12-89

(в млн. бел. руб.)

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2014 года | На 31 декабря 2013 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Основные средства | 110 | 1 259 | 1 508 |
| Запасы | 210 | 80 | 75 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 4 | 4 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным, товарам, работам, услугам | 240 | 158 | 158 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 518 | 532 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 665 | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 995 | 39 |
| **БАЛАНС** | **300** | **3 679** | **2 316** |
| **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **Код строки** | **На 31 декабря 2014 года** | **На 31 декабря 2013 года** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Уставный капитал | 410 | 348 | 7 |
| Добавочный капитал | 450 | 1 038 | 1 038 |
| Нераспределенная прибыль | 460 | 2 162 | 1 213 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 131 | 58 |
| **БАЛАНС** | | **3 679** | **2 316** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
## общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» за 2014 год

(в млн. бел. руб.)

| Наименование показателя | Код строки | За январь-декабрь 2014 года | За январь-декабрь 2013 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 8 527 | 2 318 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (559) | (358) |
| Валовая прибыль (010-020) | 030 | 7 968 | 1 960 |
| Управленческие расходы | 040 | (2 346) | (693) |
| Прибыль от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 5 622 | 1 267 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 238 | 7 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (239) | (27) |
| Прибыль от текущей деятельности | 090 | 5 621 | 1 247 |
| Доходы от инвестиционной деятельности | 100 | 319 | 573 |
| в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | - | 537 |
| проценты к получению | 103 | 319 | 33 |
| прочие доходы по инвестиц. деятельности | 104 | - | 3 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | - | (611) |
| в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | - | (609) |
| прочие расходы по инвестиц. деятельности | 112 | - | (2) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 120 | - |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 120 | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (16) | - |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (16) | - |
| Прибыль от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | 423 | (38) |
| Прибыль до налогообложения | 150 | 6 044 | 1 209 |
| Налог на прибыль | 160 | (1 088) | - |
| Чистая прибыль | 210 | 4 956 | 1 209 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль | 220 | - | 119 |
| Совокупная прибыль | 240 | 4 956 | 1 328 |

**Годовую индивидуальную отчетность ООО «Форвард-Брокер» за 2014 год в полном объеме можно получить по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19, пом. 191, к. 14.**

## АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ
## по бухгалтерской отчетности Общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» за период с 01 января по 31 декабря 2014 года

Директору Общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» Сергееву Сергею Леонидовичу

***Аудируемое лицо***:

Общество с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» (далее – ООО «Форвард-Брокер»)

Республика Беларусь, 220007, г. Минск, улица Авакяна, д. 19, пом. 191, к. 14

Деятельность ООО «Форвард-Брокер» зарегистрирована приказом Министерства финансов Республики Беларусь от 21 апреля 2006 года № 136, регистрационный номер в ЕГР 806000181

***Аудиторская организация***:

Аудитор, осуществляющий деятельность в качестве индивидуального предпринимателя, Ткач Светлана Ивановна

220022, г. Минск, ул. Чайлытко, д. 20, кв. 64

Свидетельство о государственной регистрации индивидуального предпринимателя от 24 августа 2000 г. № 955 выдано Минским горисполкомом, регистрационный номер в ЕГР 100990426

Квалификационный аттестат аудитора № 0000077 выдан на основании приказа Министерства финансов Республики Беларусь от 1 октября 2002 года №1204 регистрационный номер 76.

Мною проведен аудит прилагаемой бухгалтерской отчетности ООО «Форвард-Брокер», состоящей из бухгалтерского баланса на 31.12.2014 г., отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении капитала, отчета о движении денежных средств за 2014 год, примечаний к бухгалтерской отчетности.

***Обязанность руководства по подготовке бухгалтерской отчетности***

Руководство ООО «Форвард-Брокер» несет ответственность за составление и представление бухгалтерской отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности и организацию системы внутреннего контроля, необходимой для составления бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие недобросовестных действий или ошибок.

***Обязанность аудиторской организации***

Я несу ответственность за выраженное мною мнение о достоверности данной бухгалтерской отчетности, основанное на результатах проведенного аудита.

Я провела аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года «Об аудиторской деятельности», национальных правил аудиторской деятельности, которые обязывают меня соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной бухгалтерской отчетности.

В ходе аудита мною были выполнены аудиторские процедуры, направленные на получение аудиторских доказательств, подтверждающих значения показателей бухгалтерской отчетности ООО «Форвард-Брокер», а также другую раскрытую в ней информацию. Выбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения бухгалтерской отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения бухгалтерской отчетности мною рассматривалась система внутреннего контроля ООО «Форвард-Брокер», необходимая для составления бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы.

Аудит также включал оценку применяемой учетной политики, обоснованности учетных оценок и общего содержания бухгалтерской отчетности ООО «Форвард-Брокер».

Я полагаю, что в ходе аудита мною были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

***Аудиторское мнение***

По моему мнению, бухгалтерская отчетность ООО «Форвард-Брокер» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ООО «Форвард-Брокер» на 31 декабря 2014 г., а также финансовые результаты его деятельности и движение денежных средств за 2014 год в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности.

Аудитор, осуществляющий деятельность
в качестве индивидуального предпринимателя____________________С.И. Ткач
10 марта 2015 г.

Утерянные страховой полис добровольного страхования от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РП, 2РН серии БА 0364368, квитанция о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) серии КС 8514214, страховое свидетельство обязательного страхования гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь (договор внутреннего страхования) серии ВА 0001343 страховой компании «Промтрансинвест» **считать недействительными.**

УНП 100357923

# Ілья КОНАНАЎ: «ХОЧАШ У ТЭЛЕВІЗАР? ПРАЦУЙ НАД САБОЙ!»

**Маладосць, памножаная на жаданне рэалізоўваць сябе, здатная адчыніць любыя дзверы. Прыклад Ільі Конанава якраз пацвярджае гэтае правіла жыцця. З дзяцінства хлопец займаўся футболам і марыў пра вялікую спартыўную будучыню. Аднак усё склалася па-іншаму: пасля траўмы спорт давялося пакінуць. І каб не губляць час, Ілья вырашыў паўдзельнічаць у расійскім рэаліці-шоу «Дом-2». Ужо пасля з'яўляецца мэта — працаваць на тэлебачанні. Шматлікія кастынгі прыводзяць Ілью спачатку на тэлеканал «БелМузТБ», дзе і сёння ён вядзе «Народны чарт». Потым здзяйсняецца яшчэ адна мара — стаць вядучым на «Беларусь 2». Яго праграма «Капейка да капейкі» выклікала інтарэс у гледачоў, што для самога вядучага — найлепшая ўзнагарода за працу.**



***— У 2012 годзе вы як вядучы «БелМузТБ» былі прадстаўлены ў намінацыі «Прыз глядацкіх сімпатый» на «Тэлеваршыні». Калі зноў апынецеся сярод прэтэндэнтаў на тэлевізійны «Оскар», успрымеце гэта як прызнанне?***

— Гэтая ўзнагарода куды важнейшая для маёй бабулі. Я нават запомніў, як сёлета на дзень народзінаў яна мне пажадала атрымаць «Тэлеваршыню». На што я адказаў: «Няўжо толькі ўзнагарода можа даказаць, што я добры прафесіянал?». Але ёй было б прыемна, а бабуля для мяне — самы дарагі чалавек на свеце. Сам я такога кшталту ўзнагароды ўспрымаю як свайго роду гульню, у якую, хочаш не хочаш, трапляюць усе тэлевядучыя. Таму атрымаць узнагароду — прыемна, але для мяне галоўнае, каб мае праграмы глядзелі людзі. Каб пісалі пісьмы, як гэта адбываецца з праграмай «Капейка да капейкі».

***— І пра што пішуць вам гледачы?***

— Хочуць паўдзельнічаць, а таксама пішуць, што праграма падабаецца. Ім цікава даведацца, ці ўсё ў нас «сумленна і без падкопаў». Мы тлумачым, што не можам гарантаваць іх удзел — тут усё вырашае выпадак. Хаця праект цяпер ужо на той стадыі, калі людзі нас чакаюць у гандлёвым цэнтры. Быў такі выпадак, падышла да нас жанчына і кажа: «Хачу ў вашай праграме паўдзельнічаць. Але давайце крыху пазней». Мы пачалі здымкі, а праз паўтары гадзіны яна вяртаецца: маўляў, зараз можна пачынаць гульню. Як аказалася, жанчына ўвесь гэты час бегала па паверхах з унучкай і рабіла пакупкі, замярала час і вось цяпер падрыхтавалася...

***— Раскажыце, як узнікла праграма?***

— Праект аўтарскі. Яго гісторыя пачалася тады, калі я сядзеў у гасцях маёй сяброўкі і калегі Ксеніі Фаміч і мы абмяркоўвалі новыя ідэі. Яна сказала, што вось бы зрабіць нешта такое, каб аб'яднаць і задзейнічаць усіх людзей. Было некалькі варыянтаў, а потым Ксенія ўзгадала, як была калісьці праграма, дзе трацілі грошы. Мы пад гэтую тэму прыдумалі сваю канцэпцыю праекта. Тады, праўда, нарадзілася толькі 20 працэнтаў таго, што вы бачыце сёння. Выніковы праект з'явіўся дзякуючы супрацоўніцтву многіх людзей, і сёння мы робім яе камандай прафесіяналаў.

***— Ці адважваюцца нашы людзі траціць чужыя грошы і як часта выйграюць?***

— Тут ніколі не ўгадаеш. Калі паглядзець нашы праграмы трохмесячнай даўнасці, дзе мы пачалі гуляць з гледачамі, то не ўсім удавалася выйграваць, нават з медыйных персон. (Многія думаюць: ага, раз людзі вядомыя — значыць, будуць выйграваць.) Ці адважваюцца на траты грошай? Спачатку было вельмі складана знаходзіць герояў. Магчыма, таму, што не ўсе верылі ў сумленную гульню. Некаторыя яшчэ і камеры баяцца. Таму за кадрам ахвотнікаў паўдзельнічаць хапае, а прыязджаем у ЦУМ — і там рэальныя людзі. Некаторыя з іх праграму ні разу не бачылі. І яны ўспрымаюць усю сітуацыю з насцярожанасцю: а раптам пачнуць пытаць пра нешта і як наогул усё будзе адбывацца? Асноўная праблема ў тым, што не многія вераць у сур'ёзнасць нашага праекта. Разам з тым сарафаннае радыё працуе. І людзі не адмаўляюцца ад магчымасці паўдзельнічаць у праграме і патраціць грошы.

***— Ці лёгка вы самі траціце грошы?***

— Я вельмі люблю хадзіць па крамах. Планую адпачынак, перш за ўсё вывучаю размяшчэнне крам, буцікоў. Нават мора і сонца не падкупляюць мяне так, як шопінг і смачная ежа.

**Не кожная дзяўчына здатная вытрымаць мае шматгадзінныя паходы па магазінах. Таму ў гэтай праграме я як рыба ў вадзе.**

І не кожная дзяўчына здатная вытрымаць мае шматгадзінныя паходы па магазінах. Таму ў гэтай праграме я як рыба ў вадзе. Мабыць, каб аказаўся на месцы сваіх герояў, патраціў бы ўсё да капейкі, але пакупкі рабіў бы абдумана. Я досыць рэдка купляю нешта спантанна. Цікава было б паўдзельнічаць у сваёй жа праграме.

***— Вы ўмееце эканоміць? І на чым, па-вашаму, не варта гэтага рабіць?***

— Я транжыра, але кожную сваю пакупку доўга абдумваю. Заўсёды думаю пра заўтрашні дзень. Ніколі не пакіну ў краме ўсё да капейкі, каб потым не ведаць, на што купіць неабходнае. Кажучы пра эканомію грошай — нельга эканоміць на якасных прадуктах. Да гэтага дадаў бы здароўе і дзяцей. Мець зберажэнні і ўкладаць грошы ў нешта — гэта таксама пра мяне. Паколькі ўвесь час стаўлю сабе новыя мэты ў жыцці, то, як правіла, заўсёды знаходжуся ў стане «трэба пазбіраць». А потым спантанна магу адправіцца ў водпуск!

***— Можаце згадаць свой першы сур'ёзны заробак? На што патрацілі тыя грошы?***

— Мне было 14 гадоў, тады я падпісаў кантракт з футбольным клубам «Мінск». Першая зарплата — 100 долараў, што па тым часе былі немалыя грошы. Патраціў іх на падарунак бабулі (купіў карціну) і на арганізацыю святочнага стала з гэтай нагоды. Карціна дагэтуль вісіць на кухні. Калі гляджу на яе, успамінаю нялёгкія моманты свайго жыцця.

***— Вы часта згадваеце ў размове бабулю...***

— Яна і дзед займаліся маім выхаваннем. Так склалася, што мае бацькі разышліся, і паколькі кожны з іх будаваў сваё жыццё, то я апынуўся ў бабулі. І з часам мне так там стала камфортна, што бабулю стаў успрымаць як маці. З дзедам ездзіў на футбольныя трэніроўкі. Я заўсёды меў свабоду дзеянняў. Бабуля з дзядулем мне нічога не забаранялі, але яны ў любой сітуацыі падтрымлівалі і былі побач. А рашэнні я прымаў самастойна.

***— Удзел у рэаліці-шоу «Дом-2» быў авантурным учынкам. Не шкадуеце?***

— Калі вярнуць час, то зрабіў бы ўсё, як і тады, бо інакш я не апынуўся б там, дзе знаходжуся цяпер. Той праект стаў добрым штуршком для мяне ў жыцці. Я быў проста футбалістам, які з траўмай сядзеў дома. Як вядома, любое дзеянне лепш, чым бяздзеянне. І я паехаў на той праект, хоць і сёння не ведаю, чым быў абумоўлены мой учынак. А цяпер гляджу на хлопцаў, з якімі мы пачыналі ў спорце, і разумею, як па-рознаму склаліся нашы лёсы...

Мяне заўсёды вабіла тэлебачанне. І я задумваўся пра тое, каб трапіць у кадр. Мабыць, думкі матэрыяльныя. Таму сёння я працую на «Беларусь 2», а футбол застаўся ў маім жыцці як хобі для падтрымання формы і як магчымасць узгадаць, якімі пачуццямі быў напоўнены той час.

***— Як сёння распазнаць «талент» сярод шматлікіх работнікаў тэлеэфіру?***

— Цяпер такі час, што ўсе хочуць на экран. Я быў на кастынгу праекта «Хачу ў тэлевізар». Калі задавалі прысутным пытанне: «Навошта вам гэта?», то чулі ў адказ: «Хачу, і ўсё тут». Людзі часта не разумеюць, наколькі цяжкая ў нас праца. Мне, напрыклад, не адзін год спатрэбіўся, каб трапіць у кадр. Я займаўся з выкладчыкамі, працаваў рэпарцёрам. А сёння такое ўражанне, быццам людзям дастаткова ўласнай знешнасці, а да парад прафесіяналаў мала хто прыслухоўваецца. Не заўсёды ў навічкоў ёсць жаданне расці і працаваць над сабой.

***— Якія ўражанні пакінуў праект «Хачу ў тэлевізар»?***

— Праект цудоўны, бо ён дае магчымасць маладым людзям праявіць сябе. Пераможца атрымае кантракт з тэлеканалам. Калі б такое было раней, то я начаваў бы на Белтэлерадыёкампаніі. Наогул, той, хто хоча працаваць на тэлебачанні, павінен згаджацца на любую працу. А людзі часта хочуць прыйсці з вуліцы і стаць вядучымі рэйтынгавага праекта. Такіх цудаў у жыцці не бывае. Таму праект кшталту «Хачу ў тэлевізар» патрэбен, каб людзі бачылі, што ўсё рэальна, але для гэтага трэба працаваць над сабой.




**Алена ДРАПКО.**

# ДА СУСЕДКІ ТОЛЬКІ З ПЕСНЯЙ

**У апошнюю нядзелю красавіка прыхільнікі праграмы «Наперад у мінулае» змогуць завітаць у Пухавіцкі раён і пазнаёміцца з чатырма сяброўкамі-суседкамі з вёскі Дрычын, якіх ужо каля 35 гадоў аб'ядноўвае народная песня. Падчас фальклорнай экспедыцыі вы даведаецеся пра жыццё мясцовых жанчын, пачуеце песні і легенды гэтага рэгіёна і, безумоўна ж, новую арыгінальную версію аўтэнтычнай песні, якую выбера і выканае госць праграмы — Вольга Гарнічар.**



— Збіраемся мы з суседкамі не першы год. Пачалі такія вячоркі з песнямі ладзіць недзе ў 1980-х, — дзеліцца гаспадыня Ірына Скавыш. — Я сама — карэнная дрычанка, бо ў гэтай хаце нарадзілася, вырасла і тут прымаю гасцей.

А вось іншыя ўдзельніцы аматарскага ансамбля — Лідзія Комлік, Ганна Новік і Жанна Халюта — ужо таксама мясцовыя, бо жывуць тут не першы год, але ў свой час трапілі сюды з розных прычын. Нехта перасяліўся пасля чарнобыльскай катастрофы, а кагосьці размеркавалі на працу. Потым павыходзілі замуж, нарадзілі дзяцей і разам з тым працягвалі спяваць. Як адзначаюць самі жанчыны, іх аб'яднала песня.

Песні ў рэпертуары мясцовых артыстак самыя розныя — і пра няшчасную долю, і пра падманутых дзяўчат. Але ў кожнай з іх чуецца душа, а прыгожыя галасы робяць перажыванні яшчэ больш выразнымі.

*Ляцела зязюля ды стала куваці.*
*Ой, то не зюзюля, то родная маці,*
*Яна прыляцела дачку ўратаваці.*
*Ой, каб я знала, якая ў цябе беда,*
*То я б перадала галубкаю хлеба,*
*Галубкаю хлеба, зязюляю солі.*
*Ой, мама, ой, мама,*
*Як цяжка без долі.*

Сама вёска Дрычын сёння з'яўляецца аграгарадком, і з 2013 года знаходзіцца ў складзе Дукорскага сельсавета. Калі хто пажадае завітаць сюды на цягніку, то па лініі «Мінск — Асіповічы» ёсць чыгуначная станцыя з аднайменнай назвай, а сам населены пункт размяшчаецца за два кіламетры ад яе. Вёска вядомая з канца XVI стагоддзя ў складзе Менскага павета Рэчы Паспалітай. З 1793 года — у складзе Расійскай Імперыі. У XIX — пачатку XX ст. — належала да Навасёлкаўскай воласці Ігуменскага павета... Напрыклад, на пачатку мінулага стагоддзя Дрычын быў вялікім сялом на 220 двароў, 1760 жыхароў. Па колькасці жыхароў яна займала другое месца пасля мястэчка Пухавічы...

Чым жыве вёска сёння і якія песні, традыцыі там захоўваюць людзі, можна даведацца ў эфіры тэлеканала «Беларусь 3» пасля прагляду чарговага выпуску праграмы «Наперад у мінулае». Не прапусціце спатканне з народнай песняй 26 красавіка!

**Алена ДРАПКО.**

# АЎТОРАК, 28 КРАСАВІКА

## БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.40** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.55** Зона X.
**9.15, 22.10 Серыял «След».**
**10.50, 20.00 Да 70-годдзя Перамогі. Дэтэктыў «Ваенная разведка. Першы ўдар».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Маша ў законе!».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.30 Серыял «Добрае імя». 1-я серыя.**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.15** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**0.55** Дзень спорту.
**1.10 Маст. фільм «Шчыт і меч». 2-я серыя.**



## БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца
**9.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 19.00 Да 70-годдзя Перамогі. Серыял «Бомба».**
**11.05** «Fitnews».
**11.35, 16.45** «Разбуральнікі міфаў».
**12.40 Серыял «Мама — дэтэктыў».**
**13.50, 21.40 Серыял «Косці».**
**15.40** «Comedy woman».
**17.55, 1.05 Серыял «Віртуозы».**
**21.00** Да 70-годдзя Перамогі. «Дзённікі беларускага падполля».

**21.35** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.35 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**
**0.05 Серыял «Быць чалавекам».**

## БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.55, 19.25, 23.50** Калейдаскоп.
**8.10, 18.30 «Жазэф Бальзамо». Драма.**
**9.05, 19.35 «Дзяржаўная граніца». Фільм трэці «Усходні рубеж».**
**10.20, 18.00, 21.10** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**10.45 «Дарагі мой чалавек». Кінааповесць.**
**12.30, 23.05** «Святло далёкай зоркі». Памяці скрыпача, народнага артыста Беларусі Льва Гарэліка.
**13.05 «У агні броду няма». Драма.**
**14.35** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**15.10** «Персона». Аляксандр Разенбаум.
**15.25 «Гваздзік». Драма.**
**16.10** «Персона». Таццяна Міхалкова.
**16.30 «Чорны бусел». Драма.**
**20.45** Калыханка.
**21.35 «Паветраплавальнік». Маст. фільм.**
**23.30** «Персона». Уладзімір Далінскі.

## БЕЛАРУСЬ 5

**5.05, 10.45, 19.15** Баскетбол. НБА. Плэй-оф.
**7.30, 0.40** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**8.55** Час футбола.
**9.40** Футзал. Чэмпіянат свету. Беларусь — Бразілія.
**12.45** Футзал. Чэмпіянат свету. Беларусь — Уругвай.
**13.50** Футзал. Чэмпіянат свету. Беларусь — Аўстралія.
**14.55** Хакей. КХЛ. Фінал.
**16.50** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Чвэрцьфінал. Матч у адказ. «Барселона» — ПСЖ.
**18.45** Спорт-кадр.
**21.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Чвэрцьфінал. Матч у адказ. «Баварыя» — «Порту».
**23.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**23.45** Еўрапейскі покерны тур.

## АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.05, 16.20** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** «Вайна машын. «КВ-1. Прывід у брані».
**21.40 Серыял «У вас будзе дзіця...».**
**23.40 Серыял «Анёл або дэман».**
**0.35** «Вячэрні Ургант».
**1.10** Начныя навіны.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Маст. фільм «Эпідэмія».**
**10.40, 17.35** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.50** «Наша справа».
**14.00** «Верны сродак».
**14.50, 23.20 Серыял «Пасажыр без багажу».**
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**18.30, 1.50 Серыял «Мяжа часу».**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».

**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**22.05** «Глядзець усім!».
**23.00** «Аўтапанарама».
**1.00** «Дакументальны праект»: «На скрыжаваннях светаў».

## МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** Дак. фільм «Наша перамога».
**9.30 Маст. фільм «Паветраны вазак».**



**11.00 Серыял «Ідэальны шлюб».**
**13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 3.40** Дак. серыял «Дом без ахвяр».
**14.15, 4.25 Серыял «Джамайка».**
**16.25, 0.35** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.20 Серыял «Участковы дэтэктыў».**
**19.25 Маст. фільм «Слухач».**
**21.10, 23.15 Серыял «Даішнікі».**
**0.25** Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.
**1.30 Маст. фільм «Помні мяне».**

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35, 17.10** «Сухой. Выбар мэты».
**12.30 Серыял «Доўгія вёрсты вайны».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.30** «Прамы эфір».
**18.00 Серыял «Апошні янычар».**
**18.55** «Асаблівы выпадак».

**20.55 Серыял «Чужое жыццё».**
**21.55, 23.10 Серыял «Усе скарбы свету».**

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «Кава з малаком».
**9.05** «Вызваліцелі».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара. Новыя серыі».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.15** «Справа густу».
**14.45** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.10** «Усё будзе добра!».
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.40 Серыял «Ляснік».**
**21.25, 23.20 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**22.25** «Анатомія дня».
**0.10 Серыял «Другі шанц».**

## 8 КАНАЛ

**7.00, 14.00, 19.45, 21.00, 23.15** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.45, 19.50 Серыял «Спіраль».**
**8.30, 18.35 Серыял «Радзіма».**
**9.25, 13.45, 15.45, 16.55, 19.30, 20.55** «Хатняя крама».
**9.45 Серыял «Мерлін».**
**10.30, 23.20** «Хобі TV».
**11.00 Драма «Сем жыццяў».**
**13.00** Дак. фільм «Лік Царыцы Нябеснай».
**14.05 Серыял «Міс Марпл Агаты Крысці».**
**16.30** «Золата маўчання».
**17.05 Серыял «Дарагі доктар».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.10 Меладрама «Апошняе каханне на Зямлі».**
**22.50 Серыял «Новыя прыгоды старой Крысцін».**

## ■ Ваенкіно

# ВЯЛІКАЯ СПРАВА СКЛАДАЕЦЦА З МАЛЕНЬКІХ

### Чатыры з іх — у прыгодніцкім ваенным серыяле

**Спецыяльна да 70-годдзя Вялікай Перамогі тэлеканал «Беларусь 1» пакажа расійскі серыял па сцэнарыі нашага суайчынніка Андрэя Курэйчыка «Ваенная разведка. Першы удар» рэжысёра Аляксея Празнікава. Чатырохсерыйны фільм, заснаваны на невычэрпнай тэме Вялікай Айчыннай вайны, традыцыйна ўвабраў у сябе ворагаў, узброеную барацьбу, забойствы, стратэгіі, планы і каханне. І антураж: карты, радыёперадатчыкі, зброю — як трэба. Усё, каб закрануць струны як мага больш шырокага кола грамадства і гледачоў.**



Фонам фільма служаць намаганні нямецкага боку здзяйсняць план «Барбароса» па захопе СССР. Як вядома, вялікія справы складаюцца з маленькіх, і серыял паказвае як мінімум чатыры падобныя перамогі з боку герояў карціны, разведгрупы Галоўнага разведвальнага ўпраўлення РККА (так званай групы Паўлоўскага), якая дзейнічае на пачатку Айчыннай вайны.

Спярша яе задачай становіцца вызваленне савецкіх вучоных з сем'ямі, якіх пачатак вайны застаў у час адпачынку ў санаторыі Заходняй Беларусі — тэрыторыі, што становіцца акупаванай. Навуковая эліта — адна справа, іншая — важны для СССР чалавек, спецыяліст па распрацоўцы шыфравальных машын Сараў, страта якога ў ваенны час будзе недаравальнай.

У другой серыі група Паўлоўскага трапляе ў няёмкую сітуацыю. Пачынаецца з таго, што разведчыкі перахопліваюць машыну, у якой знаходзіцца штандартэнфюрар СС Манфрэд Лінк, чыноўнік кадравага кіравання СД. Такая «знаходка» абяцае ім вечнае прызнанне і медалі, але аказваецца, што пад імем Лінка хаваецца савецкі рэзідэнт, якога — параненага — неабходна не толькі вярнуць у нямецкі лагер, але і забяспечыць жалезным алібі.

Падчас наступнай аперацыі, у трэцяй серыі, да стратэгічных дзеянняў разведгрупы далучаюцца падлеткі-камсамольцы. Справа ў тым, што новы гаўляйтэр захопленых савецкіх тэрыторый Фрыдрых Краўзэ склаў для «сваіх» зямель план эканамічных пераўтварэнняў. Група Паўлоўскага павінна перашкодзіць здзяйсненню плана, то бок замене савецкай валюты на нямецкія маркі. Але з-за таго, што разведчыкі фізічна не могуць увасобіць дзве акцыі адначасова — забіць гаўляйтэра і знішчыць самалёт з новымі купюрамі, — яны вымушаны прасіць дапамогі звонку.

У чацвёртай серыі група атрымлівае заданне знішчыць савецкі электрамеханічны завод, які апынуўся на захопленай тэрыторыі і можа хутка ператварыцца ў завод па вытворчасці боепрыпасаў для варожай арміі. Ускладняе задачу арганізаванае немцамі ваеннае прыкрыццё і фронт, які адышоў ужо далёка. Таму, каб выканаць заданне, трэба трапіць унутр.

Вядома ж, кожная ваенная задача патрабуе ад герояў не толькі ўмення метка страляць, але і стратэгічна думаць, будаваць складаныя схемы дзеянняў, разумець чалавечую псіхалогію. Але ўсе планы, якімі б невыканальнымі яны не здаваліся, аказаліся рэчаіснымі дзякуючы мужнасці, самаадданасці і геройству разведчыкаў — у чатырох серыях фільма «Ваенная разведка. Першы ўдар».

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ** ■

## ВТБ

**6.00, 4.30** «PLAY».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30, 17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**8.00, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00, 19.00** Серыял «Кахае не кахае».
**10.00, 20.00** Серыял «Анжаліка 2».
**11.00, 18.00** Серыял «Два бацькі і два сыны».
**12.00** Меладрама «16 жаданняў».
**14.00, 23.05, 2.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.30, 17.30** «Лаві момант».
**15.00** Серыял «Тарыф на мінулае».
**16.00, 3.00** «Давай развядзёмся!».
**21.10** Меладрама «Рыжы сабака».
**0.00, 4.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Зачараваныя».

## КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.10** Навіны культуры.
**10.15** «Наглядальнік».
**11.15, 23.30** Каралеўскае кіно. «Каралева-нявінніца». Маст. фільм.
**12.50, 18.40, 1.40** «Сусветныя скарбы культуры».
**13.10, 20.25** «Правілы жыцця».
**13.35** «Пятае вымярэнне».
**14.05, 1.55** «Чатыры танкісты і сабака». Серыял.
**15.10** Да 70-годдзя Вялікай Перамогі. «Хлопчыкі дзяржавы. Сяргей Арлоў».
**15.40** «Саці. Нясумная класіка...».
**16.20** «Душа Пецярбурга». Дак. фільм.
**17.15** «Вялікі князь Мікалай Мікалаевіч (малодшы). Рады даказаць сваю любоў да Расіі». Дак. фільм.
**17.40** «Аблічча неба і зямлі». Дак. фільм.
**17.55** Да 175-годдзя з дня нараджэння П.І. Чайкоўскага. Рамансы для голасу і фартэпіяна. Ірына Архіпава, Ігар Гусельнікаў.
**19.15** Галоўная роля.
**19.30** Штучны адбор.
**20.10** «Добрай ночы, малыя!».
**20.55** «Больш, чым каханне». Мікалай Рыбнікаў і Ала Ларыёнава.
**21.40** «Гульня ў бісер». «Даніэль Дэфо. Рабінзон Круза».
**22.25** Да 70-годдзя Вялікай Перамогі. «Якаў Крэйзер. Забыты генерал». Дак. фільм.
**23.05** «Напісана вайной». Леанід Кураўлёў чытае верш Аляксандра Межырава «Прачынаюся і палю...».
**1.00** «Андрэй Тупалеў». Дак. фільм.
**2.50** «Фенімар Купер». Дак. фільм.

## НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Акулы пяра». Сяргей Мазаеў. 1997 год.
**6.45, 8.05, 8.45, 9.25, 11.35, 12.55, 14.40, 15.40, 17.00, 17.40, 18.55, 20.20, 20.45, 21.40, 23.00, 23.35, 1.10, 2.25, 2.50, 3.55, 5.40** Музычная настальгія.
**7.10** «Спяем, сябры» з Таццянай Візбар. Аляксей Івашчанка. 2007 год.
**8.30** М/ф «Як казакі алімпійцамі сталі».
**9.20, 23.30** «Прэс-экспрэс». 1993 год.
**10.00** Маст. фільм «Нявызначаная асоба».
**12.00** The Best of «СевАлогія» з Севай Наўгародцавым. 2006 год.
**13.10** Маст. фільм «Чырвоныя дыпкур'еры».
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00, 1.30** «Народжаныя ў СССР».
**17.30** М/ф «Як мужы жонак правучылі».
**18.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага рока». В. Цой «Дзеці хвілін». 2008 год. 1-я частка.
**19.10** Маст. фільм «І паўторыцца ўсё».
**20.40** М/ф «Буслік».
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1959-ы. 2-я частка. Паўтор ад 10.10. 2009 года.
**2.40** М/с «Болек і Лёлек».
**3.00** «Быў час». 2010 год.
**4.20** Маст. фільм «Два Фёдары».

## EUROSPORT

**9.30** Футбол. Еўрагалы.
**10.15, 16.30, 1.00** Снукер. Чэмпіянат свету.
**15.00** Веласпорт. Нацыянальны тур.
**0.00** Аўтагонкі. Сусветная серыя Рэно.
**0.30** Мотакрос. Чэмпіянат свету.

## КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 19.25, 22.00, 3.10** Серыял «Сваты».
**6.55** Камедыя «Правадыр розм наскурых».
**8.30** Камедыя «Таймшэр».
**10.55** Камедыя «Утаймаванне свавольных».
**12.30** Камедыя «Выпадковы муж».
**14.00, 14.50, 15.30** «Камедыянты (шоу)».
**14.25, 15.15, 21.45, 22.50, 0.55, 2.55** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Ёлкі 2».
**17.40** Камедыя «Няблага б пахудзець».
**20.20** Камедыя «Рэстаран спадара Септыма».
**23.10** Фэнтэзі «Пенелопа».



**1.15** Камедыя «Каханне жыве тры гады».
**4.00** Прыгоды «Астэрыкс і Абелікс у Брытаніі 3D».

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.40** «Доктар І.».
**8.10, 18.55, 1.55** Серыял «Эзель».
**9.45, 3.50** Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
**11.30, 17.55** Дак. серыял «Справа Астахава».
**12.25, 17.00** Дак. серыял «Сакрэты экстрасэнсаў».
**13.15, 20.45** Серыял «Браты па абмене».
**14.10, 3.25** «Простыя складанасці».
**14.40, 1.10** Серыял «Управа».
**15.35, 22.45** «Зорныя гісторыі».
**16.30, 5.30** «Нераскрытыя тайны».
**21.45, 0.25** Серыял «Шапаваlaў».
**23.40** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

## ТБ1000

**7.00** Драма «Знайсці Форэстэра».
**9.15** Жахі «Ідэнтыфікацыя».
**10.45** Камедыя «Сем псіхапатаў».
**12.40** Трылер «8 міліметраў».
**14.40** Драма «Простыя ісціны».
**16.10** Драма «Закаханыя».
**17.50** Драма «Джобс: Імперыя спакусы».
**19.55** Жахі «У нетрах кашмару».
**21.15** Трылер «Без кампрамісаў».
**22.55** Меладрама «Вечнае ззянне чыстага розуму».
**0.40** Драма «Гавана, я люблю цябе».
**2.45** Трылер «Прывід».
**4.50** Драма «Калі я паміралa».

## ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Дэтэктыў «Сышчык Пуцілін. Касцюм Арлекіна».
**8.10** Дэтэктыў «Сышчык Пуцілін. Князь ветру».
**10.30** Дэтэктыў «Сышчык Пуцілін. Дом спатканняў».
**12.10** Трагікамедыя «Мастацтва жыць у Адэсе».
**14.00** Меладрама «Унук Гагарына».
**15.50** Драма «Танец Дэлі».
**17.25** Баявік «Салавей-разбойнік».
**19.00** Драма «Дом з вежкай».
**20.20** Драма «Паршывыя авечкі».
**22.30** Драма «Танкер «Танга».
**0.30** Камедыя «Кур'ер з «Раю».



**2.10** Драма «Русалка».
**4.00** Драма «Дом».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 12.30** Мегазаводы.
**6.45, 13.15, 18.40, 22.30, 2.15** Навуковыя недарэчнасці.
**7.10** Зрабі або памры.
**7.55, 10.55** Аўта-SOS.
**9.25, 14.00, 19.30** Касмічнае падарожжа «Хабла».
**10.10, 14.45, 20.15** Космас: прамы эфір.
**11.40, 5.15** Шаша праз пекла.
**15.35** Лясное царства.
**16.20** Экстрэмальнае падарожжа.
**17.10, 0.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**17.55, 3.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**21.00, 0.45, 3.45** Упраўленне натоўпам.
**21.45, 1.30, 4.30** Узлом Сістэмы.
**23.15** Расследаванні авіякатастроф.

## DISCOVERY

**8.00, 10.55, 15.55, 21.20** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 15.30, 21.45** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** Хуткія і гучныя.
**9.40, 13.50** Геній аўтадызайну.
**12.10, 18.00** Паляўнічыя на рэліквіі.
**13.00, 6.24** Скаваныя.
**14.40, 5.36** Скрыўленне часу.
**16.20, 4.00** Майстэрня «Фантом Уоркс».
**17.10, 23.00, 4.48** Махінатары.
**18.50** Аляска: сям'я з лесу.
**19.40** Зорнае выжыванне.
**20.30** Востраў.
**22.10** Легендарныя аўто.
**23.50** Вулічныя гонкі.
**0.40, 3.10** Бітвы за кантэйнеры.
**1.30, 7.12** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.

## СЕРАДА, 29 КРАСАВІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.40** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.00** Зона Х.
**9.15, 22.10 Серыял «След».**
**10.50, 20.00 Да 70-годдзя Перамогі. Дэтэктыў «Ваенная разведка. Першы ўдар».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Маша ў законе!».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Добрае імя».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.15** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**1.00** Дзень спорту.
**1.10 Маст. фільм «Шчыт і меч». 3-я серыя.**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 19.00 Да 70-годдзя Перамогі. Серыял «Бомба».**
**11.00** Беларуская кухня.
**11.30, 16.45** «Разбуральнікі міфаў».
**12.35** Анімацыя для ўсёй сям'і. «Хортан».
**14.00, 21.40 Серыял «Косці».**
**15.50** Рэпарцёр.
**17.55, 1.05 Серыял «Віртуозы».**
**21.00** Да 70-годдзя Перамогі. «Дзённікі беларускага падполля».
**21.35** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.35 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**
**0.05 Серыял «Быць чалавекам».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.40, 19.30, 23.50** Калейдаскоп.
**8.10, 18.35 «Жазэф Бальзамо». Драма.**
**9.05 «Дзяржаўная граніца». Фільм трэці «Усходні рубеж». 2-я серыя.**
**10.15, 18.10, 21.00** «Дыя@блог». «Пра прыгожае».
**10.40 «Паветраплавальнік». Маст. фільм.**
**12.10, 23.05** «Святло далёкай зоркі». Памяці драматурга і тэатральнага крытыка Канстанціна Губарэвіча.
**12.50** «Сустрэчы ў Буквеедзе». Пісьменнікі Канстанцін Тулеў і Юрый Ражкоў.
**13.30** «Навукаманія». Чарнобыль: работа над памылкамі.
**14.00** «Наперад у мінулае».
**14.25** «Лёс гігантаў». «Беларуськалій».
**14.55 «Кола». Кароткаметражны фільм.**
**15.20** «Персона». Вікторыя Тарасава.
**15.35 «Гваздзік». Драма.**
**16.25** «Персона». Аляксандр Збруеў.
**16.50 «Музычная гісторыя». Камедыя.**
**19.40 «Дзяржаўная граніца». Фільм чацвёрты «Чырвоны пясок». 1-я серыя.**
**20.45** Калыханка.
**21.25 «Сібірыяда». Кінараман. Частка 1-я і 2-я.**
**23.30** «Персона». Іван Ахлябысцін.

### БЕЛАРУСЬ 5

**5.05, 11.30** Баскетбол. НБА. Плэй-оф.
**7.25, 0.00** PRO спорт. Навіны.
**7.55** Спорт-кадр.
**8.25** Футзал. Чэмпіянат свету. Чвэрцьфінал.
**9.25** Футзал. Чэмпіянат свету. Паўфінал.
**10.25** Футзал. Чэмпіянат свету. Фінал.
**13.25** Козел пра футбол.
**13.40** Хакей. КХЛ. Фінал.
**15.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Чвэрцьфінал. «Рэал» — «Атлетыка».
**17.25** Футбол. Кубак Беларусі. Паўфінал. Матч у адказ. «Дынама» (Мінск) — БАТЭ (Барысаў).
**19.25** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**19.55** Футбол. Кубак Беларусі. Чвэрцьфінал. Матч у адказ. «Дынама» (Брэст) — «Шахцёр» (Салігорск).
**21.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Перанесены матч 29-га тура. «Лестэр» — «Чэлсі».

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** «Вайна машын. «С-65. Баявы «Сталінец».
**21.40 Серыял «У вас будзе дзіця...».**
**23.40 Серыял «Анёл або дэман».**
**0.35** «Вячэрні Ургант».
**1.10** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Маст. фільм «Патрымаыя львы».**
**10.40, 17.35** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.50** «Верны сродак».
**14.45, 23.20 Серыял «Смак забойства».**
**16.50** «Мінск і мінчане».
**18.30, 1.50 Серыял «Мяжа часу».**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «Пароль «Рыба-меч».**
**22.05** «Глядзець усім!».
**23.00** «Гарачы лёд».
**1.00** «Сакрэтныя тэрыторыі».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00 Дак. фільм «Наша перамога».**
**9.30 Маст. фільм «Законны шлюб».**
**11.00 Серыял «Ідэальны шлюб».**
**13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20 Дак. серыял «З нагоды. Міжнародны дзень танца».**
**14.15, 4.20 Серыял «Джамайка».**
**16.25, 1.05** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.20 Серыял «Участковы дэтэктыў».**
**19.25 Маст. фільм «Ландыш серабрысты».**
**21.10, 23.15 Серыял «Даішнікі».**
**0.25** Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.
**0.35** «Сакрэтныя матэрыялы».
**2.00 Маст. фільм «Імперыя ваўкоў».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35, 17.10** «Без сведак. Павел Фіцін супраць Шэленберга».
**12.30 Серыял «Доўгія вёрсты вайны».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.30** «Прамы эфір».
**18.00 Серыял «Апошні янычар».**
**18.55** «Асаблівы выпадак».
**20.55 Серыял «Чужое жыццё».**
**21.55, 23.10 Серыял «Усе скарбы свету».**
**0.00** «Спецыяльны карэспандэнт».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «Кава з малаком».
**9.05** «Вызваліцелі».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара. Новыя серыі».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.15** «Справа густу».
**14.45** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.10** «Усё будзе добра!».
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** Ток-шоу «Гаворым і паказваем». «Дзеці караля».
**19.40 Серыял «Ляснік».**
**21.25, 23.20 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**22.25** «Анатомія дня».
**0.10 Серыял «Другі шанц».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.00, 19.45, 21.00, 23.30** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.45, 19.50 Серыял «Спіраль».**
**8.30, 18.35 Серыял «Радзіма».**
**9.30** «Кінаблакнот».
**9.45 Серыял «Мерлін».**
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Драма «Падводная лодка».**
**13.00 Дак. фільм «Навамучанікі».**
**13.45, 15.45, 16.45, 19.30, 20.55** «Хатняя крама».
**14.05 Серыял «Міс Марпл Агаты Крысці».**
**16.20** «Золата маўчання».
**16.55 Серыял «Кландайк».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Адданы садоўнік».**
**23.10 Серыял «Новыя прыгоды старой Крысцін».**
**23.35** «Хобі TV».

### ВТБ

**6.00, 4.30** «PLAY».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30, 17.00, 2.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**8.00, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30, 14.00, 23.05** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**9.00, 19.00** Серыял «Кахае не кахае».
**10.00, 20.00** Серыял «Анжаліка 2».
**11.00, 18.00** Серыял «Два бацькі і два сыны».
**12.00** Меладрама «Рыжы сабака».
**14.30, 17.30** «Лаві момант».
**15.00, 1.00** Серыял «Тарыф на мінулае».
**16.00, 3.00** «Давай развядземся!».
**21.10** Камедыя «Мы — легенды».
**0.00, 4.00** «Дурні і дарогі».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.10** Навіны культуры.
**10.15** «Наглядальнік».
**11.15, 23.30** Каралеўскае кіно. «Рышэлье. Мантыя і кроў». Маст. фільм.
**13.00** «Карл Фрыдрых Гаус». Дак. фільм.
**13.10, 20.25** «Правілы жыцця».
**13.35** «Красуйся, горад Пятроў!». Дойлід Мікалай Львоў.
**14.05, 1.55** «Чатыры танкісты і сабака». Серыял.
**15.10** Да 70-годдзя Вялікай Перамогі. «Хлопчыкі дзяржавы. Аляксандр Межыраў».
**15.40** Штучны адбор.
**16.20** «Канстанцін Паўстоўскі. Апошні кіраўнік». Дак. фільм.
**17.00, 18.40** «Сусветныя скарбы культуры».
**17.15** «Больш, чым каханне». Якаў Сегель і Ліліяна Алешнікава.
**17.55** Да 175-годдзя з дня нараджэння П.І. Чайкоўскага. Канцэрт № 1 для фартэпіяна з аркестрам. Эміль Гілельс, Віктар Дуброўскі і ДАСА СССР.
**19.15** Галоўная роля.
**19.30** «Абсалютны слых».
**20.10** «Добрай ночы, малыя!».
**20.55** «80 гадоў вучонаму». Яндэкс, Гугл і «алгарытм Залізняка». Дак. фільм.
**21.40** Улада факта. «Як нараджалася Перабудова».
**22.25** Да 70-годдзя Вялікай Перамогі. «Цвінгер. Па следзе дрэздэнскіх шэдэўраў». Дак. фільм.
**23.05** «Напісана вайной». Гоша Куцэнка чытае верш Кастуся Ваншэнкіна «Зямлі патрэсканая корка...».
**1.15** П.І. Чайкоўскі. Рамансы для голасу і фартэпіяна. Ірына Архіпава, Ігар Гусельнікаў.
**2.50** «Кацусіка Хакусай». Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2006 год.
**6.55, 8.40, 9.40, 11.00, 11.40, 12.55, 14.20, 14.45, 15.40, 17.00, 17.35, 18.40, 20.35, 21.40, 23.40, 0.45, 2.05, 2.45, 3.25, 5.35** Музычная настальгія.
**7.10** Маст. фільм «Чырвоныя дыпкур'еры».
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.30** М/ф «Як мужы жонак правучылі».
**12.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага рока». В. Цой «Дзеці хвілін». 2008 год. 1-я частка.
**13.10** Маст. фільм «І паўторыца ўсё».
**14.40** М/ф «Буслік».
**17.30, 3.20** «Прэс-экспрэс». 1993 год.
**18.00** «Эліта Краіны Саветаў». Аскар Фельцман. Песня даўжынёй у жыццё. 2007 год.
**19.00** Маст. фільм «Шчанюк».
**23.00** «Я сама». Тэма: «Мне 15 гадоў, і я ўжо жонка». 1995 год.
**0.00** «Акулы пяра». Сяргей Мазаеў. 1997 год.
**1.10** «Сняем, сябры» з Таццянай Візбар. Аляксей Івашчанка. 2007 год.
**2.30** М/ф «Як казакі алімпійцамі сталі».
**4.00** Маст. фільм «Нявызначаная асоба».

### EUROSPORT

**9.30** Тэніс. «Матс пойнт».
**10.00, 16.30, 1.00** Снукер. Чэмпіянат свету.
**15.00, 0.00** Веласпорт. Нацыянальны тур.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 9.50, 17.40, 3.10** Серыял «Сваты».
**6.55** Камедыя «Таймшэр».
**8.25** Камедыя «Выпадковы муж».
**10.45** Камедыя «Ёлкі 2».
**12.20** Камедыя «Няблага б пахудзець».
**14.00, 14.50, 15.30** «Камедыянты (шоу)».
**14.25, 15.15, 22.50, 0.55, 2.55, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Фэнтэзі «Пенелопа».
**18.35** Камедыя «Рэстаран спадара Септыма».
**20.20** Камедыя «Пастка для нявесты».
**22.00** Серыял «Пакетная здзелка». 1-я і 2-я серыі.
**23.10** Камедыя «Каханне — гэта для дваіх».
**1.15** Камедыя «Утаймаванне свавольных».
**4.05** Камедыя «Каханне жыве тры гады».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.35** «Доктар І.».
**8.05, 18.55, 1.55** Серыял «Эзель».
**9.40, 3.55** Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
**11.25, 17.55** Дак. серыял «Справа Астахава».
**12.20, 17.00** Дак. серыял «Сакрэты экстрасэнсаў».
**13.10, 20.50** Серыял «Браты па абмене».
**14.05, 3.30** «Простыя складанасці».
**14.35, 1.05** Серыял «Управа».
**15.35, 22.45** «Зорныя гісторыі».
**16.30, 5.30** «Нераскрытыя тайны».
**21.50, 0.20** Серыял «Шапавалаў».
**23.35** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

### ТБ1000

**6.35, 15.10** Жахі «У нетрах кашмару».
**7.55** Жахі «Ідэнтыфікацыя».
**9.25** Камедыя «Як па масле».
**10.55** Баявік «Патрыёт».
**13.35, 0.00** Камедыя «Ну што, прыехалі?».
**16.30** Меладрама «Вечнае зззянне чыстага розуму».
**18.15, 1.45** Фантастыка «Місія «Серэніці».
**20.10** Драма «Вельмі добрыя дзяўчынкі».
**21.50** Драма «Джобс: Імперыя спакусы».
**4.00** Баявік «Патрыёт».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Аты-баты, ішлі салдаты...»
**8.00** Драма «Дом з вежкай».
**9.25** Камедыя «Заяц над безданню».
**11.05** Камедыя «Спакавання».
**12.40** Драма «Маладая жонка».
**14.25** Драма «Чыстая перамога».
**16.20** Драма «Паршывыя авечкі».
**18.30** Камедыя «З 8 Сакавіка, мужчыны!».
**20.20** Драма «Іуда».
**22.20** Драма «Пісьмы мёртвага чалавека».
**0.00** Драма «Неба паўшых».
**2.10** Меладрама «Восенькія клопаты».
**4.00** Камедыя «Добры дзень, мы ваш дах».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 12.30** Мегазаводы.
**6.45, 13.15, 18.40, 2.15** Навуковыя недарэчнасці.
**7.10** Зрабі або памры.
**7.55** Касмічнае падарожжа «Хабла».
**8.40** Космас: прамы эфір.
**9.25, 14.45, 19.30** Упраўленне натоўпам.
**10.10, 14.00, 15.35, 20.15** Узлом Сістэмы.
**10.55** Аўта-SOS.
**11.40, 21.00, 0.45, 3.45, 5.15** Шаша праз пекла.
**15.35** Мядзведзі апошняй мяжы.
**16.20** Экстрэмальнае падарожжа.
**17.10, 0.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**17.55, 3.00** Апакаліпсіс: узыходжанне Гітлера.
**21.45, 1.30, 4.30** Дзікі тунец.
**22.30** Золата ў халоднай вадзе.
**23.15** Расследаванні авіякатастроф.

### DISCOVERY

**8.00, 10.55, 15.55, 21.20** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 15.30, 21.45** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** Скрыўленне часу.
**9.40, 13.50** Майстэрня «Фантом Уоркс».
**12.10, 18.00** Бітвы за кантэйнеры.
**13.00, 0.40, 6.24** Майстар па стварэнні басейнаў.
**14.40, 5.36** Не спрабуйце паўтарыць.
**16.20, 4.00** Пятая перадача.
**17.10, 20.30, 4.48** Махінатары.
**18.50** Вулічныя гонкі.
**19.40** Легендарнае аўто.
**22.10** Паляўнічыя на рэліквіі.
**23.00** Экстрэмальныя калекцыянеры.
**23.50** Скарбы з каморкі.
**1.30, 7.12** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.
**3.10** Багажныя войны.

## Гараскоп на



**АВЕН.** Перш чым заняцца чымсьці новым, спрабаваць развівацца або дасягаць чаго б там ні было, неабходна разабрацца з тым, што вы маеце цяпер. Старыя сувязі, нявырашаныя пытанні будуць стрымліваць, не даючы свабодна рушыць на сустрэчу да сваёй мары. І ў канчатковым выніку гэта можа прывесці да таго, што вы не станеце рухацца далей, паглыбіўшыся ў негатыўныя эмоцыі. Праявіце мудрасць і ўпартасць, і зможаце пераадолець перашкоду на сваім шляху.



**ЦЯЛЕЦ.** Тыдзень будзе прысвечаны вырашэнню фінансавых пытанняў, але трэба будзе вызначыцца, што больш важна — цёплыя адносіны з блізкімі людзьмі ці магчымасць дамагчыся пастаўленай мэты. Гэта можа быць і кар'ера, і зробак, і многае іншае, што патрабуе ўвагі ў поўнай меры. Рашэнне, вядома, не простае, але, прыняўшы яго, вы маеце магчымасць значна палепшыць сваё матэрыяльнае становішча, заняцца новым відам дзейнасці, змяніць працу і яшчэ шмат што ў сваім жыцці.



**БЛІЗНЯТЫ.** Можаце быць сур'ёзна паранены стрэламі Амура. Такая верагоднасць асабліва высокая на пачатку тыдня, пасля чаго ў жыцці ўсё пойдзе не па плане. Другая палова тыдня пацягне за сабой павышаную актыўнасць, пастаянныя перамяшчэнні, паездкі, шмат дзеянняў, якія не прыводзяць да нейкага пэўнага выніку. Жыццё набірае тэмп, вытрымка і ўседлівасць падае, што можа пайсці як на карысць, так і на шкоду. Да канца тыдня могуць здаць нервы.



**РАК.** Пачатак тыдня досыць напружаны. Ёсць магчымасць давесці справы да розуму, скончыць усё пачатае ў тэрмін, але гэта патрабуе значных фізічных і разумовых намаганняў. У хуткім часе атрымаецца нармалізаваць дзейнасць і дасягнуць згоды з іншымі людзьмі, каб думаць і дзейнічаць аднолькава. Палягчэнне ў фінансавай сферы магчыма толькі напрыканцы тыдня. У гэты час з'явіцца магчымасць падзарабіць, а таксама ўзяць пазыку або атрымаць свае грошы назад.



**ЛЕЎ.** Тыдзень будзе прысвечаны сямейным клопатам, вырашэнню як эмацыйных, так і фінансавых пытанняў. Прычым да вас у розны час можа спатрэбіцца то чуласць і клапатлівасць, то адказнасць і ўменне дзейнічаць разумна і грунтоўна. Давядзецца навучыцца існаваць паміж рознымі рэжымамі працы, каб усюды паспець і нічога не прапусціць. Бліжэй да канца тыдня ўдасца знайсці залатую сярэдзіну і самога сябе, а не ўяўляцца рознымі людзьмі ў залежнасці ад сітуацыі.



**ДЗЕВА.** Цяжкасці і мноства спраў, якія паўстануць на пачатку тыдня (хутчэй за ўсё, па працоўных пытаннях), прынясуць свой плён. Для пачатку, вядома, вам трэба з усёй адказнасцю ўзяцца за ўзніклую працу, як бы шмат яе ні было. Гэта будзе пад сілу. А ў другой палове тыдня ўжо зможаце атрымаць вынікі і планаваць, што рабіць з імі далей. У сярэдзіне тыдня верагодныя фінансавыя паступленні і з'яўленне новых перспектыў. Канец тыдня спрыяльны для адпачынку, сяброўскіх кампаній і вечарынак.

## наступны тыдзень

**ШАЛІ.** Вельмі шмат у падзеях тыдня будзе залежаць ад іншых людзей. Зносіны, перамовы, сустрэчы — усяго шмат. Магчыма заключэнне дагавораў, прыняцце важных рашэнняў. З-за наяўнасці спраў, якія нельга адкласці на потым, можа не хапіць часу на асабістае жыццё. Ваша палавінка пачне адчуваць недахоп увагі бліжэй да канца тыдня, калі вы ўжо парадкам выматаецеся з-за спраў, якія наваліліся.

**СКАРПІЁН.** Адпусціце сітуацыю, не прыдумляйце наперад і не стройце грандыёзных планаў, і тады ёсць шанц, што ўсё будзе складвацца так, як яно і павінна быць, і прынясе вам максімальны поспех і самы станоўчы вынік. Лёгкасць у думках і справах можна адчуць толькі ў пачатку тыдня, а потым вас чакае некаторая прыгнечанасць. Другая палова тыдня будзе звязана з прытупленнем пачуццяў, дзеяннямі ў адпаведнасці з выразным планам, халодным разлікам і дасягненнем матэрыяльнай выгады. Што, безумоўна, добра для працоўных і фінансавых спраў, але не дае магчымасці адпачыць і жыць эмацыйным жыццём.

**СТРАЛЕЦ.** Спрыяльны пачатак тыдня, які прадказвае паляпшэнне адносін, стабілізацыю ў справах сямейных і шмат іншых прыемных падзей. У пачатку тыдня ёсць рызыка перашчыраваць і паддацца розным празмернасцям — як у ежы, так і ў пачуццях. Сярэдзіна тыдня спрыяльная для добраўпарадкавання дома, вырашэння ўнутраных пытанняў. У гэты час таксама можна дазволіць сабе адпачыць і расслабіцца. Крыху больш сумна выглядаюць падзеі канца тыдня. Давядзецца знайсці выйсце з розных складаных сітуацый, што можа стаць прычынай стрэсу.

**КАЗЯРОГ.** Калі вы жадаеце дамагчыся поспеху, каб потым спакойна адпачываць, пажынаючы плады праведзенай працы, то спачатку трэба будзе гэтую самую працу зрабіць. Першая палова тыдня можа быць звязана з рознымі канфліктамі і неабходнасцю прабіваць сабе шлях у жыцці. Затое другая палова дазволіць вам удосталь нацешыцца жыццём. У гэты час палепшыцца матэрыяльнае становішча, а да канца тыдня могуць з'явіцца і новыя фінансавыя ідэі, рэалізоўваць якія можна і не спяшацца.

**ВАДАЛЕЙ.** Тыдзень вельмі спрыяльны, хоць і не адназначны. У пачатку магчымыя новыя ідэі і парывы, але паколькі вы знаходзіцеся ў тым стане, што рабіць ужо нічога не хочацца, а ўсё, што трэба, дасягнута, то, хутчэй за ўсё, прымаць якіх-небудзь рашэнняў і рабіць дзеянняў не будзеце. Другая палова тыдня абяцае стабільнае фінансавае становішча, адпачынак. А бліжэй да канца тыдня вас чакае прыемны адпачынак у сям'і.

**РЫБЫ.** У пачатку тыдня магчымы перапады настрою і разнастайныя цяжкасці псіхічнага характару: стрэсы, перажыванні. Для гэтага не абавязкова будуць сур'ёзныя падставы. У сярэдзіне тыдня ў жыцці пачнуцца перамены, у асноўным унутраныя, што дазволіць скінуць з сябе цяжар і пачаць жыць поўным жыццём. У гэты перыяд добра займацца рукадзеллем ці наогул што-небудзь рабіць сваімі рукамі і па дакладным плане, нават калі гэта будзе сартаванне дакументаў па алфавітным парадку. Верагодныя нязначныя грашовыя паступленні.

# ЧАЦВЕР, 30 КРАСАВІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.30** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 17.50, 0.15** Зона Х.
**9.10 Серыял «След».**
**10.50 Да 70-годдзя Перамогі. Дэтэктыў «Ваенная разведка. Першы ўдар».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Маша ў законе!».**
**15.15, 18.10** Навіны рэгіёна.
**15.30 Серыял «Добрае імя».**
**16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».**
**17.30, 0.35** Сфера інтарэсаў.
**18.55, 21.50** «Я магу!». Фінал.
**21.00** Панарама.
**23.30** «Я магу. За кадрам».
**0.00** «Я магу!». Падвядзенне вынікаў фіналу праекта.
**1.00** Дзень спорту.
**1.15 Маст. фільм «Шчыт і меч». Заключная серыя.**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 19.00 Да 70-годдзя Перамогі. Серыял «Бомба». Заключныя серыі.**
**11.00** Беларуская кухня.
**11.35, 16.45** «Разбуральнікі міфаў».
**12.40** Вышэй за дах.
**13.15** Ікра.
**14.10 Серыял «Косці».**
**16.00** Перазагрузка.
**17.55 Серыял «Віртуозы».**
**21.00** Да 70-годдзя Перамогі. «Дзённікі беларускага падполля».
**21.35** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.40 Камедыя «Я, зноў я і Ірэн».**
**23.45** Гандбол. ЕЎРА-2016. Кваліфікацыя. Беларусь — Данія. Мужчыны.

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабрананак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.45, 19.20, 0.20** Калейдаскоп.
**8.10, 18.25 «Жазэф Бальзамо». Драма.**
**9.05, 19.30 «Дзяржаўная граніца». Фільм чацвёрты «Чырвоны пясок».**
**10.05, 18.00, 21.05** «Грані Перамогі». Дак. серыял.
**10.35, 21.35** «Сібірыяда». Кінараман. Частка 1—4-я.
**12.15, 23.10** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастацтвазнаўцы Гурыя Барышава.
**12.55** «Джазавая панарама». Біг-бэнд Нацыянальнага аркестра пад кіраўніцтвам М. Фінберга.
**14.30 «Выпадковая сустрэча». Камедыя.**
**15.35** «Наперад у мінулае».
**16.00** «Персона». Віктар Мярэжка.
**16.30 «Гваздзік». Драма.**
**17.00** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**17.30** «Сіла веры».
**20.45** Калыханка.
**23.40** «Персона». Алена Драпека.
**23.55** «Персона». Раман Вікцюк.

### БЕЛАРУСЬ 5

**2.35, 11.40, 21.10** Баскетбол. НБА. Плэй-оф.
**5.00, 23.40** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Чвэрцьфінал. Матч у адказ.
**7.00, 1.35** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Футбол. Кубак Беларусі. Чвэрцьфінал. Матч у адказ. «Дынама» (Брэст) — «Шахцёр» (Салігорск).
**9.50** Футбол. Кубак Беларусі. Паўфінал. Матч у адказ. «Дынама» (Мінск) — БАТЭ (Барысаў).
**13.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Перанесены матч 29-га тура. «Лестэр» — «Чэлсі».
**15.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**16.40** Хакей. КХЛ. Фінал.
**18.55** Гандбол. Адборачны матч ЧЕ-2016. Беларусь — Данія. Мужчыны.
**20.40** Авертайм.
**23.10** Муай-тай. К-1. Файт-шоу «Тонгкат».

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** «Трэба разабрацца».
**21.30 Серыял «У вас будзе дзіця...».**
**23.30** Канцэрт «Чайф». 25 гадоў вытрымкі».
**1.20** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Мінshчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Маст. фільм «Пароль «Рыба-меч».**
**10.10** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.40, 17.35** «Званая вячэра».
**12.30** «Не хлусі мне!».
| 37 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | - | 150,000 |
| 39 | Выкуп собственных акций | 72101 | | - | (433) |
| 40 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | (6,375) | (1,131) |
| 42 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | (6,375) | 148,436 |
| 43 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | 7,295 | 3,469 |
| 44 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | | (63,417) | 131,279 |
| 45 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | | x | 255,126 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | | 191,709 | x |

Председатель Правления
А.С. Бриштелев
11 марта 2015 года
Минск

Главный бухгалтер
И.Б. Сафронова
11 марта 2015 года
Минск

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 08.05.2013 г. № 5. УНП 100233809.

KPMG

**ООО «КПМГ»**
пр-т Дзержинского, 57
помещение 53, офис 53-2
220089, Минск, Беларусь

Телефон +375 17 372 72 57
Факс +375 17 372 72 58
Интернет www.kpmg.by

**Аудиторское заключение независимых аудиторов по сокращенной годовой финансовой отчетности Открытого акционерного общества «Паритетбанк» за 2014 год**

*Заинтересованным пользователям*

ул. Киселева, 61а
г. Минск, 220002
Республика Беларусь

Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100233809

Исх. номер 1103-05

*Заключение по сокращенной финансовой отчетности*

Прилагаемая сокращенная годовая финансовая отчетность, которая включает в себя бухгалтерский баланс по состоянию на 01 января 2015 года, отчет о прибылях и убытках, отчет об изменении капитала и отчет о движении денежных средств за 2014 год, составлена на основании аудированной годовой финансовой отчетности Открытого акционерного общества «Паритетбанк» («Банк») за год, закончившийся 31 декабря 2014 года, подготовленной в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь. В нашем аудиторском заключении от 11 марта 2015 года мы выразили безусловно положительное аудиторское мнение по годовой финансовой отчетности Банка.

Сокращенная годовая финансовая отчетность не включает всех раскрытий, требуемых законодательством Республики Беларусь. Таким образом, изучение сокращенной годовой финансовой отчетности не заменяет изучения аудированной годовой финансовой отчетности Банка.

*Ответственность руководства за подготовку годовой финансовой отчетности*

Руководство Банка несет ответственность за подготовку и объективное представление сокращенной годовой финансовой отчетности в соответствии с требованиями Инструкции о порядке раскрытия информации о деятельности банка, небанковской кредитно-финансовой организации, банковской группы и банковского холдинга, утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 11.01.2013 г. № 19.

*Ответственность аудиторов*

В наши обязанности входит выражение мнения о данной сокращенной годовой финансовой отчетности, базируясь на результатах проведенных нами аудиторских процедур в соответствии с требованиями Республиканского правила аудиторской деятельности «Аудиторское заключение по специальному аудиторскому заданию» глава 6.

*Аудиторское мнение*

По нашему мнению, сокращенная годовая финансовая отчетность, подготовленная на основе аудированной годовой финансовой отчетности Открытого акционерного общества «Паритетбанк» за год, закончившийся 31 декабря 2014 года, соответствует во всех существенных отношениях годовой финансовой отчетности, на основе которой она была подготовлена в соответствии с требованиями Инструкции о порядке раскрытия информации о деятельности банка, небанковской кредитно-финансовой организации, банковской группы и банковского холдинга, утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 11.01.2013 г. № 19.

**Верещагина Ирина Владимировна**
Директор

**Абойшева Анна Михайловна**
Руководитель аудиторской группы

11 марта 2015 года

г. Минск, Республика Беларусь
ООО «КПМГ»

Свидетельство о государственной регистрации выдано Минским горисполкомом на основании решения от 10.02.2011, УНП 191434140

■ Нязведанае

# ТЫ ХТО, ПРЫШЭЛЕЦ?



**З мінулага выпуску «Навігатара» вы даведаліся пра цікавыя факты, звязаныя з іншапланецянамі. Зразумела, што гэта толькі невялікая іх колькасць. Тым часам, аказваецца, спецыялісты па вывучэнні пазазямнога жыцця і цывілізацый не проста прызнаюць факт існавання іншапланецян, а ўжо нават іх класіфікавалі!**
**Для людзей знешнасць заўсёды мела немалаважную ролю, і можна сказаць, што была на першым месцы. Таму няма нічога заганнага ў тым, што ў першую чаргу чалавецтва цікавіць знешні выгляд іншапланецян, і толькі потым іх планы на нас і нашу планету. Вядома, нам хацелася б думаць, што многія прышэльцы — гуманоіды. Гэтую версію пацвярджаюць разнастайныя ўфолагі і даследчыкі НЛА — ды што казаць, усе мы неаднаразова бачылі гэтага «жыхара далёкага свету» ў фільмах, на плакатах, паштоўках і футболках... Але цяпер не пра гэта, нас цікавіць навуковы бок пытання. Па сцвярджэннях многіх даследчыкаў іншапланетных формаў жыцця, ЯНЫ падраздзяляюцца на мноства тыпаў. Некаторыя вылучаюць чатыры-пяць, а іншыя і каля двух дзясяткаў! Мы ж спынімся на наступнай класіфікацыі.**

**1. Шэрыя.** «Шэрыя» — від прышэльцаў, які найчасцей згадваецца ва ўфалагічнай літаратуры. У большасці выпадкаў пра іх пішуць як пра вельмі худых нізкарослых істот, каля метра ростам, аднак ёсць сведчанні і пра вельмі высокіх, амаль трохметровых «шэрых». Гэта так званы «класічны» тып іншапланецян, вельмі далікатных на выгляд, з чорнымі бяздоннымі міндалепадобнымі вачыма, непрапарцыянальна вялікай галавой і вельмі доўгімі рукамі. «Шэрых» часцей за ўсё звязваюць з выкраданнямі людзей для медыцынскіх эксперыментаў, хоць нямала фактаў назапашана і пра тое, што «шэрыя» цікавяцца матэрыяльнымі каштоўнасцямі чалавечай цывілізацыі і часта выказваюць жаданне супрацоўнічаць з намі.

**2. Рэптыліі.** «Рэптыліі» — вельмі рэдкі від прышэльцаў. Па фізічных параметрах яны таксама хударлявыя і цыбатыя, як многія іншыя тыпы, але пры гэтым валодаюць ярка выяўленымі прыкметамі рэптылій: лускаватай, як у некаторых яшчарак, скурай, буйнымі змяінымі вачыма, кіпцюрыстымі канечнасцямі. Аб іх намерах і сферы інтарэсаў на Зямлі нічога не вядома.



**3. Росвелаўцы.** Так даследчыкі назвалі ўдзельнікаў экіпажа касмічнага карабля, які пацярпеў катастрофу блізу горада Росвел (Нью-Мексіка, ЗША). Па розных звестках, іх было не больш за чатыры. Мяркуючы па мізэрнай інфармацыі, якая прасачылася ў грамадства, амерыканскія ваенныя медыкі здолелі падлячыць іншапланецян пасля аварыі і займаліся вывучэннем іх фізіялогіі. Прышэльцы з Росвела больш падобныя да людзей, чым «шэрыя». У іх больш «дзіцячыя» рысы твару, глыбока пасаджаныя раскосыя вочы. Гэтыя даўгарукія істоты маюць па чатыры пальцы на кожнай далоні, з іх два пальцы нармальнай даўжыні, а два іншыя неверагодна доўгія. Як і «шэрыя», росвелаўскія іншапланецяне — карантышкі (ад метра да паўтара метра ростам).

**4. Старажытныя.** «Старажытных» звычайна апісваюць як гуманоідаў, знешне блізкіх да багамолаў, з халоднымі чорнымі міндалепадобнымі вачыма і жоўта-зялёнай скурай. Яны даволі рослыя, ад 1,5 да 2 метраў. Як большасць касмічных рас, «старажытныя» вельмі худыя, з падоўжанымі канечнасцямі і пальцамі. Па звестках даследчыкаў, у адрозненне ад іншых прышэльцаў, «старажытныя» вельмі холадна, а часам з вялікай непрыязнасцю ставяцца да людзей. Іх абсалютна не цікавяць веды і дасягненні нашай цывілізацыі. Апавяданні тых, каго выкрадалі «старажытныя», адрозніваюцца жудаснымі падрабязнасцямі аб варварскіх медыцынскіх эксперыментах. «Старажытныя» часта суправаджаюць «шэрых», як быццам выконваючы ролю кіраўнікоў або наглядчыкаў. З гэтага факта вырасла гіпотэза пра тое, што ўсе расы прышэльцаў суіснуюць у нейкай галактычнай цывілізацыі і што некаторыя тыпы атрыманы з іншых шляхам генетычных эксперыментаў.

**5. Неанаталы.** «Неанаталы» падобныя адначасова і да «шэрых», і да «росвелаўцаў». Яны шмат у чым нагадваюць людзей, а дакладней — нованароджаных, адсюль і назва («neonate» — дзіця ва ўзросце да месяца). Усе яны невялікага росту, з непрапарцыянальна вялікай галавой і доўгімі канечнасцямі, на кожнай з якіх па чатыры пальцы. У зносінах з людзьмі абыходзяцца без слоў, перадаючы думкі на адлегласці.



**6. Нардычныя.** Часам іх называюць «бландзінамі», «высокімі белымі» або «скандынавамі». Відавочцы паведамляюць, што сярод «нардычных» прышэльцаў выразна адрозніваюцца асобіны жаночага і мужчынскага полу. У іх светлая скура, бялявыя валасы, атлетычны склад. Усе «скандынавы» вельмі прыгожыя. Акрамя тэлепатыі, яны валодаюць яшчэ цэлым шэрагам звышнатуральных здольнасцяў.

**7. Гібрыды.** Амаль усе тыпы прышэльцаў вызначаюцца вялікай цікавасцю да біялогіі чалавека. Вельмі часта відавочцы ці ахвяры выкраданняў апісваюць медыцынскія эксперыменты на рэпрадуктыўных органах людзей. Некаторыя расказваюць пра тое, што іх прымушалі ўступаць у міжвідавыя сексуальныя кантакты, іншым жа нібыта паказвалі эмбрыёны або нованароджаных, якія з'явіліся ў выніку падобных сувязяў паміж людзьмі і прышэльцамі. «Гібрыды» больш за іншых прышэльцаў падобныя да людзей, хоць у іх захоўваецца тыповая для іншапланецян форма вачэй і чэрапа. У некаторых сітуацыях «гібрыды» праяўляюць здольнасць да тэлепатыі.

**8. Чупакабры.** На думку некаторых даследчыкаў, чупакабры сталі наведваць Зямлю зусім нядаўна. Аднак іх дзіўнае падабенства да хімер і гаргулляў (у тым іх выглядзе, што данесла да нас гатычная архітэктура) дазваляе выказаць здагадку, што яны знаходзяцца на Зямлі ўжо вельмі даўно. Чупакабраў апісваюць як неразумных дробных жывёлін, не больш за паўметра ростам, з вялікімі раскосымі вачыма, вырастамі на галаве, шыпамі на спіне. Яны асцярожныя і палахлівыя, але жорсткія, як дзікія драпежнікі. Сілкуюцца як дробнымі, так і буйнымі рагатымі жывёламі, высмоктваючы сокі з іх целаў, але людзей не чапаюць. Існуе тэорыя, што яны — вынік няўдалага генетычнага эксперымента пэўнай іншапланетнай цывілізацыі.



■ Дайджэст

## КАСМІЧНЫЯ СТАНЦЫІ БУДУЦЬ ТКАЦЬ РОБАТЫ-ПАВУКІ

**Амерыканская кампанія распрацоўвае тэхналогію будаўніцтва ў адкрытым космасе, прыкладам для якой выступілі павукі, якія ткуць сваё павуцінне. Сістэма SpiderFab будзе выкарыстоўваць павукападобных робатаў для зборкі буйных аб'ектаў на арбіце, паведамляе Space.com.**



Праект SpiderFab кіраўнік кампаніі Tethers Unlimited прадставіў на семінары рабочай групы НАСА па работах у космасе. На думку Роба Хойта, сучасная мадэль вытворчасці касмічных караблёў (усё будуецца і збіраецца на Зямлі, а затым выводзіцца на арбіту) вельмі дарагая і неэфектыўная. Замест яе Хойт прапануе запускаць у космас вуглевалакно, з якога робаты будуць ткаць стрыжнёвыя канструкцыі — аснову для будучых касмічных станцый і апаратаў. Пабудаваныя на арбіце аб'екты не толькі абыдуцца танней, але і будуць прасцей, бо ім не спатрэбіцца вытрымліваць экстрэмальныя ўмовы запуску.

У аснове праекта SpiderFab ляжыць шматрукі робат, які адным «прадзільным органам» вырабляе апорныя элементы канструкцыі, а другімі — злучае іх. Робат перамяшчаецца па сваёй «павуціне», якая расце. Атрымаўшы фінансаванне ад НАСА, Tethers Unlimited ужо стварыла невялікі апарат, які вырабляе лёгкія і трывалыя канструкцыі з маткоў вугляроднага валакна з хуткасцю пяць сантыметраў у хвіліну. Цяпер Хойт і яго калегі працуюць над «ткацкай машынай» другога пакалення, каб праз некалькі гадоў вывесці на арбіту дэманстрацыйны спадарожнік з апаратам.

З практычнага пункту гледжання інжынеры могуць пачаць са зборкі зорнага парасона для арбітальнага тэлескопа New Worlds Observer. Такая канструкцыя заклікана закрываць святло ад зорак, тым самым дазваляючы тэлескопу разглядзець экзапланеты на іх арбітах. На Зямлі пакуль можна пабудаваць зорны парасон самае большае 62 метры ў дыяметры, аднак у космасе гэтую велічыню атрымаецца павялічыць больш чым удвая (да 124 метраў), сцвярджае Хойт.

## ЧАЛАВЕЦТВА ПЯРОЙДЗЕ НА ЭНЕРГІЮ СОНЦА?

**Сонечная энергетыка да 2050 года можа стаць асноўнай крыніцай электрычнасці ў свеце дзякуючы скарачэнню выдаткаў на неабходнае абсталяванне, прагназуе Міжнароднае энергетычнае агенцтва (МЭА).**



На сістэмы сонечных панэляў і геліятэрмаэлектрычныя электрастанцыі да таго часу будзе прыпадаць адпаведна 16% і 11% ад агульнага аб'ёму электраэнергіі, што выпрацоўваецца ў свеце. На пачатак 2014-га іх магутнасці складалі 150 ГВт і 4 ГВт адпаведна. Нізкі кошт дасць штуршок да «сонечных» распрацовак. Эксперты агенцтва мяркуюць, што ўжо ў наступнае дзесяцігоддзе сонечная энергетыка стане камерцыйна рэнтабельнай, а затым перасягне па аб'ёмах выпрацоўкі энергіі традыцыйную энергетыку.

Кошт сонечнай энергіі знізіўся да $0,8 за ват у такіх краінах, як Аўстралія, Германія, Італія і Галандыя, у той час як у 2008 годзе яна перавышала $4, і спецыялісты лічаць, што да 2050 года кошт знізіцца да $0,3 за ват.

На фоне надбавак за выкід парніковых газаў, якія растуць і далей будуць накладацца на традыцыйныя віды паліва, ужо да 2025 года надыдзе момант, калі сонечная энергетыка стане канкурэнтаздольнай і прывабнай для прыватных інвестараў.

Паводле даных МЭА, магутнасці сусветнай сонечнай энергетыкі дасягнуць у будучым годзе 200 ГВт — пасля ўводу ў строй новых станцый у Кітаі і Японіі на пяць гадоў раней за намечаны тэрмін. Пачынаючы з 2025 года, устаноўленыя магутнасці будуць узрастаць на 200 ГВт штогод — і ў выніку да 2050 года да 27% энергіі ў свеце будзе выпрацоўвацца на сонечных станцыях розных тыпаў.

## НАВУКОЎЦЫ ЗАНЯЛІСЯ СЯМЕЙНЫМ ШЧАСЦЕМ

**Навукоўцы высветлілі, што ляжыць у аснове вернасці людзей адно аднаму. Аказалася, што сучасны чалавек, у адрозненне ад сваіх продкаў, страціў здольнасць улоўліваць палавыя ферамоны іншых людзей.**

Аўстралійскі антраполаг Майкл Сотард упэўнены, што ў працэсе эвалюцыі людзі страцілі магчымасць успрымаць палавыя ферамоны. Менавіта дзякуючы гэтай асаблівасці чалавек можа спалучаць манагамныя адносіны і жыццё ў грамадстве.

У сваёй кнізе «Нос Адама і станаўленне чалавецтва» вучоны прыйшоў да высновы, што 20 мільёнаў гадоў таму нашы продкі прыцягвалі адно аднаго ў сексуальным плане за кошт пахаў. Аднак у працэсе сацыялізацыі чалавека сувязь паміж нюхам і сексуальнай цягай страцілася. У адваротным выпадку людзі не маглі б заводзіць пастаянныя адносіны, адцягваючыся на іншыя прывабныя аб'екты. «Манагамія, якая ляжыць у аснове бяспекі адной сямейнай структуры, не змагла б вытрымаць сексуальны ціск жыцця ў грамадстве», — адзначыў Сотард.



На думку антраполага, у чалавека, у адрозненне ад іншых млекакормячых, нюх звязаны з участкамі мозга, якія адказваюць за рацыянальныя паводзіны. Менавіта таму ў працэсе эвалюцыі людзі сталі першымі, хто палічыў свае натуральныя пахі непрыемнымі. Паступова яны сталі пазбаўляцца ад іх з дапамогай вады і мыла і штучна надаваць целу прыемны водар. «Эвалюцыя зняла з чалавецтва многія інстынктыўныя рэакцыі на пахі, якія кіруюць іншымі млекакормячымі», — патлумачыў вучоны. На думку Сотарда, у мозгу чалавека яшчэ засталіся ўчасткі, якія рэагуюць на сексуальныя водары, толькі цяпер іх узбуджаюць парфумай.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

ЕВРОТОРГ ИНВЕСТБАНК

## ОАО «Евроторгинвестбанк»

www.etib.by

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2015 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 г. | 2013 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 3, 21 | 28 266 | 17 357 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 4, 21 | 15 741 | 20 182 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 5, 21 | 217 431 | 24 433 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 6 | 2 979 | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 7, 21 | 484 285 | 199 100 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | 80 | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 8 | 18 174 | 10 205 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | - | - | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | | |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 9 | 62 864 | 3 226 |
| 14 | **ИТОГО активы** | **11** | | **829 820** | **274 503** |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | - | - | - |
| 17 | Средства банков | 1202 | 10.1 | 224 194 | 69 057 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 10 | 243 209 | 129 468 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | - | 41 | 41 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | 17 | 2 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | | |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 11 | 3 655 | 940 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | - | 471 116 | 199 508 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 12 | 341 516 | 64 924 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 12 | 4 308 | 4 169 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 17 | 2 080 | 2 183 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 13 | 10 800 | 3 719 |
| 30 | ВСЕГО капитал | 121 | - | 358 704 | 74 995 |
| **31** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **829 820** | **274 503** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2014 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 г. | 2013 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 13.1 | 87 933 | 55 588 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 13.1 | 36 801 | 27 157 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 13.1 | 51 132 | 28 431 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 13.2 | 31 397 | 17 620 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 13.2 | 1 676 | 911 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 13.2 | 29 721 | 16 709 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 13.3 | (170) | (190) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 13.3 | 8 608 | 5 488 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 21 | 254 | (2) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 14 | 44 513 | 9 295 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 13.5 | 29 217 | 1 170 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 13.6 | 63 391 | 37 785 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 13.5 | 2 176 | 1 749 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | - | 8 682 | 2 777 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 15 | 1 565 | 4 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **7 117** | **2 773** |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | 12 | 104 | 81 |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | 12 | 104 | 81 |

### ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ СОБСТВЕННОГО КАПИТАЛА за 2014 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей капитала: уставный фонд | эмиссионный доход | резервный фонд | накопленная прибыль (убыток) | фонды переоценки статей баланса | всего капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 1 января 2013 г. | 3011 | 64 924 | - | 3 339 | 1 775 | 1 702 | 71 740 |
| 1.1 | В том числе: результат от изменений учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | | | | | | |
| 2 | Изменения статей капитала | 3012 | - | - | 830 | 1 944 | 481 | 3 255 |
| 2.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 2 773 | 481 | 3 254 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 830 | (830) | x | 0 |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | - | - | x | - | x | - |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 2.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | - | - | - |
| 2.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | 1 | - | 1 |
| 3 | Остаток на 1 января 2014 г. | 3013 | 64 924 | - | 4 169 | 3 719 | 2 183 | 74 995 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2014 г. | 3011 | 64 924 | - | 4 169 | 3 719 | 2 183 | 74 995 |
| 5 | Изменения статей капитала | 3012 | 276 592 | - | 139 | 7 081 | (103) | 283 709 |
| 5.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 7 117 | - | 7 117 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 139 | (139) | x | 0 |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | 276 592 | - | x | - | x | - |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 276 592 | - | x | x | x | - |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 5.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | 103 | (103) | - |
| 5.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | - | - | - |
| 6 | Остаток на 1 января 2015 г. | 3013 | 341 516 | - | 4 308 | 10 800 | 2 080 | 358 704 |

### СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за 2014 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль за отчетный период | 301211 | 13 | 7 117 | 2 773 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода за отчетный период | 301212 | - | - | 481 |
| 2.1 | В том числе: переоценка основных средств | 3012121 | 8 | - | 481 |
| 2.2 | переоценка незавершенного строительства и неустановленного оборудования | 3012122 | - | - | - |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | - | - | - |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | - | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | - | - | - |
| 3 | ИТОГО совокупный доход за отчетный период | 30121 | | 7 117 | 3 254 |

### ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2014 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | - | 83 969 | 51 085 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | - | (36 662) | (27 050) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | - | 31 080 | 17 556 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | - | (1 673) | (800) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | - | - | - |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | - | (170) | (190) |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | 17 | 8 441 | 5 446 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | - | - | - |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | - | 17 951 | 1 103 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | - | (60 812) | (37 789) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | - | (1 483) | (599) |
| 13 | Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах, итого | 701 | - | 40 641 | 8 761 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | - | (508) | (975) |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | 17 | (201 234) | 10 864 |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | 17 | (2 963) | 380 |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | 17 | (293 138) | (113 131) |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | - | - | - |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | - | (52 815) | (8 305) |
| 20 | Потоки денежных средств от изменения операционных активов, итого | 702 | - | (550 658) | (111 167) |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | - | - | - |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | 17 | 137 253 | 27 896 |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | 17 | 118 534 | 88 989 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 70303 | - | - | 40 |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | - | - | - |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | 17 | (5 172) | 6 420 |
| 27 | Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств, итого | 703 | - | 250 615 | 123 344 |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | - | (259 402) | 20 939 |
| 29 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | - | (9 774) | (7 726) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | - | - | 0 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | - | - | - |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | - | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | - | - | - |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | - | - | - |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | - | (9 774) | (7 725) |
| 37 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | - | 276 592 | - |
| 39 | Выкуп собственных акций | 72101 | - | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 72102 | - | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | - | - | - |
| 42 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | - | 276 592 | 0 |
| 43 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | 13.4,17 | 2 469 | 834 |
| 44 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | - | 9 885 | 14 048 |
| 45 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | 17 | x | 34 945 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | 17 | 44 830 | x |

И.о. Председателя Правления В.Н. Павлюк

Главный бухгалтер С.С. Ящук

Дата подписания 27 марта 2015 г.

Лицензия ОАО «Евроторгинвестбанк» № 26 от 28.05.2013 г. УНП 807000043.

---

BDO

Телефон: +375 17 308 74 50
Факс: +375 17 308 74 51
www.bdo.by

ООО «БДО»
пр. Победителей, 103
офис 807
Минск, Беларусь
220020

Исх. номер 04-03/40/172

**Аудиторское заключение по публикуемому годовому отчету**
**Открытое акционерное общество «Евроторгинвестбанк»**
**за 2014 год**

Акционерам, Наблюдательному совету и Правлению ОАО «Евроторгинвестбанк»
Национальному банку Республики Беларусь

**Аудиторская организация**
Наименование: ООО «БДО»
Место нахождения: Республика Беларусь, 220020, г. Минск, пр. Победителей, 103, офис 807
Сведения о государственной регистрации: Свидетельство о государственной регистрации выдано на основании решения Минского городского исполнительного комитета от 15.11.2013 за № 0087747
УНП: 190241132

**Аудируемое лицо**
Наименование: Открытое акционерное общество «Евроторгинвестбанк» (сокращенное наименование банка — ОАО «Евроторгинвестбанк»)
Место нахождения: Республика Беларусь, 220075, г. Минск, промзона Шабаны, пер. Промышленный, 11
Сведения о государственной регистрации: открытое акционерное общество «Евроторгинвестбанк» зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 25 февраля 2002 года, регистрационный номер 807000043
УНП 807000043

Мы провели аудит прилагаемого публикуемого годового отчета Открытого акционерного общества «Евроторгинвестбанк» (далее — банк), состоящей из бухгалтерского баланса на 1 января 2015 года, отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала и отчета о движении денежных средств за 2014 год.

Прилагаемый публикуемый годовой отчет составлен на основе аудированной полной годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Евроторгинвестбанк» за 2014 год. Мы выразили аудиторское мнение без оговорок в отношении полной годовой финансовой отчетности ОАО «Евроторгинвестбанк» в аудиторском заключении от 27 марта 2015 года. Аудированная годовая финансовая отчетность и публикуемый годовой отчет не отражают влияния событий, произошедших после даты аудиторского заключения.

***Обязанности руководства аудируемого лица по подготовке бухгалтерской (финансовой) отчетности и публикуемого годового отчета***

Руководство Банка несет ответственность за подготовку и достоверное представление годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности и прилагаемого, публикуемого годового отчета в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, а также за соответствие совершенных Банком финансовых (хозяйственных) операций законодательству Республики Беларусь. Данная ответственность заключается в разработке, внедрении и поддержании надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверной годовой финансовой отчетности и публикуемого годового отчета, не содержащей существенных искажений, вызванных ошибками или недобросовестными действиями; а также в выборе и применении надлежащей учетной политики и обоснованных обстоятельствами оценочных значений.

***Обязанности аудиторской организации***

Мы несем ответственность за выраженное нами аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской (финансовой) отчетности, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности» и национальными правилами аудиторской деятельности, утвержденными Министерством финансов Республики Беларусь. Данные правила обязывают нам соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы получить разумную уверенность в отсутствии или наличии в публикуемом годовом отчете существенных искажений.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры, направленные на получение аудиторских доказательств, подтверждающих значения показателей, а также другую раскрытую информацию в публикуемом годовом отчете. Выбор аудиторских процедур проводится на основании профессиональных суждений аудитора, включающих оценку риска наличия существенных искажений в публикуемом годовом отчете в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке таких рисков аудитор рассматривает работу системы внутреннего контроля, относящуюся к подготовке и объективному представлению публикуемого годового отчета Банка, в целях разработки соответствующих аудиторских процедур, но не в целях выражения мнения об эффективности работы самой системы внутреннего контроля Банка. Аудит также включал оценку применяемой учетной политики, обоснованности учетных оценок, сделанных руководством Банка, а также оценку представления публикуемого годового отчета в целом.

Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства обеспечивают достаточные и надлежащие основания для выражения нашего аудиторского мнения.

***Аудиторское мнение***

По нашему мнению, публикуемый годовой отчет достоверно отражает во всех существенных отношениях финансовое положение ОАО «Евроторгинвестбанк» на 1 января 2015 года, а также результаты деятельности и движение денежных средств за 2014 год, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь, касающимися подготовки годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности; при этом совершенные ОАО «Евроторгинвестбанк» финансовые (хозяйственные) операции во всех существенных отношениях соответствуют законодательству.

В целях более точного понимания финансового положения ОАО «Евроторгинвестбанк» по состоянию на 1 января 2015 года и результатов его финансово-хозяйственной деятельности за 2014 год, публикуемый годовой отчет следует изучать вместе с полной годовой финансовой отчетностью.

Директор
Управляющий партнер
BDO в Беларуси — А.Н. Шкодин (квалификационный аттестат аудитора № 0000657 от 10 марта 2003 года, рег. № 650)

Начальник отдела
банковского аудита
BDO в Беларуси,
руководитель группы
аудиторов — Н.В. Кондратьева (свидетельство о соответствии квалификационным требованиям для осуществления аудиторской деятельности в банковской системе № 29 от 15.03.2006, Квалификационный аттестат аудитора № 0001006 от 26.08.2003, рег. № 991)

Дата аудиторского заключения: 27 марта 2015 года

Место выдачи аудиторского заключения: г. Минск, Республика Беларусь

Дата получения аудиторского заключения аудируемым лицом: 27 марта 2015 года



■ Нефармат

# ЖАНЧЫНЫ 65+

Практычна адначасова ў сетках з'явілася паведамленні пра распачатую выбарчую кампанію Хілары Клінтан і адну вельмі пажылую маці з Германіі, якая зноў збіраецца нарадзіць. Мая добрая знаёмая, амаль што іх равесніца, пракаментавала гэта з сарказмам. Я дазволіла сабе з ёй не пагадзіцца, але...

Што да спадарыні Клінтан, то нічога нечаканага не адбылося. Па-першае, яна ўжо адзін раз спрабавала свае сілы на выбарах, а па-другое, ужо крышачку працавала прэзідэнтам. Афіцыйна Хілары Клінтан была першай лэдзі краіны, але тады многія аналітыкі пісалі пра яе вялікі ўплыў на рашэнні мужа, пра яе добрую падрыхтаванасць і ролю ў яго выбарчай кампаніі, што прывяла да перамогі.

Тады нават стаў папулярным анекдот пра запраўку. Нібыта сужэнцы Клінтаны спыніліся на запраўцы, гаспадаром якой быў аднакласнік Хілары. Апошняя міла пагутарыла са школьным таварышам, нават згадалі сваё дзіцячае сяброўства і прыхільнасць. На што Біл не прамінуў пажартаваць: «Вось, каб выйшла за яго замуж, была б зараз гаспадыняй не Белага дома, а такой вялікай і прыгожай запраўкі». На што Хілары сур'ёзна і рашуча адрэагавала: «Зусім не, у такім выпадку прэзідэнтам Амерыкі зараз быў бы не ты, а ён». Здаецца, Хілары вырашыла выправіць гэтую гістарычную несправядлівасць і паказаць усім, хто ж сапраўды варты быць кіраўніком самай уплывовай дзяржавы свету. Падобна да таго, што ў яе ёсць рэальныя шанцы.

Спадарыні Клінтан 69 гадоў, большую частку жыцця яна прысвяціла сям'і, цяпер можна заняцца рэалізацыяй сябе як палітыка. Урэшце, як казаў герой культавага фільма «Сямнаццаць імгненняў вясны» Мюлер: «70 гадоў — гэта росквіт палітыка». Так што Хілары і падгадала пад самы росквіт. Калі ўсё атрымаецца, яна пакажа многім, як можа засяроджвацца жанчына на дзяржаўных справах. Пакажа найперш свайму лавеласу мужу, які паспяваў не толькі кіраваць, але праславіўся на ўвесь свет гісторыямі з дзяўчатамі і папсаваў жонцы нямала нервовых клетак. Ну, а калі галасоў не хопіць і прэзідэнтам стаць не атрымаецца, дык у гісторыю яна ўжо ўвайшла, яе запомняць амерыканцы, і не толькі. Ды і выбарчая кампанія, відаць, дабавіць адрэналіну ў арганізм і пакіне незабыўныя ўражанні.

Асабіста мне вельмі сімпатычныя імкненні сталых жанчын да новых формаў рэалізацыі. Ведаю адну такую, якая пасля выхаду на пенсію стала пісаць вершы, потым прозу. І самае галоўнае, што творчае майстэрства пісьменніцы год ад году расце. Яе літаратурныя спробы не выглядаюць слабымі. Праўда, Ніна Мацвееўна асабліва не імкнецца выдаваць усё напісанае, не ўступае ў пісьменніцкія арганізацыі. Яна падыходзіць да ўласнай творчасці па-філасофску, кажа, што калі яе творы пераажывуць яе і нехта некалі захоча іх надрукаваць, то — калі ласка. А пакуль знаёміць з новымі старонкамі даволі вузкае кола сваіх прыхільнікаў, прасіць, каб выказваліся шчыра, крытыкавалі і ўказвалі на хібы.

І гэта, дзякуй Богу, звычайныя рэчы, калі нехта ва ўзросце за 65 вырашае заняцца палітыкай, літаратурай, атрымаць яшчэ адну адукацыю. А вось адважыцца нарадзіць дзіця, ды яшчэ не адно, па-мойму, вельмі смела. Адчайна смела. На мяжы. Адна справа, калі мужчына ў такім узросце з маладой жонкай заводзіць дзіця: у яго і спадзяванні на маладую жонку. А тут жанчына ў 65 з дапамогай штучнага апладнення зацяжарала адразу чацвярнёй... І гэта заяўляе, што прапановы медыкаў па памяншэнні колькасці пладоў яна не разглядала. Ну не было б у яе зусім дзяцей — дык ёсць аж 13. Найстарэйшаму, пішуць, 44 гады, унукаў сямёра. Самай маленькай дзяўчынцы — дзевяць, нарадзілася, па нашых мерках, калі маці была ў пенсійным узросце. Яна і папрасіла ў маці брацікa альбо сястрычку. А тая і панеслася па клініках нават за мяжу, бо, відаць, дома не кожная ўстанова адважылася б на такую аперацыю.

Вядома, гэта справа кожнага, колькі дзяцей мець і ў якім узросце. Відавочна, калі ўсё будзе добра і малыя з'явяцца на свет, іх маці, настаўніца з Германіі, стане гераіняй СМІ, бо ўжо цяпер падлічылі, што яна прэтэндуе на ролю самай пажылой у свеце маці чацвярні. Што і казаць, рэкорд, сусветная сенсацыя, перамога над прыродай. Але чамусьці не хочацца трубіць і біць у бубны з гэтай нагоды. Наадварот, невядома адкуль узнікаюць няёмкасць, здзіўленне, нават цень узрушэння. Можа, таму што не заўсёды і не ва ўсім трэба імкнуцца да рэкордаў...

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

Даты | Падзеі | Людзі

**24 КРАСАВІКА**

**1520** год — Францыск Скарына пераехаў з Прагі ў Вільню і ў доме віленскага бургамістра Якуба Бабіча заснаваў новую друкарню. У Віленскай друкарні, першай на тэрыторыі Беларусі, у 1522 годзе ён выдаў «Малую падарожную кніжыцу» (на царкоўна-славянскай мове). Гэтая дата лічыцца пачаткам кнігадрукавання ў Беларусі.

**1899** год — нарадзіўся (г. Кобрын) Оскар Зарыскі, амерыканскі матэматык, адзін з заснавальнікаў алгебраічнай геаметрыі, член Нацыянальнай акадэміі навук ЗША (1944), Амерыканскай акадэміі мастацтваў і навук (1948). У 1924 годзе скончыў Рымскі ўніверсітэт. З 1927-га — у ЗША, ва Універсітэце Дж. Хопкінса, з 1945 года — у Ілінойскім, з 1947-га — у Гарвардскім універсітэтах. Аднachасова працаваў у Прынстанскім інстытуце перспектыўных даследаванняў. Аўтар навуковых прац па тэорыі мностваў, алгебраічнай геаметрыі, лінейных сістэмах. Памёр у 1986 годзе.

**1916** год — у Дубліне адбылася так званая «Чырвоная Пасха», або «Велікоднае паўстанне» — такую назву атрымала ўзброенае выступленне ірландцаў супраць англічан, узнятае лідарамі руху за незалежнасць Ірландыі на Вялікдзень 1916 года. Паўстанцы абвясцілі адмену ўсіх правоў Брытаніі на тэрыторыі Ірландыі. Акрамя таго, забаранялася варожасць паміж каталіцкай і пратэстанцкімі цэрквамі. Паўстанне, якое доўжылася з 24 па 30 красавіка, было жорстка задушана брытанскімі войскамі. Патрык Пірс, педагог і паэт, які абвясціў сябе ў Дубліне кіраўніком ірландскай дзяржавы, быў узяты ў палон і расстраляны па прысудзе трыбунала, як і яго брат Уільям і 14 іншых кіраўнікоў паўстання. Сэр Роджэр Кэйсмэнт быў пазбаўлены рыцарства і павешаны за дзяржаўную здраду ў Лондане. Але барацьба за свабоду і незалежнасць ад Брытаніі не спынялася. Калі пры пачатку паўстання значная большасць ірландцаў не падтрымлівала мяцежнікаў і лічыла іх здраднікамі, то мужнае супраціўленне, а затым і хуткая расправа над кіраўнікамі паўстання спрыялі таму, што яны і іх паслядоўнікі сталі лічыцца пакутнікамі і прыцягнулі да сябе сімпатыі значнай часткі грамадства. Далейшае напружанне ў англа-ірландскіх адносінах прывяло да Ірландскай грамадзянскай вайны (1922-1923), вынікам якой стаў падзел Ірландыі і абвяшчэнне незалежнасці 26 паўднёвых графстваў вострава.



Было сказана

**Ніна МАЦЯШ, паэтэса:**

*Дай нам, лёс, таго, чаго мы вартыя,*
*Каб не здрадзіць нам самім сабе.*

# Азбука народнай культуры

## ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

ІКОНА — жывапісная, радзей разная выява Ісуса Хрыста, Дзевы Марыі, хрысціянскіх святых ці біблейскіх падзей.

◈ Ікона стала сімвалам прысутнасці Боскага пачатку побач з чалавекам. Асаблівае ўшанаванне абразоў існуе ў праваслаўных і каталіцкіх вернікаў, якія перакананы ў тым, што ікона дазваляе верніку падрыхтавацца да размовы з вышэйшымі сіламі.

◈ Іканапіс стаў асобным відам творчасці. Абраз стварэцца ў пэўным душэўным стане, часцей за ўсё пасля шматдзённага посту.

◈ У культуры ўсходніх славян ікона ў шэрагу такіх сакральных рэчаў, як свячэная вада, свечка, шырока выкарыстоўвалася ў ахоўных і ачышчальных рытуальных дзеяннях. Лічылася, што абраз здольны «асвячаць» сваёй прысутнасцю прастору хаты ці храма. Таму яго ў ліку іншых сакральных рэчаў першым неслі ў новую хату. Для яго рабілі «святое» месца — покуць, якая часцей за ўсё была зарыентавана на ўсход.

◈ Сярод славян да ікон заўсёды ставіліся з вялікай павагай і пашанай. Часам у сям'і з пакалення да пакалення пераходзіў сямейны ці родавы абраз. Ён лічыўся ахоўнікам хаты і ўсяго роду.

◈ На Беларусі існаваў такі абрад: калі сын ішоў у войска, маці ў час праводзін ўпрыкмет і ўпотай ад усіх пераварочвала адну з ікон на бажніцы тварам да сцяны. Такія дзеянні выконваліся з адной мэтай — каб салдат вярнуўся дадому і сам пераварнуў ікону тварам да хаты.

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.50 | 20.27 | 14.37 |
| Віцебск — | 5.36 | 20.20 | 14.44 |
| Магілёў — | 5.40 | 20.17 | 14.37 |
| Гомель — | 5.41 | 20.09 | 14.28 |
| Гродна — | 6.05 | 20.42 | 14.37 |
| Брэст — | 6.10 | 20.38 | 14.28 |

**Месяц**

*Першая квадра 25 красавіка. Месяц у сузор'і Рака.*

**Імяніны**

*Пр. Івана, Прохара, Пятра, Рыгора, Якава. К. Валерыі, Аляксандра, Аляксея, Рыгора.*



Фота Надзеі БУЖАН.

# ЗАЎТРА




## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +19..+21°С | КІЕЎ +20..+22°С | РЫГА +15..+17°С |
| ВІЛЬНЮС +16..+18°С | МАСКВА +10..+12°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +6..+8°С |

**Продаю дешево пчелосемьи, пчелопакеты, ульи.**
Тел. 8 (044) 736-20-62, 8 (029) 303-21-19.

## УСМІХНЕМСЯ

**Хутчэй бы лета! Так хочацца ўжо ў расшпіленым пухавіку пахадзіць!**

Дзве сяброўкі.

— Прымусіла мужа піць таблеткі для супакаення, каб не быў такім нервовым. Дык ён, уяўляеш, прачытаў у інструкцыі, што іх трэба прымаць тры разы на дзень пасля яды. І запатрабаваў пад гэтую справу карміць яго тры разы на дзень!

— Паслухай, а калі карміць яго тры разы на дзень, можа, і таблеткі заспакаяльныя не спатрэбяцца?!




caricatura.ru

**Усё бессэнсоўна. Калі не ўцякаць ад маньяка, ён будзе калоць цябе нажом у бок. Калі ўцякаць, у баку будзе калоць само па сабе.**

Матэматык забягае ў фотаатэлье:

— Надрукуйце мне фотаздымкі, тэрмінова!

— 9х13?

— 117, а чаму вы пытаецеся?

**Адна вавёрка выпадкова паспытала піва і зразумела, навошта яна ўсё жыццё збірала арэшкі.**

Яна і ён.

— Ты нічога не хочаш мне сказаць?

— Хачу.

— Дык вось: не трэба!

**— У вас у доме кухарка ёсць?**

**— Ёсць.**

**— А служанка?**

**— Таксама ёсць.**

**— Ну, а садоўнік?**

**— І садоўнік ёсць.**

**— Дык вы багаты чалавек!**

**— Што вы, проста ў нашым шматкватэрным доме жывуць людзі розных прафесій.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.007. Індэкс 63850. Зак. № 1615.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 23 красавіка 2015 года.